«ГАРАЧЫ» 287 17 41

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

24 ВЕРАСНЯ 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 180
(26538)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

НАСЕННУЮ БУЛЬБУ ЛЕПШ НАБЫВАЦЬ УВЕСНУ

Большасць прыватнікаў ужо паспела ўбраць бульбу са сваіх агародаў і ўчасткаў. Як сведчыць пагалоска, сёлета ўраджайнасцю «другога хлеба» пахваліцца асабліва няма каму, ды і будучае захаванне бульбы не дае спакою — абы не прапала ўжо ў міжсезонны перыяд. Прычым не толькі тыя клубні, што адкладзены для спажывання, а нават насенная бульба. Прыкладна з такой праблемай да нас і звярнулася жыхарка Смалявіцкага раёна.

— Выкапалі нядаўна бульбу. Ураджай сёлета як ніколі слабы, прычым ва ўсіх. Толькі ў аднаго суседа па вёсцы атрымалася сабраць нешта больш-менш прыстойнае. А мы як паглядзелі, дык нават на насенне няма чаго пакінуць. Выходзіць, трэба набываць. Прыгадалі пра элітныя гатункі, што вырошчваюцца ў інстытуце бульбаводства. Але сумняваемся, калі лепш купляць насенку — зараз ці па вясне? Дзе яе, дарэчы, можна набыць, якія прыкладна цэны? — задалі нам пытанні.

— Я параіў бы адкласці набыццё насеннай бульбы да вясны. З 15 сакавіка яе можна будзе прыдбаць або ў нас у пасёлку Самахвалавічы, або, паколькі вашы заяўнікі са Смалявіцкага раёна — у суседнім Чэрвеньскім, у Натальеўску — на абласной доследнай станцыі. Прыкладны кошт на ўсе гатункі — каля двух тысяч рублёў за кілаграм, — адказаў на наш запыт **намеснік генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра па бульбаводстве і плодаагародніцтве Іван КАЛЯДКА.** — Наконт канкрэтнага гатунку нешта параіць больш складана, паколькі нехта вырошчвае раннюю бульбу, хтосьці — найперш гатункі для зімовага захоўвання.

Як зазначыў далей Іван Іванавіч, пры жаданні можна набыць насенную бульбу і цяпер. Аднак калі прыгадаць сёлетнія ўмовы, ёсць рызыка зараження яе фітафтарозам. Дарэчы, нагадаў ён далей, менавіта па гэтай прычыне могуць узнікнуць праблемы з захоўваннем сабранага ўраджаю. Спецыяліст параіў закладваць бульбу на часовае захоўванне, пастаянна праводзіць старанную пераборку і толькі пасля гэтага адпраўляць «другі хлеб» на пастаяннае захоўванне. Пашкоджаныя клубні трэба выкарыстоўваць адразу, паколькі яны могуць заразіць і здаровую бульбу.

Іван Калядка сказаў, што ацэньваць ураджайнасць у прыватным сектары вельмі складана, але яна «вельмі невялікая». Што датычыцца сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, дык тут напачатку адзначалася ўраджайнасць на ўзроўні не менш за 180 цэнтнераў з гектара, потым яна знізілася да 160—170 цэнтнераў. Летась, напрыклад, ураджайнасць была 205 цэнтнераў з гектара. Адказваючы на пытанне адносна ўзроўню цэнаў на бульбу, суразмоўца сказаў, што «яны будуць высокімі». Цяпер закупачныя з улікам ПДВ склаліся на ўзроўні 770 рублёў, а ў крамах і на рынках яны перавышаюць тысячу рублёў за кілаграм і, па ўсёй верагоднасці, могуць павялічыцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Пытальнік

«Няма ніякіх праблем з тым, каб уключыць у пералік нарыхтовак пладова-ягаднай сыравіны ад насельніцтва тую ж сліву, толькі...»

Дарагая рэдакцыя, прашу патлумачыць: чаму нарыхтоўчыя прадпрыемствы не прымаюць пладова-ягадную сыравіну, у прыватнасці, сліву, вінаград і грушы?

Сяргей Фёдаравіч КАЛЕДА, вёска Навошына Карэліцкага раёна

Літаральна днямі «Звязда» са спасылкай на канцэрн «Белдзяржхарчпрам» давала інфармацыю пра тое, што ў перапрацоўчых прадпрыемстваў якраз такі і ёсць цікавасць да той жа грушы, але на прамперапрацоўку яна не паступае. Яшчэ раней мы пісалі, што сёлета, у сувязі з не вельмі ўраджайным годам, які адбіўся не лепшым чынам і на ўзроўні нарыхтовак (вішні, чорных і чырвоных парэчак, агрэсту, чарніц) — што, у сваю чаргу, можа прывесці да выпуску вузкага асартыменту прадукцыі, — перапрацоўчым прадпрыемствам было рэкамендавана зрабіць захады па папаўненні аб'ёмаў недаатрыманай сыравіны іншымі відамі: слівай, брусніцамі, буякамі, малінай, журавінамі, чарнаплоднай рабінай. Але, як вынікае прынамсі з ліста нашага чытача, гэтага не адбываецца. Чаму?

— Мне цяжка дакладна за перапрацоўчыя прадпрыемствы адказаць на гэтае пытанне. Магчыма, адсутнічаюць патрэбныя тэхналогіі, наколькі асабіста я зразумела, маючы кантакт з прадстаўнікамі прадпрыемстваў, — сказала **старшыня праўлення Карэліцкага раённага спажывецкага таварыства Галіна МІХАЙЛОЎСКАЯ.** — Аднак, паколькі пытанне вашага чытача датычыцца нарыхтоўкі, адкажу на яго так. У дагаворах, якія заключаюцца з перапрацоўчымі прадпрыемствамі на пастаўку сыравіны — а заключаюцца яны задоўга да пачатку сезона масавых нарыхтовак, — дакладна прапісваюцца ўсе пазіцыі: віды сыравіны, якую жадаюць атрымліваць гэтыя прадпрыемствы, аб'ёмы і закупныя цэны. Сёлета, напрыклад, у такіх дагаворах традыцыйна прысутнічалі яблыкі, алыча. А тая ж сліва не першы год запар у спісе адсутнічае. Хоць нам уключыць яе ў пералік пладова-ягаднай сыравіны, што нарыхтоўваецца ад насельніцтва, не складае ніякіх цяжкасцяў — сістэма прыёмкі адладжаная. А сліў сёлета, у адрозненне ад яблыкаў, сапраўды шмат, і да нас ужо паступалі аналагічныя звароты ад грамадзян. Але што мы можам зрабіць? Хоць такая зацікаўленасць у нас ёсць. Напрыклад, летась за здадзеную прадукцыю раённае спажывецкае таварыства выплаціла насельніцтву 450 мільёнаў рублёў. І гэтыя грошы вярнуліся ў нашы гандлёвыя прадпрыемствы праз закупку людзьмі розных тавараў, у тым ліку складанай бытавой тэхнікі.

Мы пацікавіліся ў Галіны Леанідаўны: як сёлета ідзе нарыхтоўка сельскагаспадарчай прадукцыі ў раёне з улікам спецыфікі сезона?

— Як я ўжо адзначала, сёлета неўраджай яблыкаў. Калі летась мы нарыхтавалі 1200 тон, дык зараз пакуль няма і дзясятай часткі ад мінулагодняй лічбы. Адзіны ў нашай вобласці раён, дзе яблыкі сёлета выраслі, — гэта Воранаўскі. Нам давялося нават выязджаць на нарыхтоўку ў Баранавіцкі раён. Хоць закупную цану мы пакуль трымаем: як было 350 рублёў за кілаграм, так і засталося.

Дарэчы, сёлета ўпершыню Карэліцкае раённае спажывецкае таварыства нарыхтоўвала брусніцы. Адбылося гэта, па-першае, па ініцыятыве зганадараа вышэй канцэрна «Белдзяржхарчпрам», па-другое, загадзя гэтыя ягады не былі ўключаны, згодна з дагаворамі з перапрацоўчымі прадпрыемствамі, у пералік сыравіны, якую жадалі атрымліваць яны для прамперапрацоўкі. Гэта мы да таго, што са слівамі і іншай пладова-ягаднай сыравінай у прынцыпе можна ж было зрабіць тое ж, праўда? Калі ў насельніцтва дрэвы ломяцца ад пладоў, чаму аператыўна не адгукнуцца на прапанову?

— Усяго нарыхтавалі 1,5 тоны брусніц. Галоўнае, што цяпер людзі будуць ведаць: можна будзе здаваць і гэтыя ягады, — заўважыла старшыня праўлення раённага спажывецкага таварыства.

Пацікавіліся мы і відамі на ўраджай бульбы сёлета, аб'ёмамі нарыхтовак і ўзроўнем закупных цэнаў.

— Сёлета неўраджай і на бульбу. Прынамсі, насельніцтва здае яе пакуль не вельмі ахвотна. Надзея ў нас сёлета больш на сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Закупная цана зараз складае 600 рублёў за кілаграм. Гэта за так званую таварную бульбу, якой потым можна будзе гандляваць на кірмашах па продажы сельскагаспадарчай прадукцыі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДЗЯВОЧАЯ ГАРА

У старажытным горадзе Мсціславе з дахрысціянскіх часоў захавалася шэсць гарадзішчаў. Адно з іх — найбольш любімае месца тутэйшай моладзі — Гара Дзявочая. Як апавядае легенда, гэтую гару мясцовыя жанчыны нанасілі ў сваіх спадніцах за адну ноч, каб дапамагчы мужам — абаронцам горада і стварыць заслону ворагу. На падставе археалагічных даследаванняў сучасныя гісторыкі сведчаць, што гара з'яўляецца помнікам ранняга жалезнага веку і была звязана з культам язычніцкага жаночага божышча — Багіні-Дзевы.

Навучэнкі Мсціслаўскага дзяржаўнага будаўнічага прафесійна-тэхнічнага каледжа, будучыя бухгалтары, на Дзявочай Гары.

Твае правы

ПАРУШЫЎ — НАВУЧАЦЬ

Пры выяўленні фактаў парушэння правілаў па ахове працы, якія прывялі або могуць прывесці да няшчаснага выпадку на вытворчасці, Федэрацыя прафсаюзаў будзе накіроўваць кіраўнікоў, спецыялістаў і работнікаў арганізацый на пазачарговыя праверкі ведаў і інструктажы па тэхніцы бяспекі. Аб гэтым паведаміў галоўны тэхнічны інспектар працы ФПБ Аляксандр Зайцаў.

Штогод тэхнічная інспекцыя прафсаюзаў правярае каля 7 тысяч прадпрыемстваў, прычым у сярэднім падчас адной праверкі высвятляецца каля 10 парушэнняў правілаў па ахове працы. Іх тыповыя прычыны — выкарыстанне няспраўнай тэхнікі і прыстасаванняў, што не адпавядаюць патрабаванням бяспекі, незабеспячэнне работнікаў спецадзеннем, спецабуткам і іншымі сродкамі індывідуальнай абароны, а таксама неправядзенне праверак ведаў і інструктажаў па ахове працы. Апошняе, да слова, найбольш актуальнае для арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці.

У сувязі з гэтым, Федэрацыя прафсаюзаў пачне актыўна карыстацца сваім правам накіроўваць кіраўнікоў, спецыялістаў і работнікаў на пазачарговую праверку ведаў па тэхніцы бяспекі — практыка паказвае, што менавіта адсутнасць ведаў па арганізацыі вытворчасці становіцца прычынай няшчасных выпадкаў. Накіраванне будзе адбывацца на падставе спецыяльных і абавязковых для выканання прадстаўленняў тэхнічных інспектараў працы. Калі ж гэтыя прадстаўленні ўсё ж будуць ігнаравацца, то па кожным такім факце прафсаюзы маюць намер звяртацца ў пракуратуру на падставе Закона «Аб ахове працы».

Адным з вострых пытанняў застаецца непасрэдна кваліфікацыя няшчасных здарэнняў. Не так даўно інцыдэнты, што адбыліся з работнікамі ў стадыі алкагольнагаап'янення, адназначна ацэньваліся як невытворчыя — адпаведна, з пазбаўленнем правоў пацярпелых на выплаты па лініі «Белдзяржстраха» і выплат па калектыўных дагаворах. Сёння сітуацыя змянілася. «Калі работнік не здзяйсняў крадзяжу і іншых парушэнняў закону, траўмы ў стадыі алкагольнага ап'янення па нашым патрабаванні вызначаюцца як вытворчыя, — зазначае Аляксандр Зайцаў. — Так, можна пагадзіцца: работнік тут вінаваты. Але адначасова вінаваты і наймальнік, які не прыкантраляваў сітуацыю і своечасова не адхіліў чалавека нападпітку ад выканання працоўных абавязкаў. Таму пазіцыя прафсаюзаў на гэты конт прынцыповая — работнік і наймальнік павінны несці адказнасць разам».

Прафсаюзы будуць настойваць на прынцыпе «салідарнай адказнасці» і ў іншых спрэчных сітуацыях, не звязаных з ужываннем алкаголю.

— Адзін з апошніх такіх выпадкаў адбыўся на Брэстчыне, дзе падчас перапынку на абед кіроўца пагрузчыка ад'ехаў на колькі сотняў метраў перакусіць на свой дачны ўчастак, а потым трапіў пад колы машыны пры запуску рухавіка, — працягвае галоўны тэхнічны інспектар ФПБ. — Фармальна здарэнне адбылося зноў-такі падчас перапынку і не на працоўным месцы. Разам з тым мы схільныя расцэньваць інцыдэнт як вытворчы і будзем адстойваць свой пункт гледжання аж да пракуратуры і суда. Бо, па-першае, узнікае пытанне: чаму работніку не былі арганізаваныя нармальныя ўмовы для харчавання? А па-другое, зразумела: нічога страшнага тут не адбылося б, калі б была спраўнай блакіроўка рухавіка — гэта не дазволіла б пагрузчыку «раптам» завесціся пры ўключанай перадачы.

Між тым, прафсаюзы працягнуць практыку праверак тэхнікі бяспекі на падставе як пісьмовых, так і вусных зваротаў работнікаў. «Абмежаванне па праверках не датычыцца сітуацый, звязаных з забеспячэннем бяспекі людзей, таму ніякіх парушэнняў заканадаўства тут няма, — заўважыў Аляксандр Зайцаў. — Пры гэтым тэхнічныя інспектары ў тым ліку будуць наведваць арганізацыі, дзе няма свайго прафсаюза».

Сяргей ГРЫБ.

Заробкі

Рэгіёны «сплюсавалі» па зарплаце. Выключэнне — Магілёўшчына

Сярэдняя па Беларусі намінальная налічаная зарплата ў жніўні склала 1 млн 43,5 тыс. рублёў і ўзрасла ў параўнанні з ліпенем на 0,8 % — на 8,3 тысячы. Прычым рост рэальных, з улікам змянення цэнаў на тавары і паслугі, заробкаў за гэты ж перыяд крыху большы — 1 %.

Як паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, сярэдняя зарплата ў жніўні на прамысловых прадпрыемствах склала 1 млн 99,4 тыс. (у прыватнасці, па паліўнай прамысловасці — 2 млн 53,8 тыс., хіміі і нафтахіміі — 1 млн 516,4 тыс., электраэнергетыцы — 1 млн 416 тыс., прамысловасці будаўнічых матэрыялаў — 1 млн 280,9 тыс., машынабудаванні і металаапрацоўкі — 1 млн 50,7 тыс., харчовай прамысловасці — 1 млн 38,9 тыс., прамысловасці лёгкай — 707,3 тыс.), па будаўнічых арганізацыях — 1 млн 470,9 тыс., у арганізацыях транспарту — 1 млн 208,9 тыс., у сельскай гаспадарцы — 843,3 тыс., гандлі і грамадскім харчаванні — 907 тыс., жыллёва-камунальнай гаспадарцы — 941,6 тыс., ахове здароўя — 794,8 тыс. (ва ўрачоў — 1 млн 338,7 тыс., сярэдняга медыцынскага персаналу — 765,4 тыс., малодшага медперсаналу — 476,8 тыс.), у цэлым па ўстановах адукацыі — 665,9 тыс. (у настаўнікаў — 768 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — 1 млн 321,6 тыс.), па культуры і мастацтве — 717,8 тыс., сацыяльным забеспячэнні — 590,8 тыс. рублёў.

Што да рэгіёнаў, то лідарам у жніўні застаўся Мінск — 1 млн 328 тыс. рублёў. Сярэдняя зарплата па Мінскай вобласці склала 1 млн 26 тыс., па Гомельскай — 989,5 тыс., Гродзенскай — 976,2 тыс., Віцебскай — 951,2 тыс., Брэсцкай — 934,6 тыс., Магілёўскай — 929,9 тыс. рублёў.

Дарэчы, зазначаюць у Нацыянальным статыстычным камітэце, сёлета ў параўнанні з аналагічным перыядам летась адзначаецца і рост намінальных заробкаў за студзень—жнівень у цэлым — у сярэднім па Беларусі на 1,1 %. Прычым леташнія паказчыкі тут перавышаюць усе рэгіёны (на 0,4 — 2,6 %), за выключэннем Магілёўшчыны, дзе ўзровень сярэдніх заробкаў зменшыўся на 1,7 %.

Сяргей ГРЫБ.

Грошы

ПАГОНЯ ЗА ПРЫБЫТКАМІ «ПАДКАСІЛА» «АМЕРЫКАНЦА»

Учора раніцай амерыканскі долар да еўра знізіўся да мінімальнай адзнакі за апошні год — кошт еўра ўзрос да 1,4812 долара. Зрэшты, паводле інфармацыі сусветных агенцтваў, курс «амерыканца» падае ў адносінах да 15 валют з 16, якія найбольш актыўна таргуюцца ў свеце.



— Сутнасць у тым, што ратуючы эканоміку з крызісу, ЗША надрукавалі дадаткова значную колькасць долараў, — каментуе тэндэнцыі на сусветным рынку і прычыны зніжэння кошту амерыканскай валюты **кіраўнік цэнтра макраэканамічнага рэгулявання і інстытуцыяналізму Інстытута эканомікі НАН Беларусі Аляксандр ЛУЧАНОК.** — Колькасць долараў да таварнай масы павялічылася. Тое, што курс долара зніжаецца, азначае пагаршэнне суадносінаў паміж таварнай і грашовай масай. Цяпер надрукаваныя грошы пачынаюць расцякацца па ўсім свеце і ўплываць на курс гэтай валюты — ён зніжаецца. Па-другое, сусветная эканоміка выходзіць з крызісу, і часова свабодныя грошы, якія многія кампаніі трымалі ў амерыканскіх казначэйскіх абавязацельствах пад меншы працэнт, яны пачынаюць пераводзіць у іншыя каштоўныя паперы з мэтай атрымання больш высокіх прыбыткаў. Значыць, долары пачынаюць мяняцца на іншыя валюты. Прапанова долара рэзка павялічваецца, а калі гэта адбываецца, то курс яго падае. Калі ж весці гутарку пра тое, што будзе адбывацца ў доўгатэрміновай перспектыве з курсам гэтай валюты, можна казаць — долар будзе паступова таннець.

— Гэта значыць, цяперашняя зніжэнне — толькі пачатак?

— Я лічу, што працэс будзе ісці дастаткова гладка, паступова. Будзе таннець і еўра, паколькі іх таксама надрукавалі больш. А вось энерганосьбіты, сыравіна, матэрыялы пачнуць паступова даражэць у валютах, якія таннеюць.

— Што добра бачна, у прыватнасці, па цэнах на нафту, якія на сусветным рынку значна павысіліся.

— Калі долар абясцэньваецца, то энерганосьбіты даражэюць. Гэты працэс заканамерны, цэны растуць не толькі ў нас, але і ва ўсім свеце.

— Разам з тым, міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын мяркуе, што ў найбліжэйшыя паўгода цэны на нафту знізяцца, а ў доўгатэрміновай перспектыве яе цана на можа складаць каля 50 долараў. Магчыма, у яго іншыя прагнозы наконт будучыні таго ж долара?

— Паводле майго меркавання, росту курсу валют не будзе. А ўсё, што прагназуюць расіяне... Я думаю, Аляксей Кудрын, які займаецца бюджэтам, проста пакідае сабе «падушку бяспекі» пры фарміраванні бюджэту на наступны год: лепш закласці ў бюджэт мінімальную цану нафты і лічыць, што даходаў будзе менш, чым закласці высокую і пасля не ведаць, дзе ўзяць даходы.

— Аляксандр Іванавіч, вы згадалі, што і еўра, і долар будуць таннець. Ці ёсць меркаванні наконт магчымых суадносінаў гэтых валют?

— Кожны прагназуе тое, што можа. Ёсць добрая прымаўка: «Ведаў бы прыкуп — жыў бы ў Сочы». Гэта значыць, усе падобныя прагнозы маюць адносную каштоўнасць. Тым больш, што на валютным рынку адбываюцца магутныя спекуляцыі, і задача спекулянтаў, якія валодаюць вельмі вялікімі рэсурсамі, — увесці ў зман дробных пакупнікоў і прадаўцоў валюты, каб на іх зарабіць.

— У такім выпадку, як мяркуеце, цяпер, калі курс «амерыканца» істотна знізіўся да іншых валют, ёсць рэзон купляць долары для зберажэння?

— На мой погляд, цяпер самы лепшы час купляць долар, паколькі ён танны. Не думаю, што суадносіны еўра і долара, якія цяпер склаліся, — яны дастаткова рэальныя. Бюракратычны механізм Еўропы тармозіць адпаведнае абясцэньванне і «еўрыкаў», паколькі іх таксама надрукавалі дастатковую колькасць. Асабіста маё меркаванне — наогул трэба купляць валюту, калі яна падае да самага нізкага ўзроўню, а не тады, калі яе курс ідзе ўверх.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

З РЭКОРДАМ СЕЗОНА «ДЫНАМА» АДОЛЕЛА «ТАРПЕДА»



У чарговым матчы Кантынентальнай хакейнай лігі хакеісты сталічнага «Дынама» сустракаліся ў гасцях з камандай «Тарпеда» з Ніжняга Ноўгарада і атрымалі перамогу — 5:3. Пяць шайбаў у вароты суперніка — рэкорд «Дынама» ў гэтым сезоне. Пасля няўдалага матчу з «Барысам», які сталічная каманда прайграла, Глен Хэнлан замяніў варатара — замест Андрэя Мезіна згуляў Віталь Коваль (ён, дарэчы, быў прызнаны лепшым гульцом паядынку) і змяніў склад звенняў.

Матч не вылучаўся вялікай колькасцю галявых момантаў, і толькі яго апошняя трэць выдалася нервовай: калі другі перыяд беларусы пачалі з камфортнай перавагай 3:1, то менш чым за тры хвіліны да фінальнай сірэны гаспадары скарацілі лік да мінімуму — 3:4. А за дзве хвіліны да завяршэння паядынку і ўвогуле замянілі варатара шостым палявым гульцом і пайшлі на вырашальны штурм беларускіх варотаў. Але да шчасця беларускіх балельшчыкаў, Плат пасля перадачы Андэрсана закінуў шайбу ў пустыя вароты суперніка — 5:3.

У беларусаў шайбы закінулі Аляксандр Кулакоў (13-я хвіліна), Дзью Уэскот (15-я), Ханес Хювенен (21-я), Андрэй Стась (43-я) і Джэф Плат (59-я). За пяць гульняў беларуская каманда набрала 8 ачкоў і падзяляе 4—7 месцы ў Заходняй канферэнцыі. Наступны паядынак наша дружына правядзе ў Маскве 24 верасня супраць мясцовага ЦСКА.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ПРАЗ МЯЖУ — ХУТЧЭЙ У ШЭСЦЬ РАЗОЎ

Пытанне з іншамаркамі застаецца адкрытым

Уніфікацыя мытных працэдур Беларусі, Расіі і Казахстана з міжнароднымі стандартамі паспрыяе павелічэнню гандлю паміж гэтымі краінамі і іх уступленню ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Такую думку падчас сустрэчы з журналістамі выказаў генеральны сакратар Сусветнай мытнай арганізацыі Кунія Мікурыі. Варта нагадаць, што адзіны беларуска-расійска-казахстанскі Мытны саюз павінен функцыянаваць з 1 студзеня наступнага года.

Як адзначыў Кунія Мікурыі, за апошнія гады Беларусь дасягнула вялікага прагрэсу ў мытнай справе. Тым не менш з улікам значнага геапалітычнага становішча нашай краіны Сусветная мытная арганізацыя разглядае пытанні аказання тэхнічнай дапамогі для ўладкавання пункталў пропуску, а таксама — для наладжвання папярэдняга абмену інфармацыяй аб таварах і транспартных сродках, што перасякаюць мяжу.

Прычым, падкрэсліў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Аляксандр Шпілеўскі, 12—15 кастрычніка Беларусь наведае група экспертаў Еўразсаюза — менавіта для вывучэння магчымасцяў нашай краіны ў галіне папярэдняга паведамлення аб перамяшчэнні тавараў. «Сёння мы вядзём актыўныя перамовы з ЕС для таго, каб нас уключылі ў гэту сістэму па вельмі простай прычыне — у выніку час афармлення на мяжы можа скарацціца да 6 разоў», — зазначыў кіраўнік ведамства. Дарэчы, з 1 верасня сістэма папярэдняга электроннага паведамлення ўжо ўведзеная на беларуска-ўкраінскай мяжы. Перамовы ў гэтым напрамку вядуцца і з іншымі суседзямі — Польшчай, Літвой і Латвіяй.

Адначасова не менш важным напрамкам з'яўляецца стварэнне інфраструктуры. Па сутнасці праблем тут няма — адно, засталося прафінансаваць заканчэнне ўладкавання пункталў пропуску «Беняконі», «Дамачава» і «Казловічы». «Кансервацыя гэтых пункталў абыдзецца даражэй, чым працяг будаўніцтва, таму мы спадзяёмся, што пытанне будзе вырашана», — заўважыў Аляксандр Шпілеўскі.

Між тым, ці не самая вострая на сёння тэма — пошліны на легкавікі ў рамках зноў жа Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана. «Стварэнне мытнага саюза немагчымае без адзінай тарыфнай палітыкі, выроўнівання мытных пошлін, — адзначыў Аляксандр Шпілеўскі. — Аднак павысяцца або зменшацца пошліны на тыя ж легкавікі, пакуль невядома — на гэты конт вядуцца перамовы. Адно, што, на наш погляд, «зрух» пошлін для Беларусі — страты бюджэту. Летась пры ўвозе легкавікоў мы сабралі пошлін на 280 млн долараў — для кампенсацыі гэтага «прагалу» спатрэбіцца шукаць іншую крыніцу даходаў. Тым больш, што вядома: уласных аўтамабіляў мы не выпрабляем».

Сяргей ГРЫБ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.09.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 750,00
▼ 1 еўра	4 066,70
1 латвійскі лат	5 762,18
1 літоўскі літ	1 178,54
1 чэшская крона	161,73
1 польскі злоты	973,87
▲ 1 расійскі рубель	91,67
1 украінская грыўня	321,07

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	30,0004
UAH	35,2324
1000 BYR	10,8776
EUR	44,3946

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Ведай нашых!

Зелянкоўская як Ума Турман, Алег Гарбуз — мент?..

Якія метамарфозы можа зрабіць з акцёрам роля — пяшчотная прыгажуня, напрыклад, можа стаць наёмным забойцам... Аднак, толькі па волі стваральнікаў, у дадзеным выпадку цыкла тэлевізійных фільмаў «Сёмін», якія пачаў паказваць у нядзелю вечарам тэлеканал НТБ.

Беларускіх тэлегледачаў могуць цікавіць не толькі самі сюжэты, якія закруціў аўтар сцэнарыя Андрэй Курэйчык, але і працы беларускіх акцёраў, якія патрапілі ў кампанію такіх зорак, як Леанід Каneўскі і Дзмітрый Арлоў. А ўсё таму, што праект «Сёмін» здымаўся ў Беларусі на базе студыі Уладзіміра Янкоўскага. Праўда, па волі расійскай кінакампаніі «Версія», кіно здымалі расійскія рэжысёры Аляксандр Франскевіч і Генадзь Байсак.

Адлік у тэлеэфіры пачаўся ў нядзелю 20 верасня, калі была паказана першая серыя, але іх шэсць. Пакуль. Таму што НТБ ужо замовіў аўтару сцэнарыя другі сезон тэлефільма. Курэйчыка гэта навіна парадавала. Тым больш што ў гэтым праекце ім рухае асабістая зацікаўленасць: ён прысвяціў працу памяці свайго брата, які працаваў у мінскай міліцыі і загінуў на пачатку гэтага года.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

«АЛЬ-КАЕДА» АПУБЛІКАВАЛА ЧАРГОВЫ ВІДЭАЗВАРОТ ДА ЗША

Міжнародная тэрарыстычная сетка «Аль-Каеда» выпусціла чарговы відэазапіс аднаго з лідараў арганізацыі Аймана аль-Завахіры са зваротам да ЗША.

У сваім відэазвароце аль-Завахіры крытыкуе палітыку Вашынгтона, вінаваціць амерыканскага прэзідэнта Барака Абаму ў крывадушнасці, а таксама праказвае ЗША хуткае знішчэнне ад рук мусульман усяго свету. На відэа, акрамя аль-Завахіры, прысутнічае вайсковец з ЗША Боув Бергдаль, захоплены талібамі ў Афганістане 30 чэрвеня 2009 года, а таксама абвінавачаны ў дзяржаўнай здрадзе амерыканскі прапагандыст «Аль-Каеды» Адам Гадан, таксама вядомы як «амерыканец Азам».

Акрамя таго, 14 верасня з аўдыёзваротам выступіў лідар «Аль-Каеды» Усама бін Ладэн. На тым аўдыёзапісе «тэрарыст нумар адзін» назваў падтрымку Ізраіля з боку Вашынгтона асноўнай прычынай канфлікту «Аль-Каеды» з ЗША, а таксама параіў амерыканцам спыніць баявыя дзеянні ў Афганістане.

У СЕВАСТОПАЛІ ЎВЕДЗЕНЫ РЭЖЫМ НАДЗВЫЧАЙНАГА СТАНОВІШЧА

Мэр Севастопаля Сяргей Куніцын абвясціў аб увядзенні рэжыму надзвычайнага становішча на тэрыторыі горада з-за катастрафічнай сітуацыі ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Севастопаль не гатовы да зімы, тарыфы на паслугі ЖКГ не пакрываюць выдаткаў камунальных прадпрыемстваў, іх супрацоўнікі тры месяцы не атрымліваюць зарплату. Пры гэтым гарадская рада ўжо два гады катэгарычна адмаўляецца павышаць тарыфы. Паводле слоў Куніцына, гэта прывяло да таго, што паступленні ад прадпрыемстваў і насельніцтва пакрываюць толькі 26 % выдаткаў. «Севцеплакамунэнэрг» і «Водаканал» фактычна абанкруціліся, ім няма чым плаціць за энерганосьбіты. Ва ўмовах НС мэр мае права павышаць тарыфы на паслугі ЖКГ самастойна, без рашэння гарадской рады. Днём раней мэр Севастопаля абвясціў, што тарыфы на цяпло і ваду для Чарнаморскага флоту Расіі і прадпрыемстваў горада з кастрычніка вырастуць утрая.

БУЙНОЕ МАХЛЯРСТВА НА ЕВАЎ

У Вялікабрытаніі пачаўся суд па факце выкрыцця найбуйнейшай у гісторыі інтэрнэт-аўкцыёну eBay схемы махлярства.

Па звестках следства, міжнародная група ашуканцаў гандлявала праз eBay падробленымі клюшкамі для гольфа, адзеннем і аксэсуарамі. На прадукцыю, зробленую ў Кітаі, вешаліся цэтлікі вядомых марак або ляпіліся этыкеткі з падобнымі эмблемамі. Група дзейнічала з сярэдзіны 2003 года да пачатку 2008-га. За гэты час былі прададзеныя тавары на мільёны фунтаў стэрлінгаў. Удзельнікі злачыннай супольнасці былі выяўленыя ў Вялікабрытаніі, Тайландзе, Аўстраліі, Германіі, Сінгапуры, ЗША, Ганконгу і Кітаі.

ДЭПУТАТЫ РАДЫ ЗЛАМАЛІ СПІКЕРУ МІКРАФОН

Спікер Вярхоўнай Рады Уладзімір Літвін 22 верасня быў вымушаны зачыніць вячэрняе пасяджэнне пасля таго, як дэпутаты ад Партыі рэгіёнаў пашкодзілі яго мікрафон.

Пры гэтым Літвін скардзіўся, што рэгіяналы пагражалі яму. Паплечнікі Віктара Януковіча залезлі ў прэзідыум і абступілі Літвіна для таго, каб не дапусціць галасаванні шляхам падняцця рук. Дэпутатаў ад Партыі рэгіёнаў такі варыянт не задавальняў, бо ў зале было занадта мала іх прыхільнікаў. Спікер жа, па іх меркаванні, збіраўся пазбавіць іх магчымасці праглаасаваць чужымі картамі. Між тым, Літвін планаваў паставіць на галасаванне праект закона аб павышэнні мінімальнай зарплаты і пенсій. Патрабуючы станоўчага рашэння Рады па гэтым пытанні, рэгіяналы блакавалі Раду тры тыдні.

«ЛЕКІ» АД СВІНОГА ГРЫПУ

У Екацярынбургу ашуканцы прыдумалі новы спосаб «зарабіць» на страху людзей перад свіным грыпам.

Невядомыя жулікі разаслалі квітанцыі аб аплаце за нібы праведзеную санітарную апрацоўку дамоў ад небяспечнага віруса. У квітанцыях, аддрукаваных на дрэннай паперы, прапаноўвалася пералічыць камерцыйнай фірме па 360 рублёў за «арашэнне» пад'ездаў, якое абароніць ад віруса A/H1N1. Аднак ніякіх работ ні ў адным з дамоў не праводзілася. У мясцовым аддзяленні Распажыўнагляду падобны спосаб барацьбы са свіным грыпам выклікаў моцнае здзіўленне, а самім інцыдэнтам зацікавілася міліцыя. Гэта ўжо не першы выпадак, калі жулікі спрабуюць «узяць на ўзбраенне» свіны грып. У пачатку верасня аферысты пракруцілі акцыю ў Петразаводску. Зламыснікі хадзілі па дамах і прапаноўвалі купіць вакцыну ад віруса A/H1N1, хоць падобнага прэпарата яшчэ нэ існуе ў прыродзе.

ТЛУШЧ МОГУЦЬ ЗРАБІЦЬ ГРУДЗЬМІ?

Новы метад па павелічэнні грудзей зусім хутка будзе ўкаранёны ў ЗША і Вялікабрытаніі. Матэрыялам для жаночага хараства стане тлушч з жывата і сцёгнаў.

Такім чынам, хірургі прапаноўваюць пацыентам забіць двух зайцаў адразу: пазбавіцца ад лішняга тлушчу і павялічыць аб'ём грудзей. Новая методыка дазваляе пазбегнуць праблем з дэфармацыяй пратэза і яго празмернай цвёрдасці. Акрамя таго, гэтая тэхналогія забяспечвае больш натуральны эфект, таму што дазваляе хірургам лепш мадэляваць грудзі, растлумачылі навукоўцы. У апошнія некалькі гадоў хірургі правялі мноства эксперыментальных аперацый, іх эфект значна больш працяглы, што выключае паўторнае хірургічнае ўмяшанне.

«Захад-2009»

Беларускія самалёты Су-25УБ і МіГ-29УБ зробяць пасадку на аўтатрасу

Беларускія самалёты Су-25УБ і МіГ-29УБ зробяць пасадку на аўтамабільную трасу 25 верасня. Аб гэтым паведаміў начальнік прэс-службы Міністэрства абароны Беларусі Вячаслаў Раменчык.

«У адпаведнасці з задумай аператыўна-стратэгічнага вучэння «Захад-2009» пройдуць палёты з выкарыстаннем аэрадромных участкаў дарог (АУД). Мэта мерапрыемства — адпрацоўка пытанняў выкарыстання ўчасткаў аўтамабільных дарог у якасці запасных аэрадромаў і аэрадромаў разгрупавання авіяцыі, падрыхтоўка лётнага складу да выканання палётаў з АУД», — сказаў ён.

У ходзе палётаў будзе арганізавана пасадка самалётаў Су-25УБ і МіГ-29УБ на АУД з далейшай падрыхтоўкай іх да паўторнага вылету і выхадам на аэрадром базіравання. У выкананні палётаў з АУД прымуць удзел авіяцыйная тэхніка і экіпажы 206-й штурмавой авіяцыйнай базы і 927-й знішчальнай авіяцыйнай базы Паўночна-заходняга аператыўна-тактычнага камандавання ВПС і войскаў ППА Беларусі.

У забеспячэнні палётаў будуць задзейнічаны розныя воінскія часці, падраздзяленні службы ВПС і войскаў ППА. На асабовы склад падраздзяленняў войскаў сувязі ўскладзена задача забеспячэння радыёсувязі. На падраздзяленні радыётэхнічных войскаў — радыёлакацыйны кантроль палётаў авіяцыі па заходніх маршрутах, выдача радыёлакацыйнай інфармацыі на пункты баявога кіравання авіяцыяй.

Шэраг задач таксама будзе вырашацца падраздзяленнямі інжынерна-аэрадромнага, тэхнічнага і тылавога забеспячэння. Гэта падрыхтоўка ўзлётна-пасадачнай паласы, запраўка самалётаў, маскіроўка авіяцыйнай тэхнікі і сродкаў наземнага забеспячэння агульнага прымянення пасля пасадкі самалётаў.

«Правядзенню палётаў з АУД папярэднічала падрыхтоўчая работа. Былі адпрацаваны пытанні арганізацыі ўзаемадзеяння пунктаў кіравання з экіпажамі штурманскага забеспячэння, з лётным складам праведзены трэніровачныя палёты. Акрамя таго, арганізавана цеснае ўзаемадзеянне з выканаўчымі і распарадчымі органамі ўлады», — адзначыў Вячаслаў Раменчык.

Камандзірам авіяцыйных часцей у адпаведнасці з планам вучэння прадастаўлена права самім у аператыўным парадку вызначаць час і месца пасадкі баявых самалётаў на АУД.

Авіяцыйнае пакрыццё раёна палётаў плануецца ажыццяўляць верталётамі Мі-24 181-й баявой верталётнай базы.

Упершыню лётны склад ВПС і войскаў ППА Беларусі пачаў падрыхтоўку да палётаў з выкарыстаннем АУД у 2007 годзе. Пасадкі на АУД выкананы экіпажамі 206-й штурмавой авіяцыйнай базы (на самалётах Су-25) і 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы (на Су-27 і МіГ-29).

Кар. БЕЛТА.

Парламенцкі дзённік

Ліцэісты ў крэслах сенатараў

Савет Рэспублікі па традыцыі расчыніў дзверы для маладых і дасціпных

З нагоды Міжнароднага дня дэмакратыі ў Савеце Рэспублікі прайшла адмысловая «лекцыя» пра беларускі парламентарызм. Сёлета наведаць верхнюю палату парламента пашчасціла навучэнцам Ліцэя БДУ.

Юнакі і дзяўчаты прайшліся па памяшканнях Савета Рэспублікі і нават занялі крэслы сенатараў у зале пасяджэнняў — пакуль толькі на час гутаркі. Яны жвава цікавіліся ўсім: ад работы аўтаматызаванай сістэмы для рэгістрацыі і галасавання парламентарыяў да асноў моладзевай палітыкі, над прававым замацаваннем якіх цяпер працуюць заканадаўцы. Пазнавальную гутарку з ліцэістамі, якія навучаюцца на гістарычным профілі, вялі члены прэзідыума Савета Рэспублікі Ніна Мазай і Антаніна Морава. Яны расказалі, у прыватнасці, пра дзейнасць камісій, якія ўзначальваюць — па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці (адпаведна). Дзень адчыненых дзвярэй відавочна быў плённым для абодвух бакоў: ліцэісты даведаліся больш пра айчынны парламент, а заканадаўцы паслухалі маладых, можа, сёе-тое з выказанага знойдзе адлюстраванне ў законах.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Прэм'ера

ЛЯЛЬКІ НЕ СТАРЭЮЦЬ. АЛЕ РАЗВАЖАЮЦЬ, ЧАМУ ГЭТА АДБЫВАЕЦЦА З ЛЮДЗЬМІ

Адказы на сур'ёзныя пытанні лялечнікі раяць шукаць у беларускіх казках.

Менавіта іх узяў за аснову Анатоль Вярцінскі, вырашыўшы паразважаць пра тое, адкуль бяруцца пакуты і несправядлівасць. А рэжысёр Аляксей Леляўскі пачытаў сумную гісторыю, але не стаў нудзіцца, а наадварот, успрыняў усе сур'ёзныя думкі з пэўнай доляй іроніі, якой часам нестае беларусам. І вырашыўшы падзяліцца ёю з іншымі, узяўся за працу. Вынікам яе стаў спектакль «Чаму старэюць людзі?», які 25 верасня адкрые тэатральны сезон у Беларускім дзяржаўным тэатры лялек.

Ідэю рэжысёра падтрымала мастак Таццяна Нерсісян, зразумеў гумар і Леанід Паўлёнак — лідар гурта «Нагуаль» стварыў музыку для спектакля.

Таму дзівіцца не трэба, калі ўбачыце вяскоўцаў, якія жывуць у шпакоўнях, а самая галоўная частка іх цела — неверагодна доўгія рукі, такія працавітыя...

Гумар яшчэ і ў тым, што прэм'ера ў лялечным тэатры адбудзецца днём, а паглядзець спектакль варта не толькі дзецям, якія любяць казкі, але і іх бацькам. Хоць бы дзеля таго, каб паглядзець на саміх сябе ў розных жыццёвых абставінах з пэўнай доляй самаіроніі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Праект прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2010 год будзе прадстаўлены Прэзідэнту да 1 кастрычніка

Аб гэтым паведаміў журналістам прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі. Ён знаёміцца з ходам тэхнічнага пераўзбраення Аршанскага льнокамбіната.

Праект прадугледжвае два шляхі развіцця эканомікі: збалансаваны, базавы варыянт, які прадугледжвае тэмп росту валавога ўнутранага прадукту на ўзроўні 102—103 працэнтаў, і абнадзейлівы, перспектыўны — на ўзроўні 110—111 працэнтаў.

«Развіццё беларускай эканомікі будзе залежаць ад актыўнасці сусветных рынкаў», — растлумачыў Сяргей Сідорскі. Сёння многія дзяржавы, у тым ліку Расія і ЗША, заявілі аб тым, што яны выходзяць з крызісу. Выхад з крызісу дае магчымасць разлічваць ураду на ажыўленне рынкаў і сусветнай эканомікі ў цэлым, значыць, на павелічэнне экспарту беларускай прадукцыі.

Яшчэ адным фактарам для аптымістычнага развіцця эканомікі Беларусі стане асваенне новых рынкаў збыту, упэўнены Сяргей Сідорскі. «Мы пераконваемся, што на рынках трэціх краін — у Афрыцы, Азіі — ёсць нішы, дзе беларуская прадукцыя запатрабавана», — сказаў ён. Напрыклад, на Афрыканскім кантыненце неабходна да 50 тыс. трактароў. Фактычна ўся праграма трактарнага завода можа быць прададзена, растлумачыў прэм'ер-міністр. Дакладна такія ж патрэбнасці ў тэхніцы БелАЗа, МАЗа і іншых флагманаў. «Гэта новыя перспектывы, і іх трэба паскорана развіваць, трэба рухацца больш хутка...».

Беларусь не здымае амбіцыйных задач перад эканомікай

Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з кіруючым дырэктарам банка АКА «Аўсфюркрэдыт-Гезельшафт» Гансам-Ёргам Тотам.

«Ён адзначыў, што пры агульным спадзе эканомік суседніх дзяржаў тэмп росту інвестыцый у Беларусі складае ў гэтым годзе амаль 117 працэнтаў.

Паводле слоў Сяргея Сідорскага, Германія для Беларусі — адна з вядучых краін-партнёраў. За 7 месяцаў двухбаковы тавараабарот перасягнуў 1 млрд еўра. У Беларусі створана 352 прадпрыемствы з удзелам нямецкага капіталу, яны паспяхова працуюць.

У цэлым Сяргей Сідорскі нагадаў, што Беларусь сусветны фінансавы крызіс таксама не абмінуў. Аднак у краіне распрацавана добрая антыкрызісная праграма, якая апраўдала сябе. «Пацвярджэннем таго з'яўляецца тое, што ВУП Беларусі ў гэтым годзе знаходзіцца ў межах ўзроўню 2008 года, гэта значыць фактычна мы ідзём па планцы мінулага года», — сказаў прэм'ер-міністр.

«Нам важна было паглядзець МТЗ і завод «Інтэграл», якія мы фінансуем. Мяне здзівіла тое, якога поспеху яны дабіліся на міжнародным рынку. Гэта цудоўна. Я падзякаваў кіраўніцтву гэтых кампаній за тое, што яны зрабілі», — падкрэсліў кіруючы дырэктар банка АКА.

Акрамя таго, Ганс-Ёрг Тот падкрэсліў: «Мне было прыемна чуць, што Беларусь знайшла магчымасць пазбегнуць наступстваў сусветнага фінансавага крызісу. Германія не знайшла такіх магчымасцяў. Эканамічны рост тут будзе адмоўны ў межах 6-7 працэнтаў».

БЕЛТА.

Пратадыякан Андрэй КУРАЕЎ:

«Сям'я — еднасць і любоў»

ПАТРЫЯРШАСТВА КІРЫЛА БУДЗЕ АДРОЗНІВАЦЦА СПРОБАЙ ПЕРАМЕНЫ ПСІХАЛОГІІ ПРАВАСЛАЎНЫХ ЛЮДЗЕЙ

Пра гэта ўчора ў Мінску расказаў студэнтам і ўсім прысутным на сустрэчы ў Беларускім дзяржаўным аграрным універсітэце вядомы праваслаўны місіянер, прафесар Маскоўскай духоўнай акадэміі пратадыякан Андрэй КУРАЕЎ. Яго лекцыя адбылася ў рамках цыкла выступленняў, прадугледжаных Духоўна-асветніцкай праграмай «Сям'я — еднасць і любоў», якая праходзіць гэтымі днямі ў Мінску. Тэма лекцыі: «Моладзь і сучасная культура».



Фота Ўгена ПЯСЕЦКАГА.

Прафесар заўважыў, што інерцыя Царквы праяўляецца ў тым, што праваслаўныя людзі прывыклі быць меншасцю, якую прыціскаюць, і ў тым, што яны мараць пра вяртанне «мірных часоў», маючы на ўвазе незваротнае дарэвалюцыйнае мінулае. Аднак свет змяніўся, ён стаў вельмі рознаблічным, і каб размаўляць з ім, трэба ўмець размаўляць на яго мове. Каб размаўляць з моладдзю, трэба навучыцца гаварыць з ёй на розных мовах сучасных субкультур. «Сёння нам зноў патрэбна Пяцідзясятніца», — сказаў праваслаўны багаслоў.

Пратадыякан заўважыў, што сёння Праваслаўнай царкве ў нашых краінах неабходна намаганне, каб пераадолець сваю ізаляванасць і не бегчы ад міру, а ісці ў мір. «Не хаваць святыні ад бруду, а асвячаць імі бруд». Зменай гэтай псіхалогіі, са слабай пазіцыі на моцную, будзе адрознівацца патрыяршаства Кірыла ад патрыяршаства Аляксія II.

— Чаму я люблю Мінск, — заўважыў айцец Андрэй, — таму што ў Беларусі Праваслаўе ў меншай ступені імкнецца толькі капіраваць мінулае. Не парушаючы канонаў, тут не баяцца і не баяліся раней адлюстроўваць свой уласны час. Гэта бачна па архітэктуры Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, Дома Міласэрнасці і беларускай іканаграфіі XX стагоддзя.

Што датычыцца адносінаў царквы да сучаснай культуры, то тут, лічыць прафесар, важна прытрымлівацца прынцыпу: няхай я буду валодаць усім, але каб толькі нішто не валодала мной. Калі чалавек не раствараецца ў нечым, не губляе сваёй чалавечнасці, то гэта не з'яўляецца дрэнным.

Пасля лекцыі ў перапоўненай актавай зале пратадыякан адказаў на пытанні маладых людзей. На жаль, часу на гэта было недастаткова.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Навуздагон: «Самыя вялікія і самыя малыя кватэры Беларусі»

ТАЯМНІЦА ПАРНІКОВАГА ЗАВУЛКА

Плошча самай вялікай кватэры Мінска выдуманая?

«Беларуская Рублёўка», інакш і не назавеш элітны квартал на завулку Парніковым, 13 у Мінску. Як мы ўжо ўчора пісалі, згодна са звесткамі Беларускага кадастравага агенцтва, менавіта на гэтым завулку размешчаная самая вялікая кватэра ў сталіцы — ажно на 12 пакояў агульнай плошчай 797,2 кв.м. Згодна з тымі ж звесткамі вядома таксама, што размешчана яна ў трохпавярховым доме.

Каб паглядзець на цуда-кватэру і яе ўладальнікаў, я з'ездзіў па вышэй прыведзеным адрасе і пачаў пошукі патрэбнай кватэры. Але зрабіць гэта насамрэч было не так і проста, як падаецца на першы погляд.

Дом разбіты на пад'езды, да кожнага з якіх вядуць адмысловыя вароты, замкнёныя. Побач — дамафон. Усяго выходзіць чатыры кватэры. У першай мне адказала прыслуга. Гаспадароў, маўляў, няма, размаўляць з вамі не маю права. Калі вернуцца, сказаць таксама не магу, забаронена. Павінны быць вечарам, а якой гадзіне, не ведаю, а хатні нумар тэлефона даць не магу. Прабачце.

У другой кватэры мужчынскі голас у дамафоне адказаў, што мае звесткі памылковыя, а плошча яго кватэры меншая: «колькі ёсць — столькі ёсць, мне хапае». На маю просьбу пагаварыць, адказаў адмоўна.

У трэцяй кватэры дамафон маўчаў, на ім яшчэ павуцінне гойдалася: відаць, гаспадары ў хату прыязджаюць не часта. З-пад варот жа, грозна рыкаючы, нецярпліва высоўвалася сабачая пыса. Хоць надпісу «Асцярожна, злы сабака» і не было, але і без яго было зразумела, лавіць няма чаго.

Я ўжо збіраўся сыходзіць, як заўважыў машыну, што ехала ў кірунку гэтага дома. Мне пашанцавала, гэта быў жылец яшчэ адной кватэры з гэтага дома.

Вылезшы са свайго хуткаснага і дарагога чорнага каня, мужчына доўга ўзіраўся ў маё журналісцкае пасведчанне, пасля чаго зрабіў заключэнне: «Ваша інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці. Наўрад ці вы знойдзеце тут такую кватэру». Тады я запытаў, колькі пакояў у яго кватэры.

— У мяне 5 пакояў, але плошча іх больш чым 200 кв. м не будзе. Так што нічым дапамагчы не магу. Відаць, у вашых звестках лічылі ўвесь дом. Разам, яно, можа, і набярэцца на кватэру з 12 пакояў. Выбачайце, няма калі з вамі размаўляць...

Атрымоўваецца, альбо жыльцы памыляюцца, альбо памыліўся складальнік рэестра.

— Апошняе можа і магчыма, але цалкам малаверагодна. Пры рэгістрацыі здзелкі аб куплі-продажы заўсёды правяраецца тэхпашпарт аб'екта, — патлумачыў «Звяздзе» начальнік аддзела ацэнкі зямель Нацыянальнага кадастравага агенцтва **Дзмітрый РЫТВІНСКІ.** — Іншая рэч, вы не з усімі жыльцамі паразмаўлялі. Усё завязана на сістэме рэгістрацыі маёмасці. Гэта цэлы механізм, у якім разбіраюцца пераважна спецыялісты. І інфармацыя, якую мы прыводзім на сайце, прызначана толькі для зацікаўленых асобаў. Увогуле звесткі для нашага сайта мы бяром у **Адзіным дзяржаўным рэгістры нерухомай маёмасці (АДРНМ).** І калі там была ўказаная лічба 792,2 кв. м — значыць так і было.

Як мне патлумачылі ў **Мінскім гарадскім агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і замельным кадастры,** інфармацыя аб плошчы, уласніку і ўмовах здзелкі рэгулюецца Законам аб дзяржаўнай рэгістрацыі маёмасці, таму гэта інфармацыя можа быць дадзена толькі зацікаўленым асобам, якімі журналісты ў гэтым выпадку не з'яўляюцца.

Так што пагаварыць і ўбачыцца з гаспадаром самай вялікаквартэрнай па афіцыйных звестках сталічнай кватэры ў мяне не атрымалася. А так карцела спытаць, колькі гасцей можа змясціцца ў такой кватэры... Але мо і сапраўды такой кватэры не існуе, як кажуць жыхары з Парніковага завулка?

Некалі адзін рускі пісьменнік напісаў свой геніяльны раман «Мёртвыя душы». Цікава, калі б ён жыў у наш час, ці ўзяўся б за раман пад назвай «Мёртвыя кватэры»?

Ілья ЛАПАТО.

У КОЛЬКІ АБЫДЗЕЦЦА БЕЛАРУСІ ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ-2014 ПА ХАКЕІ?

Ва Урадзе падлічылі даходы і выдаткі

Учора пад старшынствам кіраўніка Урада Сяргея Сідорскага прайшло пасяджэнне аргкамітэта па падрыхтоўцы да правядзення чэмпіянату свету па хакеі, які прыме беларуская сталіца з 9 па 25 мая 2014 года. Як паведаміў міністр спорту і турызму Алег Качан, яго міністэрствам сумесна з Міністэрствам фінансаў складзены папярэдні каштарыс расходаў і даходаў сусветнага першынства. Пры сярэдняй наведвальнасці матчаў у 6 тысяч чалавек і колькасці турыстаў, якіх, як плануецца, прыме Мінск каля 50 тысяч (за аналаг прымалася наведвальнасць чэмпіянату свету па хакеі 2007 года ў Маскве), даход складзе 53,3 мільёна еўра, у тым ліку 10,5 мільёна еўра — ад продажу білетаў, 42 мільёны еўра — ад прыёму замежных турыстаў, 684 тысячы еўра — ад прыёму прадстаўнікоў СМІ, якіх чакаецца каля 300. Пры гэтым міністр заўважыў, што ўсе правы на тэлетрансляцыі матчаў і рэкламу, а таксама сродкі ад іх атрымання, згодна з рэгламентам спаборніцтваў, належаць Міжнароднай федэрацыі хакея.

Мяркуецца, правядзенне спаборніцтваў абыдзецца нашай краіне ў 32,9 мільярда рублёў, у тым ліку 19,1 мільярда рублёў будзе выдаткавана з бюджэту, а 13,8 мільярда — з пазабюджэтных крыніц. Бюджэтныя сродкі плануецца патраціць на пражыванне і харчаванне камандаў, трэнераў, суддзяў, афіцыйных асобаў у гатэлях «Мінск», «Еўропа», «Crowne Plaza», «Вікторыя», на забеспячэнне працы прэс-цэнтраў, медыцыну, допінг-кантроль, арэнду памяшканняў, лядовых арэн і канферэнц-залаў, аўтатранспарту, у тым ліку машын хуткай дапамогі і пажарных, культурна-забаўляльную праграму, у прыватнасці цырымоніі адкрыцця і закрыцця спаборніцтваў. Пазабюджэтныя сродкі пойдуць на правядзенне кангрэсу Міжнароднай федэрацыі хакея, які па традыцыі павінна арганізаваць краіна-гаспадыня, а таксама на вытворчасць білетаў і сувенірнай прадукцыі, арганізацыю забаўляльнай праграмы для гасцей, аплату працы суддзяў, даплату на харчаванне спартсменаў, трэнераў, суддзяў, валанцёраў, афіцыйных асобаў.

Фота БЕЛТА.

Аднак гэта толькі прамыя выдаткі. Падрыхтоўка да чэмпіянату свету, якая пачалася даўно, уключае ў сябе яшчэ шэраг расходаў. Будаўніцтва «Мінск-Арэны» амаль скончана, яе гатоўнасць складае цяпер, паводле слоў міністра, 90 працэнтаў. Другая лядовая пляцоўка, «Чыжоўка-Арэна», цалкам павінна быць пабудавана праз тры гады. Кошт праектных работ гэтага збудавання — 2 мільярды рублёў, агульны кошт будаўніцтва — каля 500 мільярдаў. Для будаўніцтва будуць выкарыстаныя інвестыцыйныя сродкі ГД «Ждановічы» і гарадскога бюджэту. Для рассялення шматлікіх гасцей чэмпіянату будуць выкарыстоўвацца ўсе сталічныя гасцініцы, 12 з іх знаходзяцца зараз на стадыі атрымання катэгорыі 2-3 зоркі, паведаміў Алег Качан. Яшчэ чатыры гасцініцы будуць пабудаваныя ў Мінску да 2014 года — зямельныя ўчасткі пад будаўніцтва ўжо выдаткаваныя. Гэтыя гасцініцы з'явяцца на перакрыжаванні вуліц Кірава і Леніна, на вуліцы Прытыцкага, побач са стадыёнам «Дынама» і побач з пляцоўкай «Чыжоўка-Арэна». Плануецца і выкарыстанне інтэрнатаў сталічных ВНУ і студэнцкай вёскі на 7 тысяч месцаў, якая будзе пабудаваная да 2011 года. Акрамя ўсяго, да паслуг гасцей чэмпіянату пансіянаты і дамы адпачынку сталічнай вобласці. Акрамя таго, на перакрыжаванні сталічнай вуліцы Макаёнка і праспекта Незалежнасці будуць пабудаваныя жылыя комплексы для гасцей сусветнага першынства, якія затым будуць рэалізаваныя насельніцтву. Цяпер у сталіцы 1785 аб'ектаў грамадскага харчавання на 125 тысяч месцаў. Да 2014 года іх колькасць павялічыцца да 136 тысяч месцаў.

Да сусветнага першынства плануецца мадэрнізаваць і транспартную інфраструктуру. Запланаваная рэканструкцыя аэрапорта «Мінск-2» з будаўніцтвам другой узлётна-пасадачнай паласы, што абыдзецца ў 220—230 мільёнаў долараў. Хоць, як заўважыў міністр, інфраструктура нацыянальнага аэрапорта дазваляе забяспечыць міжнародныя перавозкі на ўзроўні, які адпавядае правядзенню чэмпіянату свету. У Мінску плануецца пабудаваць чатыры транспартныя развязкі, адрамантаваць і рэканструяваць усе дарогі, якія вядуць да аб'ектаў, што будуць выкарыстоўвацца падчас чэмпіянату свету і дзе будуць пражываць яго ўдзельнікі. Агульная сума гэтых работ — 2,3 трыльёна рублёў, сродкі будуць выдаткаваныя з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Акрамя таго, да 2014 года дэпартамент «Белаўтадар» плануе рэканструяваць па параметрах першай катэгорыі (з чатырма палосамі руху) дарогі ад Мінска да Магілёва і Бабруйска, часткова рэканструяваць участкі трас Мінск—Гродна і Мінск—Віцебск.

Як паведаміў Алег Качан, сумесна з Міністэрствам фінансаў запланаваны выпуск спецыяльнай латэрэі, прысвечанай сусветнаму першынству. Яе розыгрыш будзе праходзіць са студзеня 2013 года па май 2014-га.

Падчас чэмпіянату свету ў Мінск прыедзе 16 камандаў-удзельніц, а гэта больш за 530 спартсменаў, а таксама трэнеры, суддзі, прадстаўнікі Міжнароднай федэрацыі хакея, плануецца акрэдытаваць больш за 300 замежных журналістаў. У якасці балельшчыкаў чакаецца прыезд каля 50 тысяч гасцей з Еўропы, Азіі і Амерыкі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

У Брэсце такіх кватэр няма?

Ва ўчарашнім нумары газеты былі надрукаваны звесткі айчыннага кадастравага агенцтва, узятыя з яго сайта, пра сенсацыйныя плошчы кватэр. Сярод такіх значылася і самая малая ў Беларусі (толькі 2 м²) кватэра па вуліцы Герояў абароны Брэсцкай крэпасці ў доме № 76. Гэты дом знаходзіцца на абслугоўванні ЖЭС-4. Яго кіраўнік Уладзімір Швед вельмі здзівіўся такой інфармацыі. Адразу ўзяў тэхнічны пашпарт на ўказаны дом, уважліва прагледзеў яго. З дакумента вынікала, што 90-кватэрны жылы дом мае шэсць пад'ездаў і з'яўляецца тыповым пяціпавярховікам узору 1973 года. Самыя меншыя па плошчы кватэры маюць 16,1, 16,2 метра жылых пакояў пры агульнай плошчы 31 і 34 метры. Уладзімір Дзмітрыевіч выказаў меркаванне наконт таго, што на нейкім этапе падрыхтоўкі дакументаў названым агенцтвам дапушчана тэхнічная памылка. У выніку першая лічба памеру плошчы згубілася, ёсць жа, напрыклад, кватэра з агульнай плошчай роўна 42 метры. Таму што кватэру з плошчай у два квадратныя метры нават уявіць цяжка.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже изолированного помещения (вспомогательное (подсобное) помещение № 1 Н общей площадью 251,14 кв. м, инвентарный номер 500/D-694957), принадлежащего ОАО «Камволь» и расположенного по адресу: г. Минск, ул. Солнечная, д. 30.

Начальная цена – 682 964 100 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 60 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится **14 октября 2009 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **25.09.2009 по 12.10.2009** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.

Абзац

◢ Супрацоўнікі МНС Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці за тры гадзіны адшукалі ягадніц, якія заблудзіліся ў балоце. Дзве жыхаркі Дуброўна 1989 і 1977 гадоў нараджэння, згубіўшы пільнасць, апынуліся сярод непраходнай багны Асінторфскага сельсавета і выбрацца самастойна не змаглі. Аднак ім пашанцавала: пры іх быў мабільны тэлефон, па якім яны патэлефанавалі ў МНС, і ў складзе пошукавай групы былі два дасведчаныя выратавальнікі, якія добра ведалі мясцовасць. За тры гадзіны, ужо ў цемры, выратавальнікі змаглі адшукаць і вывесці жанчын. Сабраныя ягады жанчыны не кінулі.

◢ Урач-гігіеніст абвінавачваецца ў атрыманні хабару ад прадпрымальнікаў у выглядзе тавараў бытавой хіміі і туалетных прыналежнасцяў. Хабар урач Мінскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, 1980 года нараджэння, атрымлівала ад двух прадпрымальнікаў ТД «Ждановічы». Ёй перадалі тавараў і матэрыяльных каштоўнасцяў на суму Br187 тыс. і Br109 тыс. Аплата прызначалася за тое, што ўрач закрывала вочы на адсутнасць у гандляроў гігіенічных пасведчанняў на прадукцыю, што рэалізоўвалася, на парушэнне санітарных нормаў і гігіенічных нарматываў.

◢ Непрацуючы 32-гадовы жыхар вёскі Валяр'янава спрабаваў збыць пісталеты «Чэска Зброеўка» і «Дрэйзе». Ён быў затрыманы супрацоўнікамі 6-га ўпраўлення ГУБАЗ МУС, спецпадраздзяленнем па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз» і аператыўнікамі крымінальнага вышуку. Заведзена крымінальная справа.

◢ Гомельскія памежнікі на мяжы з Украінай у лесе затрымалі групу з 54 парушальнікаў, грамадзян гэтай краіны. Сярод затрыманых 39 чалавек — няпоўнагадовыя. Яны незаконна перайшлі мяжу з мэтай збору журавін. У іх канфіскавана каля паўтоны гэтай ягады. Парушальнікаў перадалі ўкраінскім памежнікам. Дарэчы, усе яны — жыхары аднаго населенага пункта.

◢ П'яны кіроўца 1974 года нараджэння без правоў збіў насмерць у Мінску жанчыну 1948 года нараджэння, якая пераходзіла дарогу на зялёнае святло святлафора. Ад атрыманых траўмаў яна памерла на месцы. Заведзена крымінальная справа. Каментуючы здарэнне, супрацоўнікі ДАІ не хавалі эмоцый: «У Дзень без аўтамабіля, калі ўсіх кіроўцаў заклікалі пакінуць машыны дома, гэты мужчына ўмудрыўся не проста сесці за руль, але зрабіў гэта, быўшы пазбаўленым правоў, у гадзіну дня ўжо напіўся, паехаў на чырвонае святло і пазбавіў жыцця чалавека!»

◢ Рухаючыся з МКАД у бок Калядзічаў, маршрутнае таксі ўрэзалася на вул. Бабуліна ў МАЗ, які стаяў каля дарогі. У выніку ДТЗ пацярпелі дзве пасажыркі. Кіроўца не змог выразна растлумачыць, чаму адбылася аварыя.

◢ У Драгічынскім раёне затрыманы 24-гадовы кіроўца, які на працягу гадзіны збіў двух пешаходаў і збег з месцаў здарэння. Першае ДТЗ жыхар горада Бярозы, кіруючы аўтамабілем «Масквіч-412», здзейсніў 21 верасня ў 17.25 у вёсцы Аполь Іванаўскага раёна. Ён наехаў на 77-гадовую мясцовую жыхарку і з'ехаў. У 18.20 у вёсцы Хомск гэты ж кіроўца наехаў на 31-гадовую жанчыну, якая ехала на веласіпедзе, і таксама з'ехаў з месца ДТЗ. Пацярпелыя з траўмамі ў бальніцы, а кіроўцу «Масквіча» ў стане алкагольнага ап'янення затрымалі прыкладна за кіламетр ад месца здарэння. Правоў яго пазбавілі яшчэ 15 жніўня 2007 года.

Поўны абзац

◢ Жыхары Лос-Анджэлеса змогуць трымаць не больш за аднаго пеўня на сям'ю. Адпаведнае абмежаванне ўвёў гарадскі савет, які імкнуўся такім чынам абараніць жыхароў ад лішняй турботы ў начны час і па раніцах. Абмежаванне распаўсюджваецца толькі на хатнія гаспадаркі, прадпрыемствам абмяжоўваць колькасць пеўняў не давядзецца. Тыя жыхары, якія ўжо ўтрымліваюць дома больш за аднаго пеўня, змогуць звярнуцца ў гарадскі дэпартамент па справах жывёл і запытаць адначасовую ліцэнзію на дадатковых пеўняў коштам 50 долараў.

◢ Раённы суд у польскім горадзе Быдгошч даў у газету абвестку, у якой заклікае нейкую Сафі Бом прыбыць у судовую інстанцыю. Калі жанчына не прыйдзе ў суд, яна будзе прызнаная памерлай. Самае забаўнае, што Сафі Бом нарадзілася ў... 1782 годзе. Як выявілася, суд насамрэч шукае 227-гадовую жыхарку горада. У судовых дакументах Сафі Бом лічыцца спадчынніцай буйнай нерухомасці. На ўласнасць прэтэндуюць яе далёкія спадчыннікі, а для таго, каб зямля і дамы перайшлі ім у спадчыну, судовы орган павінен прызнаць прамога спадчынніка памерлым.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом имущества детского оздоровительного лагеря «Бригантина», (балансодержатель – УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ»), расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, 0,5 км севернее д. Петровщина, детский оздоровительный лагерь «Бригантина».

В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объектов	Инв. №
1.	Физкультурно-оздоровительный комплекс (общая площадь – 283,7 кв.м)	630/С-47603
2	Котельная с навесом (общая площадь – 396,4 кв. м)	630/С-47604
3	Детсад-ясли корпус № 1 (общая площадь – 1276,0 кв.м)	630/С-47605
4	Трансформаторная подстанция (общая площадь – 18,0 кв.м)	630/С-47607
5	Административно-приемный корпус (общая площадь – 101,1 кв.м)	630/С-47608
6	Детсад-ясли на 140 мест корпус № 2 (общая площадь – 1096,1 кв.м)	630/С-47609
7	Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 732,4 кв.м)	630/С-49350
8	Здание специализированное для общественного питания (общая площадь – 1749,6 кв.м)	630/С-49353
9	Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 735,4 кв.м)	630/С-49354
10	Канализационно-насосная станция (общая площадь – 23,5 кв.м)	630/С-47570
11	Склад (общая площадь – 165,1 кв.м)	
12	Бытовое здание для обслуживающего персонала (общая площадь – 131,8 кв.м)	
13	Кабельная линия	
14	Внешние кабельные сети	
15	Наружное освещение	
16	Наружные сети тепловые, водопроводные и т.п.	
17	Наружная канализация	
18	Водопровод с артскважиной	
19	Водонапорная башня	
20	Устройство подъездной автодороги	
21	Ограждение с воротами	
22	Противопожарный подъезд к водоему	
23	Котел Минск-1	
24	Котел Минск-1	
25	Теплообменник Р-025-8,9-1Х	
26	Лифт грузовой малый	
27	Лифт грузовой г/п 100 кг	
28	Таль электрическая МЗ-320	

Начальная цена – 1 824 327 605 белорусских рублей.

Земельный участок площадью 11,75 га (в том числе: земельный участок площадью 10,3544 га, кадастровый номер 623881300980000008, земельный участок площадью 0,0232 га, кадастровый номер 623881300980000007, земельный участок площадью 1,3754 га, кадастровый номер 623881300980000009) предоставлен для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений детского оздоровительного лагеря «Бригантина».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предо

НА СЁННЯ ДЭПАРТАМЕНТАМ АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АХОЎВАЕЦЦА АМАЛЬ 175 ТЫС. АБ'ЕКТАЎ РОЗНЫХ ФОРМАЎ УЛАСНАСЦІ ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ. КАЛЯ 139 ТЫС. ЖЫЛЫХ ДАМОЎ, КВАТЭР І ІНШЫХ ПАМЯШКАННЯЎ З АСАБІСТАЙ МАЁМАСЦЮ ГРАМАДЗЯНЕ ДАВЕРЫЛІ СУПРАЦОЎНІКАМ АХОВЫ.

АХОВА

ПАД ЗНАКАМ САВЫ

№ 1 (1)

З ПАЧАТКУ 2009 ГОДА МІЛІЦЫЯНЕРЫ ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПРАДУХІЛІЛІ 430 СПРОБАЎ ПРАНІКНЕННЯ НА АХОЎНЫЯ АБ'ЕКТЫ, ПРЫ ГЭТЫМ ЗАТРЫМАНА 270 АСОБАЎ, ЯКІЯ ІХ УЧЫНІЛІ.

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

3

24 верасня 2009 г. ЗВЯЗДА

Начальнік Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, палкоўнік міліцыі Сяргей БУЙНОЎСКІ:

МЫ ЖЫВЁМ І СЛУЖЫМ НА ВАШУ КАРЫСЦЬ

Сёння выйшаў у свет першы нумар дадатку «Ахова: пад знакам савы», створаны супрацоўнікамі Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь і журналістамі газеты «Звязда». Ён прысвечаны нашым калегам, тым, хто стаіць на варце вашых інтарэсаў, паважаныя чытачы! Бо мы па праву можам ганарыцца многімі прыкладамі самаадданага выканання супрацоўнікамі падраздзялення аховы свайго службовага абавязку. Абсалютная большасць нашых міліцыянераў штодзень праяўляюць смеласць і мужнасць, сумленнасць, дэманструюць вернасць грамадзянскаму і службоваму абавязку, гатоўнасць у любую хвіліну прыйсці на дапамогу. Менавіта пра гэта мы і хочам расказаць вам на старонках нашага дадатку.

Бо мы жывём і служым на вашу карысць і нам патрэбныя вашы падтрымка і ўвага!

З вялікай павагай да вас, С.А. БУЙНОЎСКІ.

«У ВАС У КРАМЕ ВОПРАТКА НЕ ЗНІКАЛА?!»

Нарад Савецкага аддзела аховы затрымаў «несуноў» з ЦУМа

Як вядома, усё тайнае рана ці позна становіцца яўным — гэта толькі пытанне часу. У нашым выпадку час быў на баку справядлівасці, згуляўшы на карысць дзяржаўнага гандлю ў асобе работнікаў ЦУМа.

Напярэдадні Дня ведаў работнікі сталічнага ўнівермага былі настолькі загружаныя, што нават і ўявіць не маглі, які «сюрпрыз» іх чакае. Колькасць наведвальнікаў ва ўнівермагу ў такія дні заўсёды павялічваецца ў разы. Кожны чымсьці цікавіцца, пытаецца, раіцца — за ўсімі і не ўсочыш.

Так і атрымалася — не ўсачылі. Някідка апранутыя мужчына і цяжарная жанчына, якія зайшлі ў дзіцячы аддзел, не выклікалі ў прадаўцоў ніякіх падазрэнняў. Зразумелая справа, жанчына была «ў становішчы», выбіралі рэчы для будучага дзіцяці. Карацей, звычайныя пакупкі будучых бацькоў. Пасля гэтыя двое наведаліся ў аддзел жаночай бялізны, дзе таксама ніякіх падазрэнняў не выклікалі. А праз некалькі гадзін парачка была затрыманая ў краме «Еўраопт» нарадам Савецкага аддзела аховы ў складзе прапаршчыкаў Юрыя Коўшава і Мікалая Жыткевіча, а таксама старшага сяржанта Андрэя Шушкета. У выніку затрымання было вызначана, што «пакупнікам» удалося вынесці з універмага два пакеты з дзіцячымі і жаночымі рэчамі: дзве хлапчуковыя курткі, некалькі камбінезонаў, штаны, а таксама жаночую споднюю бялізну — усяго на суму больш як 897 тысяч беларускіх рублёў.

— Мы з напарнікам падаспелі, калі Юрый ужо затрымаў падазроных, — патлумачыў Андрэй Шушкет. — Знаходзячыся ў пакоі міліцыі, які размешчаны ў ЦУМе на 2 паверсе, мужчына спрабаваў патлумачыць нам, што гэтыя рэчы ён набыў у пераходзе за 200 тыс. беларускіх рублёў, хоць на большасці ўкрадзеных тавараў засталіся нязнятыя магнітныя жэтоны. Затрыманыя, як высветлілася, ужо былі неаднаразова судзімыя. Мяне ўразіла тое, што жанчына, знаходзячыся на даволі вялікім тэрміне цяжарнасці, была ў стане наркатычнага ап'янення і бесперапынна курыла.

Ужо пасля затрымання зламыснікаў прадаўцы дзіцячага адзення ўспомнілі, што жанчына пастаянна аб нечым пыталася, каб адцягнуць іх увагу. Паколькі турнікеты не спрацавалі на адзенне, якое выносілася, гэта злачынства магло так і застацца нераскрытым.

ЗАЎСЁДЫ — НАПАГАТОВЕ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Менавіта па такім прынцыпе працуюць Старшы сяржант Дзмітрый БЫЧКОЎ і прапаршчык Андрэй АРХІПАЎ з Маскоўскага аддзела аховы горада Мінска.

Начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, палкоўнік міліцыі Віктар СКУРАТ:

«НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА КРЫЗІС, ІДЗЁМ НАСУСТРАЧ СВАІМ КЛІЕНТАМ»

Наколькі рэальна чалавеку без спецыяльнай адукацыі стаць супрацоўнікам Дэпартамента аховы? Колькі сёння каштуе ўсталяванне сігналізацыі ва ўласнай кватэры? Калі беларускім аўтаўладальнікам не трэба будзе асцерагацца зладзеяў? Пра гэта і не толькі пра гэта расказвае начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Беларусі, палкоўнік міліцыі Віктар СКУРАТ.

— Віктар Вацлававіч, калегі расказалі пра вашы спартыўныя дасягненні. Вы, як высвятляецца, былі неаднаразовым прызёрам і чэмпіёнам Савецкага Саюза па лёгкай атлетыцы. Што прымусіла памяняць спартыўную кар'еру на міліцэйскую форму?

— Карані *(смяецца)*. Я ж родам з вёскі Дзянісы Стаўбцоўскага раёна, якая знаходзіцца паблізу маленькай радзімы народнага камісара ўнутраных спраў Фелікса Дзяржынскага. А калі сур'ёзна, то свой выбар — працаваць у міліцыі, нягледзячы на пасады і званні — зрабіў яшчэ падлеткам. Старэйшы брат працаваў інспектарам ДАІ, таму я не па чутках ведаў як станоўчыя, так і адмоўныя бакі міліцэйскага хлеба. Што датычыцца спорту, то я яшчэ доўгі час актыўна працягваў выступаць за міліцэйскую каманду.

— Пад вашым кіраўніцтвам сёння працуе больш за 7 тысяч чалавек. Скажыце, наколькі важная спартыўная падрыхтоўка для супрацоўніка Дэпартамента аховы?

— Фізічная падрыхтоўка — адзін з самых вызначальных фактараў пры прыёме на працу. Я лічу, што толькі здаровы і фізічна развіты чалавек можа працаваць у органах міліцыі.

— Якія яшчэ патрабаванні вы прад'яўляеце да сваіх работнікаў?

— У прэтэндэнтаў на афіцэрскія пасады павінна быць юрыдычная ці тэхнічная адукацыя. Простымі ж міліцыянерамі, якія ахоўваюць банкі, музеі і іншыя аб'екты, могуць працаваць і маладыя людзі, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту, пасля заканчэння сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. Праўда, у межах гэтай катэгорыі праводзім найбольш пільны адбор. Хлопцы павінны быць як мінімум на галаву вышэйшымі за сваіх аднагодкаў. Акрамя ўчарашніх школьнікаў, запрашаем студэнтаў 1—5 курсаў навучальных устаноў.

— Наколькі я ведаю, сярод вашых падначаленых нямала жанчын. А наколькі складана ім трапіць у лік супрацоўнікаў Дэпартамента аховы?

— Сапраўды, сярод неатэставаных работнікаў гарадскога ўпраўлення прыгожая палова чалавецтва пераважае, ды і атэставаных супрацоўніц не так мала (больш за 100 па Мінску). Патрабаванні пры прыёме на працу ў нас для ўсіх практычна аднолькавыя. Як маладыя людзі, так і дзяўчаты ў абавязковым парадку праходзяць медыцынскі агляд і псіхалагічнае тэсціраванне. Аднак дзяўчат бяром на працу толькі з вышэйшай адукацыяй. Чаму? Тут уся прычына ва ўзросце. Большасць маладых людзей прыходзяць да нас пасля арміі, калі ім спаўняецца як мінімум 20 гадоў. Дзяўчаты не служаць, таму, каб зрабіць свядомы выбар прафесіі, яны павінны атрымаць спецыяльнасць.

— А такога паняцця, як выпрабавальны тэрмін, у вас не існуе?

— Тых, хто вытрымаў «экзамен», накіроўваем у навучальны цэнтр Дэпартамента аховы МУС. Там яны вучацца за нашы сродкі і атрымліваюць стыпендыю. І толькі пасля спецыяльнай трохмесячнай падрыхтоўкі заключаем з імі дагаворы.

— Некаторыя бацькі, ведаю, навязваюць сваю прафесію дзецям, іншыя, наадварот, адгаворваюць.

— Я вельмі дэмакратычны бацька ў гэтым плане. Маю дваіх дзяцей — сына, якому споўнілася 23 гады, і дачку, якую сёлета адправіў у першы клас. Сын працуе ў сілавых структурах, ён — таксама афіцэр. Калегі хваляць яго, кажуць: «Гэта наш чалавек». Я, шчыра прызнаюся, ніколі не цягнуў сына за руку: «Ты павінен быць міліцыянерам!». Але і не адгаворваў. Лічу, што кожны чалавек павінен сам прымаць рашэнні, тым больш такое адказнае рашэнне, як выбар будучай прафесіі. Толькі тады, гэта маё перакананне, ён, хутчэй за ўсё, будзе любіць сваю працу, толькі тады яна будзе выконвацца якасна, а не абы з рук далоў. Кім захоча стаць дачка, казаць яшчэ рана. Але я падтрымаю любы яе выбар. А захоча стаць міліцыянерам — адгаворваць не буду.

— Віктар Вацлававіч, вы ўжо больш за 25 гадоў стаіце на варце закона, тры з іх — ва ўпраўленні Дэпартамента аховы. Не надакучыла?

— Я вельмі адданы сваёй справе. У мяне часта пытаюцца, ці пайшоў бы працаваць у міліцыю, калі б давялося выбіраць наноў. Пайшоў бы. Нягледзячы ні на што. Бо па-іншаму я сябе і сваё жыццё не бачу.

— Назавіце, калі ласка, прыярытэтныя кірункі сацыяльнай палітыкі ў Мінскім гарадскім упраўленні.

— Большасць новых супрацоўнікаў прыходзіць да нас з правінцыі. Таму найбольш актуальнай праблемай з'яўляецца жыллёвая. Але мы не сядзім склаўшы рукі, разглядаем розныя варыянты. Вось не так даўно нам паабяцалі каля 200 месцаў у інтэрнаце, хутка там пачнуцца рамонтныя работы. Гэтага, безумоўна, недастаткова, таму зараз вырашаем пытанне па выдзяленні зямлі для будаўніцтва кааператываў. Ужо ёсць некалькі прапаноў. Будзе жыллё — і людзі будуць імкнуцца да нас. Пакуль што мы стараемся матэрыяльна падтрымліваць супрацоўнікаў, якія вымушаны здымаць жыллё: яны падаюць нам адпаведныя дакументы, і мы кампенсуем іх выдаткі.

— Віктар Вацлававіч, не сакрэт, што ўпраўленне Дэпартамента аховы аказвае паслугі фізічным і юрыдычным асобам на платнай аснове. Як сусветны эканамічны крызіс адбіўся на дзелавых стасунках з кліентамі?

— Мы асабліва не заўважылі ўплыву крызісу. Людзі не разрываюць дагаворы з намі. Выключэнне складаюць толькі адзінкавыя дробныя арганізацыі. Большасць нашых кліентаў перажывае за сваю справу, жадае, каб усё было ў захаванасці. Тым больш у складаны ў эканамічным плане для краіны перыяд. Аб гэтым сведчыць тое, што ў нас павялічылася колькасць узяцця аб'ектаў пад ахову. У прыватнасці, сёння мы ахоўваем больш за 46 тысяч кватэр грамадзян і больш за 13 тысяч аб'ектаў розных формаў уласнасці. Людзі звяртаюцца да нас, і мы таксама ў сваю чаргу стараемся, заплюшчваючы вочы на крызіс, ісці ім насустрач. У прыватнасці, сёлета бясплатна абсталявалі кватэры ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Ды і расцэнкі за ахоўныя паслугі па ініцыятыве кіраўніцтва дэпартамента зніжаныя да 0,5 базавай велічыні. Акрамя таго, не так даўно пачалі прапаноўваць свае паслугі не толькі мінчанам, але і грамадзянам, якія жывуць за кальцавой дарогай (у 10-кіламетровай зоне). Кошт паслугі для іх такі ж, як і для мінчан.

— А колькі сёння каштуе ўсталяванне ахоўнай сігналізацыі ва ўласнай кватэры?

— Усё залежыць ад памеру кватэры, колькасці дзвярэй, паверха, на якім вы жывяце. Кошт паслуг па ўсталяванні сігналізацыі з улікам кошту апаратуры вагаецца па горадзе Мінску ад 300 тысяч да 1 мільёна рублёў. Напрыклад, поўная блакіроўка аднапакаёвай кватэры будзе каштаваць недзе 550—600 тысяч беларускіх рублёў, двухпакаёвай — 650—700 і г.д. Колькі будзе каштаваць абсталяванне сістэмамі сігналізацыі асобна размешчаных дамоў і катэджаў — падлічваецца індывідуальна па кожным будынку — усё залежыць ад планіроўкі жылля і ад тыпу апавяшчальнікаў.

— А ў вас дома ўсталяваная сігналізацыя?

— Само сабой. Яна была ўсталяваная яшчэ да таго, як я ўзначаліў упраўленне Дэпартамента аховы. Я перакананы, што ў любым выпадку лепш перастрахавацца. Сутнасць у тым, што ні адны заморскія дзверы і ні адзін сучасны замок не гарантуе вам і вашай маёмасці надзейнасці. Калі я яшчэ працаваў ва ўпраўленні ўнутраных спраў Заводскага раёна, давялося размаўляць з затрыманым кватэрным злодзеем. Якраз у той час пайшла мода на шыкоўныя металічныя дзверы і замкі. «Падумаеш, на секунд 30 больш страчу часу. Няма нічога такога, што мне перашкодзіла б залезці ў кватэру», — прызнаўся «спецыяліст чорнай справы».

— І шмат зладзеяў дапамагла злавіць сігналізацыя?

— За 8 месяцаў гэтага года была 61 спроба пранікнення на аб'екты пад аховай. 26 зладзеяў праз тры хвіліны былі затрыманыя на месцы злачынства. Нам у гэтым вельмі дапамагае радыёканальная сістэма аховы. Дзякуючы ёй, нарад, ужо выязджаючы на аб'ект, ведае, праз дзверы ці праз акно пралез злодзей. Мы, дарэчы, не зацыкліваемся на адной ахове, а выконваем шматлікія задачы, падпісаныя для ўсёй сістэмы органаў унутраных спраў. Практычна штодзень нашы супрацоўнікі раскрываюць якое-небудзь злачынства. Толькі за 8 месяцаў зрабілі больш за 91 тысячу выездаў (не толькі туды, дзе спрацавала сігналізацыя, але і на здарэнні па ўказаннях РУУС), падчас якіх раскрылі 796 злачынстваў. Вядзём барацьбу і з п'янствам. Сёлета выявілі і канфіскавалі больш за 8 тон спіртаўтрымальнай прадукцыі, якая незаконна захоўвалася.

— У сферы гандлю хапае «чорных» прадаўцоў. А ці ёсць сёння людзі, якія нелегальна спрабуюць заняцца ўсталяваннем сігналізацыі?

— У адрозненне ад той жа Расіі, дзе дастаткова шмат прыватнікаў усталёўваюць сігналізацыю, у беларускага Дэпартамента аховы няма канкурэнтаў. Тым, хто захоча займацца ахоўнай дзейнасцю, звяртаюцца да нас па ліцэнзію на права ахоўнай дзейнасці. Але тым не менш, некаторыя спрабуюць нелегальна ўсталёўваць сігналізацыю. Выяўляем, і да іх прымяняюцца сур'ёзныя штрафныя санкцыі.

— Якія перспектывы ўкаранення тэхнічных навінак у дзейнасць аховы ў горадзе Мінску?

— З гэтага года мы пачалі карыстацца навігацыйнай сістэмай. Прынцып яе дзеяння вельмі просты: навігатары ўсталёўваюцца на службовых аўтамашынах і наш дзяжурны бачыць, куды кожная з іх паехала і з якой хуткасцю рухаецца. Навігацыйная сістэма прызначана не столькі для кантролю за нясенням службы нашых супрацоўнікаў, колькі для таго, каб можна было хутчэй рэагаваць на злачынствы. Напрыклад, здарылася нешта надзвычайнае на вуліцы Бабруйскай, і дзяжурны на маніторы бачыць, якія патрульныя машыны хутчэй за ўсё дабяруцца да месца здарэння. Пакуль што сістэма навігацыі ёсць толькі ў нас, але ў будучыні нядрэнна было б забяспечыць ёю кожнае падраздзяленне міліцыі. У краінах СНД падобную тэхніку можа набыць кожны аўтаўладальнік, які хоча засцерагчы сябе ад зладзеяў. Вы можаце спытаць, а навошта мне, каб усе бачылі, куды я еду? Сутнасць у тым, што зараз вучонымі вядуцца распрацоўкі і, магчыма, у перспектыве, калі такія прыборы стануць рэалізоўвацца і ў нас, аўтаўладальнік зможа прыжаданні адключыць навігатар падчас руху. А калі пакідае машыну на стаянцы, зноў актывізаваць.

— Віктар Вацлававіч, у пачатку верасня адразу 5 сталічных аддзелаў Дэпартамента аховы МУС адзначылі 50-гадовы юбілей...

— З чым іх і віншую. Ведаеце, у кожным з гэтых аддзелаў ёсць свая адметнасць.

Заводскі раён размешчаны ў паўднёва-ўсходняй частцы сталіцы і з'яўляецца адным з найбуйнейшых раёнаў па аб'ёмах прамысловай вытворчасці, выпуску тавараў народнага спажывання, аказанні платных паслуг насельніцтву, пастаўках прадукцыі на экспарт і сканцэнтраваніе прамысловых прадпрыемстваў, асноўная галіна якіх — машынабудаўніцтва і металаапрацоўка. Сярод іх такія прамысловыя гіганты, як Мінскі аўтамабільны завод, Мінскі завод колавых цягачоў, Мінскі падшыпнікавы завод. Структурныя падраздзяленні гэтых прадпрыемстваў знаходзяцца пад аховай нарадаў Заводскага аддзела аховы.

Ленінскі раён, перш за ўсё, вызначаецца размяшчэннем — яго межы праходзяць праз Мінскую кальцавую дарогу і цэнтр горада. У раёне размешчаны два галоўныя будынкі краіны — рэзідэнцыя кіраўніка дзяржавы і выканаўчы камітэт СНД, апошні знаходзіцца пад надзейнай аховай Ленінскага аддзела аховы. Гонарам раёна з'яўляецца і галоўная найстарэйшая спартыўная арэна краіны — стадыён «Дынама», дзе «куе» свае перамогі Беларуская зборная па футболе і наш прадстаўнік у Лізе Еўропы — БАТЭ.

Кастрычніцкі раён Мінска з'яўляецца своеасаблівай візітнай карткай горада. Чыгуначныя і паветраныя вароты сталіцы — гэта не толькі гонар, але і немалая адказнасць, таму супрацоўнікі Кастрычніцкага аддзела аховы заўсёды захоўваюць імідж і шануюць традыцыі беларускай міліцыі. Сёння Кастрычніцкі раён — буйны прамысловы, транспартны, навуковы і культурны цэнтр Мінска. Значная частка аб'ектаў розных сфераў дзейнасці горада, якія знаходзяцца ў межах раёна, знаходзяцца пад аховай аддзела.

Савецкі раён называюць «залатой сярэдзінай» Мінска. На яго тэрыторыі размяшчаюцца такія найбуйнейшыя навучальныя ўстановы рэспублікі, як Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Беларускі ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, а таксама «кузня» міліцэйскіх кадраў — Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Сярод аб'ектаў, якія ахоўваюцца Савецкім аддзелам аховы, ёсць аб'екты дзяржаўнага значэння: Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку», буйныя гандлёвыя прадпрыемствы ААТ «ЦУМ «Мінск», гандлёвы цэнтр «Імпульс», Мінскі Камароўскі рынак.

Фрунзенскі раён — адзін з самых буйных. Тут і самая вялікая колькасць ахоўных аб'ектаў і кватэр у сталіцы — больш як 10 тысяч. Нарады Фрунзенскага аддзела Дэпартамента аховы таксама забяспечваюць ахову такіх буйных прадпрыемстваў, як ААТ «Мінскі завод ацяпляльнага абсталявання», завод ААТ «МАПІД», ААТ «Мінскі лакафарбавы завод».

Так што кожны з падначаленых мне са сталічных аддзелаў Дэпартамента аховы дарагі і сімпатычны па-свойму.

З ЮБІЛЕЕМ!

Гісторыя побач з намі!

Такие дни случаются нечасто!
Сегодня, папа,
праздник неземной!
Твои года — воистину, богатство,
Как много в жизни сделал ты,
родной!

Гэтыя цёплыя віншавальныя радкі адрасаваныя **Аляксею Цімафеевічу ГАРБАЧОВУ**, якому 25 верасня спаўняецца 90 гадоў. Уся дружная і шматлікая сям'я ветэрана спяшаецца павіншаваць дарагога і любімага бацьку, дзядулю і прадзядулю. Да гэтых слоў далучаецца кіраўніцтва і ўвесь асабовы склад Дэпартамента аховы, у якім Аляксей Цімафеевіч прапрацаваў больш як 20 гадоў, і жадаюць юбіляру яшчэ доўгіх гадоў жыцця, волатаўскага здароўя, невычэрпнай энергіі, бадзёрасці духу, аптымізму, душэўнага камфорту і цяпла.

Аляксей Цімафеевіч Гарбачоў нарадзіўся ў в. Калодзезкі Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. У 1932 годзе закончыў чатыры класы сельскай школы. Выхадзец з сялянскай сям'і не па чутках ведаў, што такое праца. У 1935 годзе паступіў у фабрычна-заводскае вучылішча, пасля якога стаў працаваць люстэрнікам на гомельскім шклозаводзе. З дзяцінства Аляксей вызначаўся сярод сваіх равеснікаў стараннасцю і ўседлівасцю, і гэтыя якасці непадзельна спадарожнічалі яму на працягу ўсяго яго жыцця. На прафсаюзна-камсамольскім мітынгу за праяўленую ўпартасць у працы Аляксей быў вылучаны на пасаду начальніка змены люстэркавага цэха. Гэты першы ў яго жыцці кіраўніцкі вопыт прадвызначыў далейшае прасоўванне па службовай лесвіцы. Але вайна «падкралася» так несвоечасова — 22-гадовы юнак быў прызваны ў армію, дзе праходзіў тэрміновую службу ў горадзе Варонеж. Моцны духам, мэтанакіраваны і ўпэўнены ў сабе малады чалавек з першых дзён баёў здолеў зарэкамендаваць сябе, таму менавіта ён узначаліў узвод, стаўшы камандзірам. У гэты нялёгкі час даводзілася брацца за любую работу: і авіяцыйныя заводы ад дэсанта праціўніка абараняць, і аператыўную работу выконваць.

У 1953 годзе ўжо старшы лейтэнант Гарбачоў прыехаў у Мінск, дзе яму прапанавалі стаць камандзірам дывізіёна. Праз некалькі гадоў яго перавялі ў Міністэрства ўнутраных спраў старшым інспектарам аддзела міліцэйскай службы. 20 доўгіх гадоў Аляксей Цімафеевіч прысвяціў службе ў пазаведамаснай ахове пры МУС БССР, займаючыся ваенна-мабілізацыйнай работай.

На рахунку Гарбачова дзясяткі дзяржаўных, ведамасных узнагарод і падзяк.

— Я ўвесь час меў добрую рэпутацыю, — з гонарам сказаў Аляксей Цімафеевіч. Бо, сапраўды, чалавек, які ўсё жыццё не словам, а справай даказваў сваю кампетэнтнасць, непадробны аўтарытэт і чалавечнасць, можа цалкам нясцілла заявіць аб гэтым у свае 90 гадоў. Але не толькі на працы Гарбачову не было роўных: галава ўжо шматлікага сямейства стаў узорам для ўсіх родных.

— Дзеці вельмі мною ганарацца, і па сённяшні дзень я з'яўляюся для іх аўтарытэтам ва ўсім. Дый не толькі для іх — унукі і праўнукі ставяць мяне ўсім у прыклад, а ці гэта не шчасце?

АХОЎНІКІ Ў ПОЛІ: і ўраджай, і дысцыпліна

Міністр унутраных спраў, праводзячы «дажынкі» ў падшэфнай гаспадарцы МУС, сярод лепшых з лепшых вылучыў і семярых міліцыянераў-камбайнераў Дэпартамента аховы.

На працягу некалькіх месяцаў аграрыі ў літаральным сэнсе змагаліся за ўраджай: не дасыпаючы, не пакладаючы рук, не шкадуючы сілаў і сродкаў, яны стараліся зберагчы «хлеб». Цяжкая і карпатлівая праца, безумоўна, не была марнай. І 4 верасня ў Радашковічах, дзе падшэфная гаспадарка МУС урачыста адзначала заканчэнне гарачай пары, у іх адрас прагучалі словы ўдзячнасці. СВК ім. Янкі Купалы адным з першых на Міншчыне змог пахваліцца завяршэннем уборачнай кампаніі. Нарэшце-такі для іх гэты складаны перыяд завяршыўся, а свята ўраджаю — адбылося.

Міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь А.Н. Куляшоў прыехаў у гэты дзень, каб павіншаваць вяскоўцаў і работнікаў СВК. Анатолю Нілавічу было ўдвая прыемна, што супрацоўнікі МУС не проста істотна дапамагаюць ва ўборцы ўраджаю, але і ўжо традыцыйна займаюць месцы лідараў па намалоце. Асабліва кіраўнік ведамства выдзеліў супрацоўнікаў Фрунзенскага (г. Мінска) аддзела Дэпартамента аховы — прапаршчыкаў міліцыі Сяргея Лыско і Анатоля Бохана. Іх зладжаны «экіпаж» стабільна займае прызавыя месцы — і гэты год не стаў выключэннем. Бо 749 тон — з агульнага намалоту па гаспадарцы ў 6724 тоны — належаць менавіта ім. «Мне прыемна, што вартавыя правапарадку нароўні з работнікамі СВК, плячо ў плячо, акрамя таго, што яны выконваюць свае функцыі па ахове правапарадку і абароне насельніцтва ад рознага кшталту замахаў, свядома робяць свой выбар на карысць аказання дапамогі вам, вяскоўцам, і дасягаюць такіх значных вынікаў», — падкрэсліў кіраўнік ведамства.

Старшыня СВК ім. Янкі Купалы Міхаіл Іванавіч Гамолка падзякаваў Анатолю Куляшову за садзейнічанне і выказаў вялікую ўдзячнасць усім супрацоўнікам міліцыі, якія працавалі ў гэтай гаспадарцы. Толькі з Дэпартамента аховы СВК дапамагалі сем чалавек: трое ў якасці камбайнераў, а чацвёра — на спадарожных работах.

Не застаўся ў баку і першы намеснік Маладзечанскага райвыканкама Анатоль Лісун: «Я хацеў бы, у першую чаргу, сказаць словы ўдзячнасці работнікам МУС за тую дапамогу, якая аказана падшэфнай гаспадарцы за ўвесь перыяд работы. Тут вельмі шмат зроблена за кошт сілаў і сродкаў органаў унутраных спраў: збожжавыя палі, мехмайстэрні, жывёлагадоўчая ферма. Паважаныя сябры, прыемна сёння прысутнічаць на такім свяце, калі ёсць рэальныя вынікі».

Выдатныя вынікі сёлета паказалі больш як 20 ахоўнікаў па ўсёй рэспубліцы, якія ўдзельнічалі ва ўборачнай кампаніі. Іх уклад у засекі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў склаў 12821 тону.

Нягледзячы на тое, што надвор'е ў Радашковічах не раздзяляла агульнай радасці, настрой ва ўсіх быў проста цудоўны. Уборка ўраджаю сапраўды стала агульнай справай, таму і адзначалі ўсім калектывам: усе, ад малога да вялікага, сабраліся ў гэты дзень, каб выказаць сваю павагу і ўдзячнасць працаўнікам, якія давялі пачатую справу да канца.

Самым вартым былі ўручаны ўзнагароды і каштоўныя падарункі. З рук міністра ўнутраных спраў 21 міліцыянер атрымаў ганаровыя граматы і грашовыя прэміі. У сваю чаргу, супрацоўнікаў аховы павіншавалі і начальнік дэпартамента Сяргей Буйноўскі, уручыўшы заслужаным ўзнагароды сваім перадавікам.

Нягледзячы на святочнае хваляванне, узнагароджаныя супрацоўнікі Фрунзенскага (г. Мінска) аддзела Дэпартамента аховы вырашылі падзяліцца сваімі ўражаннямі:

— Было вельмі прыемна атрымаць узнагароду з рук міністра ўнутраных спраў, — сказаў Сяргей Лыско. — Ураджай сёлета быў вельмі добры, таму і вынікі гавораць самі за сябе. Я ўжо трэці сезон працую камбайнерам, і гэта праца мне вельмі падабаецца. Самае галоўнае, што мая сям'я мяне падтрымлівае ва ўсім. Зразумела, дзеці сумуюць, але камусьці ж трэба хлеб збіраць.

Анатоль Бохан быў пад вялізным уражаннем ад таго, што адбывалася:

— Настрой сёння вельмі святочны і, безумоўна, прыемна, што нашы кіраўнікі прыехалі павіншаваць нас. Таксама не можа не радаваць тое, што ў гэтай нялёгкай справе Дэпартамент аховы прымаў непасрэдны ўдзел — мы заўсёды былі забяспечаныя ўсім неабходным.

А напрыканцы Анатоль Бохан з гонарам заявіў: «Самае галоўнае — жыць! А ў жыцці — заўсёды знаходзіць толькі станоўчыя моманты».

Святочная атмасфера панавала ў Радашковічах да самага вечара. Вяскоўцы атрымалі задавальненне ад выступлення артыстаў беларускай эстрады, дзеці з радасцю ўдзельнічалі ў конкурсах, якія праводзіла ДАІ, і атрымалі за іх каштоўныя падарункі. А ў паветры ўсё лунаў прыемны водар свежага хлеба, спечанага з толькі што сабранага ўраджаю, і кожны прысутны мог пакаштаваць духмяны каравай.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі Аляксандр ГЕРАСІМАЎ, Алена ЯРМОЛІНСКАЯ, Юлія АКСЮЧЫЦ, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Надзея ДРЫЛА.

Еўраваяж: пастскрыптум

6500 КІЛАМЕТРАЎ ПА ЕЎРОПЕ

Сотні еўрапейцаў казалі нам: «Хочам у Беларусь!»

За два тыдні карэспандэнты «Звязды» Глеб ЛАБАДЗЕНКА і Яўген ВАЛОШЫН у час адпачынку за свой кошт праехаліся па Еўропе, наведалі Чэхію, Францыю, Італію, праездам — Польшчу, Нямеччыну, Аўстрыю. І калі рэпартажы з колаў яны пісалі разам, то цяпер, у Мінску, кожны падсумоўвае менавіта свае ўражанні

Пабачыўшы Чэхію, Францыю і Італію, я раз за разам вяртаюся да думкі, чаму гістарычна еўрапейская Беларусь выбіваецца з шэрагу гэтых краін.

Той жа Парыж па складзе свайго насельніцтва ўсё менш і менш нагадвае Еўропу. Цемнаскурыя ўраджэнцы Афрыкі, перасяленцы з арабскіх краін, азіяты быццам выціскаюць адтуль звычайных французаў. Але ўсе гэтыя перасяленцы ведаюць галоўнае правіла: «прыехаў жыць у Парыж — размаўляй па-французску».

У Італіі, дзе эмігрантам не далі такой свабоды, да тваёй выключна англійскай мовы таксама ставяцца, як да мовы марсіяніна.

— Не здзіўляйся, тыя ж рымляне лічаць, што жывуць у культавым горадзе, і, хутчэй, турысты павінны падладжвацца пад іх італійскую мову, чым яны пад турыстаў, — растлумачыў афіцыянт літоўскага паходжання з рымскага паба Ёнас. — Па-англійску цябе тут многія не зразумеюць. А калі будзеш смяяцца з італьянскай мовы — атрымаеш кулю ў лоб.

Ветлівыя жыхары Прагі таксама ўпэўненыя, што іх горад ці не самы прыгожы ў свеце. І мяккая, як песенька, чэшская мова гучыць тут паўсюдна. Хоць і гэтаму народу стагоддзямі насаджалася нямецкае слова.

І толькі адныя беларусы з усіх цывілізаваных еўрапейскіх народаў пераўтварылі сваю нацыянальную мову, адну з самых прыгожых у свеце, у другасную. Замест гэтага мы размаўляем па-руску, сікаснакась, з памылкамі і крывым акцэнтам.

Чуткі пра заможнасць заходніх еўрапейцаў, як кажуць, пацвердзіліся. І хоць у Францыі і Італіі кошты высокія хоць на сценку караскайся, любы ашаўрак можа зарабіць свае дзве тысячы еўра ў месяц і жыць прыпяваючы. А таксама атрымаць добры крэдыт на жыллё пад мізэрны працэнт.

Як расказаў наш цемнаскуры прыяцель па курорце ў Кастэльфузана Прынц Іман, і дробны бізнэс можна наладзіць бесперашкодна.

— Хочаш — стаў латок з шаўрмой, хочаш — прадавай гліняныя калізеі і майкі з надпісам «Італія». І будзеш мець добрыя грошы на ўтрыманне сям'і, — тлумачыў Прынц Іман. — Праблемы пачынаюцца, калі ты займаешся сур'ёзным бізнэсам і сутыкаешся з мафіяй. Тут гэта вялікая праблема.

У Беларусі ж ідэі лібералізаваць заканадаўства для прыватных прадпрымальнікаў пачалі выказвацца не так даўно. А да гэтага «прыватнікам» даводзілася весці барацьбу за выжыванне. Шалёныя падаткі, бясконцыя праверкі, малы прыбытак... Многія пакінулі бізнэс. Цяжка ўявіць, якія дадатковыя грошы мог бы атрымаць наш дзяржаўны бюджэт. І дай Божа, каб чыноўнікі ў будучыні адкрылі свабодныя дарогі бізнэсу сярэдняй рукі.

Не схлушу, калі напішу пра прыгажосць Чэхіі, Італіі і Францыі. І нацешылася ж маё вока разнастайнасцю! Чэшскія дамкі, напрыклад, як крэмавыя торцікі, ладненькія і дагледжаныя. Пытаюся ў мясцовых жыхароў, колькі ім гадоў, адказваюць — 700, 500, 300.

Прага, Рым і Парыж зарабляюць на турыстах фантастычныя грошы. А ці магчыма такое ў Беларусі? Тут большасць гістарычных помнікаў зруйнавалі дзеячы Расійскай імперыі, а потым камуністы. Што казаць, калі нават летась у самым цэнтры Мінска знішчылі гістарычны помнік XIX стагоддзя па Рэвалюцыйнай, 17. І зладзеі не былі пакараныя.

Тым не менш «сляды старажытнасці» і сёння захаваліся па ўсёй Беларусі. З перыферыйным поспехам, але праводзяцца рэстаўрацыі. Многія помнікі архітэктуры прасякнуты міфамі і таямніцамі, што так вабіць турыстаў. Да таго ж хапае ў Беларусі і іншых «фішак»: танная стаматалогія, аграсядзібы, дзе можна адчуць сябе старажытным селянінам. Вядома, маем не самыя горшыя дарогі, сапраўдны снег узімку, чысціню, адносны парадак, цэнтр Еўропы і многае іншае. Пра ўсё гэта мы з карэспандэнтам Лабадзенкам распавядалі сотням замежнікаў, якіх сустракалі. Маўчалі толькі пра прыгажосць нашых жанчын, няхай застануцца беларусам.

— Мама мія! — раскрывалі раты многія з замежнікаў пасля нашых лекцый. — Пакіньце свае візітоўкі і чакайце ў госці. Пра такое мы яшчэ нідзе не чулі!

Якіх бы еўрапейцаў мы ні сустракалі на шляху, з усімі маглі паразумецца.

Згубіўшыся а трэцяй ночы ў французскай вёсцы Рабінзон, што пад Парыжам, натыкнуліся на ірландцаў Джэры і Салі — такіх жа бедакоў, як самі. Ірландцы спяшаліся ў свой гатэль, ды пераблыталі цягнікі. Слова за слова — і кантакт усталяваны. Быццам Джэры і Салі — гэта нашы суседзі па лесвічнай пляцоўцы дзядзька Віця і цётка Воля. Аб'яднаўшы свае магчымасці, цудам знаходзім аўто, якое па чарзе завозіць кожнага, куды патрэбна. І развітваемся, як сапраўдныя землякі.

Вярнуўшыся дамоў, раз за разам раблю высновы, што Беларусь можа чакаць вялікая будучыня. І ці не наш рэгіён калі-небудзь будуць успрымаць як сапраўдную Еўропу.

Наш народ — невялікі па колькасці, але са слаўнай гісторыяй. Беларусаў не павінна рабіцца менш. Таму заканчваю пісаць пра свае ўражанні і іду ў лес на спартовую прабежку. Беларускія дзеткі павінны быць здаровымі. І чым больш іх будзе — тым лепш.

Яўген ВАЛОШЫН.

Еўропа — гэта я!

Я ішоў па сваёй вуліцы Бельскага ў Мінску, цягнуў за сабой валізу на колцах, другую нёс у руках. Чамусьці ўпарта згадваўся верш шаноўнага Генадзя Бураўкіна:

Я не ганю землі чужыя,
Хай іх сонца не абміне,
Толькі дзе б за морам ні жыў я,
Беларусь мая снілася мне...

Цяжка ўпарадкаваць паездку ў галаве, казаць — там лепш, а там горш.

Як любіць казаць мой калега Валошын, паўсюль ёсць свае касякі. У французскім рэпартажы мы апісалі прыкры выпадак, як ехалі ў аэрапорт, а заехалі ў нейкія мясцовыя Цыцкавічы. Тры гадзіны ночы, пустое мястэчка, куды не хоча ехаць нават таксі. У каментарах на маім сайце (www.labadzenka.by) нехта правільна зазначыў: калі б у нас на цягніку было напісана адное, а заехаў ён у іншае месца, сказалі б — «савок». Аднак які ж «савок» у Францыі, якой савецкія парадкі не сніліся нават у страшным сне?..

У той жа час мне запомнілася такая сабе драбяза, замалёўка з рымскай электрычкі. Я ехаў да канцавой — а гэта паўгадзіны — і дарогаю кімарыў. Насупраць мяне таксама кімарыла італьянка сярэдніх гадоў. Яна прачнулася роўна перад сваёй станцыяй (а мне яшчэ дзве ці тры ехаць) і акуратна пабудзіла мяне: вам часам не тут выходзіць? Я ўсміхнуўся ёй, падзякаваў і сказаў, што еду да «Каломба». У нас — не факт, што пабудзіў бы нехта (хіба на канцавой). А многія падумалі б: «напіўся і спіць».

Згадваецца іншы выпадак. У Пінску праходзілі беларуска-шведскія літаратурныя чытанні. Мы разам са шведамі выйшлі зранку з гатэля і пабачылі, што цераз дарогу сядзіць на кукішках чалавек і ўвесь трасецца. «П'яны», — падумалі сабе беларусы. І толькі шведская пісьменніца падышла да небаракі, у якога, як высветлілася, быў прыступ эпілепсіі.

Вы спытаецеся, дзе ў гэтай вялікай вандроўцы мне спадабалася больш? Напэўна, у Рыме. Гэта сапраўды Вечны Горад, дзе хочацца быць. Парыж, які вы ўяўляеце — гэта збольшага міф. Гэта, як і Мінск, горад, хутчэй, для працы, чым для адпачынку. Парыж аднастайны, аднолькавы. Гэта разумееш, калі падымаешся на Эйфелеву вежу. Ты бачыш Нотр Дам, бачыш Сакрэ Кёр, бачыш Дом Інвалідаў, Луўр... А астатні горад — белыя дамы на шэсць паверхаў з мансардамі. Так, яны значна прыгажэйшыя за шэрыя савецкія «каробкі» ў Мінску. Але воку спыніцца таксама няма на чым. Падобнае сумнае ўражанне робіць мой родны горад, калі глядзіш на яго з даху Нацыянальнай бібліятэкі. Зачароўвае выключна вышыня.

Рым розны. Тут таксама ёсць ключавыя аб'екты — Калізей, Рымскі Форум, Пантэон, Санта Марыя Маджорэ, Іль-Джэзу... Аднак, паглядзеўшы з іх, адсюль не хочацца з'язджаць. Хочацца проста хадзіць па гэтым горадзе. Зазіраць у вітрыны крамаў, адказваць усмешкаю на ўсмешку, фатаграфаваць мілыя дамочкі, запамінаць назвы мастоў, піць віно на беразе Тыбру. У Рыме вельмі ўтульна, людзі ўсміхаюцца і хочуць дапамагчы табе, хоць ні чорта не разумеюць па-англійску. Пры гэтым за тыдзень у Рыме ты не сутыкнешся са значнымі цяжкасцямі ў камунікацыі — не ўсяе бяды нарабіў Вавілон, ёсць мова жэстаў і позіркаў.

Вандруючы па Еўропе, табе не сорамна за Бацькаўшчыну. Табе ўтульна і тут, і там. Тут гэткія ж дарогі, як і ў нас, гэткія ж хлеб і каўбаса ў краме, гэткія ж аўтобусы і метро. Беларусі не трэба вяртацца ў Еўропу, бо Беларусь ніколі адтуль не сыходзіла. Трэба толькі адмыцца крыху ад той «азіятчыны», якой палівалі нас вядомыя 70 гадоў. І гэта міф, што Еўропа загнівае, а ў нас — выспачка стабільнасці. На многіх пунктах Беларусь жыве сёння нароўні з Еўропай. І там ёсць недахопы, і тут. І там хапае добрага, і ў нас. Розніца адчуваецца ў дэталях: крэдыт на кватэру ў Чэхіі даюць пад 4,5 %, а ў нас — пад 20 %...

Ці захацелася мне застацца ў нейкім з наведаных гарадоў? Не. Жыць трэба дома. Але пры гэтым імкнуцца наведаць Рым, Парыж і Прагу. Каб паглядзець, як людзі жывуць — і параўнаць. У кожнай краіне я бяру нешта для сябе, санатоўваю і інсталюю ў сваё жыццё. Напрыклад, стаў круглы год ездзіць на машыне з бліжнім святлом фараў. У Еўропе так прынята. І няважна, што ў нас пакуль няма такой афіцыйнай нормы.

Аднойчы Сальвадор Далі сціпла сказаў: «Сюррэалізм — гэта я!» Я хачу сціпла перайначыць творцу: Еўропа — гэта я!

І ты — з Полацка. І ты — са Слуцка. І ты — з Віцебска...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

Мінск—Прага—Парыж—Рым—Прага—Мінск.

Вакол Белавежскай пушчы створаць інвестыцыйнае «кальцо»

З кастрычніка на царскай паляне будзе адзначацца 600-годдзе ўвядзення запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы. Чакаецца, што ў мерапрыемстве возьмуць удзел некалькі тысяч чалавек з розных краін свету.

Як паведаміў дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр Каваленя, каб дакладна вызначыць дату ўвядзення запаведнасці, папярэдне праводзілася вялікая работа не толькі ў беларускіх архівах, але і ў Санкт-Пецярбургу, Львове, Маскве, Варшаве. Паводле меркавання спецыялістаў, доўгі час у гісторыі гэтых адметных мясцінаў заставаўся шэраг «белых плям». Таму навукоўцы ўвесь час знаходзяць невядомыя дагэтуль факты. На тэрыторыі пушчы пастаянна праводзяцца ўнікальныя археалагічныя раскопкі. Дарэчы, падчас такіх даследаванняў удалося вызначыць, што чалавек пачаў засяленне гэтай тэрыторыі больш чым 10 тысяч гадоў таму.

Здавалася б, пушча — адзін з найбольш даследаваных краёў Беларусі, а дасюль тут знаходзяць невядомыя віды флоры — грыбы, мікраарганізмы і г.д. Самы стары лес Еўропы па ўнікальнасці параўноўваюць з сельвай Амазонкі і трапічнымі лясамі Мадагаскара. Нездарма, як адзначыў намеснік міністра інфармацыі Аляксандр Слабадчук, Белавежская пушча заняла чацвёртае месца ў інтэрнэт-галасаванні па вызначэнні сучасных «цудаў свету» (усяго было 70 намінантаў з розных дзяржаў).

На думку генеральнага дырэктара Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» Мікалая Бамбізы, пытанне захавання прыродных комплексаў сярод найбольш актуальных як у Еўропе, так і ва ўсім свеце. І беларускі вопыт адзначаецца міжнароднымі экспертамі вельмі высока. У прыватнасці, напрацоўкі айчынных спецыялістаў узятыя на ўзбраенне польскімі калегамі — па развіцці іх часткі пушчы. Раней у Польшчы нацыянальным паркам з'яўлялася толькі частка рэліктавага лесу, а цяпер па рэкамендацыі Савета Еўропы гэтая тэрыторыя будзе значна павялічана.

Як паведаміла начальнік спецінспекцыі дзяржкантролю за выкарыстаннем і аховай жывёльнага свету, вядзеннем паляўнічай гаспадаркі і станам запаведнай справы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталля Мінчанка, з польскімі калегамі падпісана пагадненне аб усебаковым супрацоўніцтве. Таксама падрыхтаваны дакумент аб трансмежным узаемадзеянні. Пытанні супрацоўніцтва, магчыма, будуць абмеркаваны падчас святкавання 600-годдзя ўвядзення запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы, куды запрасілі міністраў прыродных рэсурсаў шэрагу краін.

Дарэчы, на падрыхтоўку да ўрачыстага мерапрыемства толькі з фонду аховы прыроды выдаткавана больш чым 5 мільярдаў рублёў. А ўсяго ў гэтым былі задзейнічаны 30 міністэрстваў. Як адзначыў намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Раманоўскі, уведзены ў эксплуатацыю шэраг новых аб'ектаў. У прыватнасці, наведвальнікаў будзе прымаць новы музей прыроды. Па меркаванні спецыялістаў, гэта адна з лепшых устаноў такой накіраванасці ў Еўропе. Плошча музея ўдвая большая за тую, што была раней.

Уведзена ў эксплуатацыю новая гасцініца. Цяпер адначасова на тэрыторыі пушчы могуць пражываць 250 чалавек. Поўнасцю рэканструяваны і рэстаранны комплекс. Праведзена сур'ёзная рэканструкцыя дэманстрацыйных вальераў. Для супрацоўнікаў нацпарка пабудавана 35 камфартабельных дамоў. Як заўважыў Аляксандр Раманоўскі, пераўтварыўся і пасёлак Камянюкі — тут адрамантаваны шэраг будынкаў, праведзена грунтоўнае добраўпарадкаванне, рэканструяваны і пабудаваны дарогі, заменены каналізацыйныя, водаправодныя і цеплавыя сеткі.

За мінулы год Белавежскую пушчу наведалі больш чым 280 тысяч чалавек. Гэта ўдвая перавышае колькасць турыстаў, якія прыязджалі сюды яшчэ некалькі гадоў таму. У нацпарку створаны сучасныя ўмовы для прыёму гасцей. Як адзначыла намеснік міністра адукацыі Таццяна Кавалёва, такія пазітыўныя змяненні дазваляюць пашырыць магчымасці ў плане экалагічнай адукацыі. Некалькі дзён таму тут праводзіўся фінал рэспубліканскага конкурсу «Прырода Белавежскай пушчы вачамі дзяцей». З 2,7 тысячы работ, што былі прадэманстраваныя, адабралі 102 лепшыя.

У наступную суботу на царскай паляне адбудзецца вялікая культурная праграма. Як паведаміў намеснік міністра культуры Віктар Кураш, пройдуць тры канцэрты, удзел у якіх возьмуць артысты з Расіі, Польшчы і Літвы. На мерапрыемства завітаюць Аляксандра Пахмутава і Мікалай Дабранравай — аўтары легендарнай песні «Белавежская пушча». Адметна, што выступленні артыстаў пройдуць не толькі ў Камянецкім, але і ў бліжэйшых раёнах.

У перспектыве плануецца пабудаваць на тэрыторыі нацпарка этнаграфічную вёску. Для гэтага паселішча ўжо цяпер ёсць шэраг экспанатаў — напрыклад, курная хата XVI стагоддзя. Мяркуецца, што наведвальнікаў гэтай вёскі будуць частаваць старадаўнімі стравамі. Напэўна, такі аб'ект будзе карыстацца папулярнасцю і прыцягне дадатковую колькасць турыстаў. Белавежская пушча выклікае зацікаўленасць і інвестараў. Ім дадуць магчымасць разгарнуцца, але толькі не на тэрыторыі нацпарка. Як паведаміў Мікалай Бамбіза, вакол Белавежскай пушчы плануецца стварыць інвестыцыйнае «кальцо», дзе будзе развівацца сфера для арганізацыі адпачынку — гасцініцы, рэстараны, кавярні, кемпінгі і г.д. Ужо прапрацоўваюцца варыянты для магчымых укладанняў. Спецыялісты перакананыя: такая прапанова абавязкова будзе запатрабаваная сярод інвестараў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Падзеі

ГРАНДЫЁЗНАЕ ЛЯДОВАЕ ШОУ ЧАКАЕ МІНЧАН

АЛЕНА ЧАЙКОЎСКАЯ, АЛЕКСЕЙ МІШЫН І АРТУР ДЗМІТРЫЕЎ ПРЫВЕЗЛІ Ў БЕЛАРУСКУЮ СТАЛІЦУ СВАІХ ВЫХАВАНЦАЎ

Беларуская сталіца ўпершыню з 23 па 27 верасня прымае этап Гран-пры па фігурным катанні «Мінскі лёд» сярод юніёраў. 117 удзельнікаў з 30 краін ужо пацвердзілі свой удзел і пачалі з'язджацца ў Мінск. Спаборніцтвы пройдуць на дзвюх лядовых пляцоўках сталічнага Палаца спорту. Сваіх выхаванцаў прывязуць самыя знакамітыя трэнеры ў свеце, сярод іх расіяне Алена Чайкоўская, Аляксей Мішын, Артур Дзмітрыеў. Урачыстае адкрыццё спаборніцтваў адбудзецца 24 верасня ў 19 гадзін. На 26 верасня, дзень закрыцця, запланаваны вялікі гала-канцэрт з паказальнымі выступленнямі пераможцаў, які пачнецца а 21 гадзіне. Уваход на спаборніцтвы для гледачоў бясплатны, на гала-канцэрт білеты каштуюць ад 5 да 15 тысяч рублёў. Фігурысты з Расіі, Японіі, ЗША паспрачаюцца за прызы мінскага этапу Гран-пры.

Як адзначыў памочнік старшыні «Прэзідэнцкага спартыўнага клуба» Аляксандр Храмылёў, Беларускі саюз канькабежцаў рухаецца па шляху «Беларускай федэрацыі хакея»: ад юніёрскіх турніраў да міжнародных топ-турніраў. «У фігурным катанні надзвычай важна з юнацкага ўзросту быць навідавоку, дэманстраваць сябе перад суддзямі, балельшчыкамі», — падкрэсліў Аляксандр Храмылёў і адзначыў, што турнір надзвычай важны не толькі для беларускіх спартсменаў, якія на правах гаспадароў будуць заяўленыя ў максімальнай колькасці ва ўсіх дысцыплінах, але і для краіны. І паводле слоў як беларускіх спецыялістаў, так і прадстаўнікоў Міжнароднага саюза канькабежцаў, у Беларусі ёсць усе шанцы атрымаць спаборніцтвы самага высокага міжнароднага ўзроўню.

Прыехаў у Беларусь і прадстаўнік Міжнароднага саюза канькабежцаў Аляксандр Коган, які выдатна ацаніў умовы для турніру і падкрэсліў, што Беларусі права праводзіць этап Гран-пры даецца другі раз запар (летась спаборніцтвы прымаў Гомель). І гэты факт пацвярджае бездакорнасць падрыхтоўкі нашай краіны да міжнародных турніраў.

Аляксандр Коган выказаў упэўненасць у тым, што Мінск настолькі спартыўны горад, што спаборніцтвы пройдуць пры поўным аншлагу.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ДЫНАМА-СНАЙПЕРЫ

З нагоды

У найбліжэйшую суботу беларускаму біятлону спаўняецца 50 гадоў. Напярэдадні юбілею ў БФСГ «Дынама» раздавалі заслужаныя ўзнагароды сваім найлепшым прадстаўнікам гэтага віду спорту і расказвалі аб будучых перамогах.

Беларускія «снайперы на лыжах» прывычылі нас, што яны заўсёды змагаюцца за найвышэйшыя ўзнагароды. «Пазаўчора» — Віктар Сямёнаў і Аляксандр Папоў, «учора» — Святлана Парамыгіна, Вадзім Сашурын, Алег Рыжанкоў, Уладзімір Драчоў, Алена Зубрылава і Аляксей Айдараў, «сёння» — Дар'я Домрачава і Вольга Назарава. Гэты спіс можна яшчэ доўга працягваць і дапаўняць. Нават не верыцца, што распачалося ўсё толькі ў канцы пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя.

Немалую ролю ў станаўленні беларускага біятлону адыграла «Дынама». За ўвесь час тут займалася больш за 2,5 тысячы спартсменаў. І зараз абсалютная большасць прадстаўнікоў нацыянальнай зборнай — дынамаўцы. Напэўна, зусім дзіўна будзе пачуць пра біятланістаў наступнае: маёр Рыжанкоў, капітан Назарава ці старшы лейтэнант Сыман? А яно насамрэч так. Усе яны, а таксама іншыя «зборнікі», носяць гэтыя высокія званні.

Сустрэча з журналістамі прайшла 22 верасня ва ўтульнай канферэнц-зале на Кірава, 8. Ва ўступным слове **старшыня БФСГ «Дынама» генерал-маёр Юрый БАРОДЗІЧ** адзначыў, які вялікі ўнёсак у развіццё беларускага спорту, асабліва біятлону, належыць «Дынама». Добрым словам былі ўзгаданыя нашы шматлікія пераможцы. А прысутным на мерапрыемстве Алене Зубрылавай і Алегу Рыжанкову былі ўручаны памятныя знакі «За заслугі перад «Дынама».

Чатырохразовая чэмпіёнка свету, трохразовая чэмпіёнка Еўропы Алена ЗУБРЫЛАВА: *«Менавіта праз «Дынама» я прыйшла ў вялікі спорт. Спачатку прайшла школу органаў дзяржаўнай бяспекі ва Украіне, потым тут, у Беларусі. Каб дасягнуць вяршыняў, трэба заўсёды ставіць перад сабою найвышэйшыя мэты. Гэтага і хацелася б пажадаць нашым маладым спартсменам. А кім я сябе зараз лічу: беларускай ці ўкраінкай? Цяжкае пытанне. Напэўна, адкажу па-іншаму: я славянка».*

Трохразовы чэмпіён свету, двухразовы чэмпіён Еўропы Алег РЫЖАНКОЎ: *«Сённяшняя ўзнагарода вельмі прыемная, але вось калі казаць пра самую памятную, то гэта апошняя — бронзавы медаль чэмпіянату свету-2003 у Ханты-Мансійску. Як трэнер магу сказаць, што будучыня ў нашага біятлона ёсць. Так, некалькі гадоў таму быў правал. Мы страцілі некалькі пакаленняў таленавітых спартсменаў. Чаму так здарылася? Магчыма, не хапала трошкі фінансавання, магчыма, нам, старэйшым, трэба было раней сыходзіць, даваць дарогу маладым. Магчыма, штосьці іншае. Зараз дакладна не скажаш. Галоўнае, што сітуацыя змянілася. Фінансаванне палепшылася, пры нацыянальнай зборнай створана каманда-Б, якую я трэнірую. І магу сказаць, што ў нас ёсць таленавітыя маладыя біятланісты. Праўда, абыдземся зараз без імёнаў. Не хачу, каб у некаторых «закружылася» галава».*

Яўген ВАРАКСА.

Барыс Маісееў адчыніць у Магілёве школу балета?

На слыху

Пакуль гэта сапраўды пытанне. Аднак прадстаўнікі знакамітага шоумэна звяртаюцца да ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама з просьбай перадаць Барысу Маісееву Дом культуры завода штучнага валакна, які сёння стаіць закінуты і выстаўлены на продаж.

Гэты вялікі будынак месціцца ў абласным цэнтры на вуліцы Чалюскінцаў. Сёння ён належыць ужо не заводу штучнага валакна, а гарадской уладзе.

Дом культуры атрымаў вядомасць, калі сюды пераязджалі гурткі і творчыя калектывы з гарадскога цэнтра культуры — гістарычнага будынка ў цэнтры Магілёва. Ужо за тым часам ДК ШВВ не быў прыцягальным для гараджан: састарэлае збудаванне патрабавала капітальнага рамонту ў 2 мільярды рублёў.

Некалькі гадоў таму і магілёўская культура пакінула ДК: апошні час там захоўваліся сцэнічныя строі і дэкарацыі. Сёння будынак мае сапраўды варты жалю выгляд. Уваход і вялізныя калоны ачэпленыя стужкамі з чырвонымі сцяжкамі. Усюды надпісы: «Асцярожна, падае тынкоўка!» Аблятае і лупіцца ўсё, нават агароджа з цаглянымі слупамі.

Цяпер будынак у аварыйным стане выстаўлены на аўкцыён. Пачатковы кошт нерухомасці — каля 2,4 мільярда рублёў, плюс арэнда на 50 гадоў зямельнага ўчастка — больш за 600 мільёнаў. У выніку — 3 мільярды рублёў, умова — праз тры гады адчыніць культурна-забаўляльны цэнтр, але пакупнікоў няма.

Аднак цяпер з'явіўся калі не пакупнік, дык ахвотнік. Вядома, што Барыс Маісееў — ураджэнец Магілёва, і час ад часу ён прыязджае на радзіму: наведаць магілу маці і сустрэцца са старымі сябрамі. Для яго ДК Куйбышава — родны будынак, бо менавіта ў ім заслужаны артыст Расіі ўпершыню ў жыцці стаў танцаваць. Кажуць, што ў Маісеева адразу ўзнікла ідэя стварыць у Магілёве Палац мастацтваў, і адчыніць там балетную школу. На гэты момант дакументы, нават аб намерах, яшчэ не падпісаныя. Аднак перамовы, хоць бы і па тэлефонных лініях, паміж прадстаўнікамі Барыса Маісеева і магілёўскай улады ўсё ж вядуцца.

Ілона ІВАНОВА.

Крымінал

ТЫ ЛЯЦІ, ЧЫРВОНЫ КОНЬ...

Не да песень зараз уладальніку шасцігадовага каня светла-чырвонай масці з вёскі Сяўкі Лоеўскага раёна, якога зламыснікі выкралі ноччу прама з пашы.

У міліцыю звярнуліся і сваякі памерлага, калі не знайшлі на магіле ўсталяваны мармуровы кветнік. Непрыемнае здарэнне адбылося на могілках «Паўднёвыя-2» у вёсцы Цагельня пад Гомелем.

А яшчэ аднаму не знойдзенаму злодзею, паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама, спатрэбіліся для невядомых мэтаў тры сцягі, што віселі ля будынка Дома культуры энергетыкаў па вуліцы Леніна ў Светлагорску.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

З СЯКЕРАЙ НА ВУЛІЦУ

У Брэсцкую абласную бальніцу даставілі п'янага чалавека з чэрапна-мазгавой траўмай і сечанай раной перадплечча. 34-гадовы мужчына растлумачыў, што на вул. Маскоўскай на яго напаў з кухоннай сякерай беспрацоўны жыхар Брэста і забраў грошы ды мабільны тэлефон. Злачынцу шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» ИНФОРМИРУЕТ:

В извещении о проведении 2 октября 2009 года открытого аукциона № 04-А-09 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске (газета «Звязда» от 29.08.2009 № 162 газета «Вечерний Минск» от 01.09.2009 № 163) позицию:

2	р-он ул. Кабушкина – ул. Машиностроителей	500000000002007061	0,1223	Автомоечный комплекс на 1 пост	29 832 860	2 684 960	2 357 183	Участок занят гостевой автостоянкой для клиентов ОАО «Минскжелезобетон»	—

ИСКЛЮЧИТЬ.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЛИДСЕЛЬМАШ»

28 сентября 2009 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70
(собрание проводится в заочной форме).

Повестка дня собрания:
1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Лидсельмаш».
2. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.

Наблюдательный совет ОАО «Лидсельмаш». УНП 500021638

ОАО «БЕЛТОРГСТРОЙ»

СООБЩАЕТ, ЧТО 9 ОКТЯБРЯ 2009 ГОДА В 14.00 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ПО АДРЕСУ: Г. МИНСК, УЛ. В. ХОРУЖЕЙ, 31. РЕГИСТРАЦИЯ — С 13.00. ПРИ СЕБЕ ИМЕТЬ ПАСПОРТ.

Повестка дня:
1. Отчет Ревизионной комиссии.
2. О внесении изменений в Устав ОАО «Белторгстрой».
3. О реализации основных средств ликвидируемого филиала СМУ-5 «Новополоцкторгстрой».

УНН 100633428

ВНИМАНИЮ ВЛАДЕЛЬЦЕВ АКЦИЙ ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД ОТОПИТЕЛЬНОГО ОБОРУДОВАНИЯ»

Акционерное общество информирует владельцев акций Общества о том, что выплата дивидендов за 2008 год началась с 20 сентября 2009 года во Фрунзенском отделении ОАО «БПС-Банка» по адресам:

220073, г. Минск, ул. Тимирязева, 29, РКЦ (т. 204 30 69)
220073, г. Минск, ул. Гусовского, 6 (т. 252 45 27)
220015, г. Минск, ул. Я. Мавра, 47 (т. 252 39 49).

Справки по телефону 203 28 38.

УНП 100008064 **Наблюдательный совет.**

СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩЕМ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность			**Республиканское унитарное производственное предприятие «Чаусский льнозавод», (РУПП «Чаусский льнозавод»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь**	**Производственное республиканское унитарное предприятие «Могилевский завод сборного железобетона № 7», (ПРУП «Могилевский завод сборного железобетона № 7»), Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь**
Адрес			213206, Могилевская область, г. Чаусы, ул. Производственная, 1	212030, г. Могилев, Славгородское шоссе, 165
Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции			Льноводство	Производство сборных железобетонных и бетонных конструкций и изделий
Положение на рынке			Не занимает доминирующего положения	Не занимает доминирующего положения
Планируемые сроки разгосударствления и приватизации			4 квартал 2009 г.	3 квартал 2009 г.
Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации			Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества
Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение			Могилевский областной территориальный фонд государственного имущества, 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62	Могилевский областной территориальный фонд государственного имущества, 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62
Численность работающих, чел.			97	296
Срок предъявлений претензий			Месяц со дня опубликования	Месяц со дня опубликования
Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб.			21 029 998 000	18 222 129 550
Стоимость основных фондов – всего, руб.			22 239 402 930	21 193 189 432
Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га			25,0104	17,6617
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб.			нет	50 665 969
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб.			нет	нет
Финансовое состояние объекта, руб.	**Балансовая прибыль**		37 589 187	332 751 492
	Задолженность	**кредиторская**	1 446 043 524	3 604 066 424
		дебиторская	198 028 000	487 940 299

УНП 100745627.

Лечымся без лекаў

Чыстацел — для чыстай скуры!

Чыстацел — шматгадовая травяністая расліна, адносіцца да сямейства макавых. З аднаго боку, чыстацел лічаць ядавітым, з іншага — прызнаюць за ім бясспрэчныя лекавыя ўласцівасці. Нават сваю назву гэта расліна атрымала таму, што нашы продкі заўважылі: чыстацел цудоўна спраўляецца з рознымі захворваннямі скуры, ачышчаючы яе ад мазалёў, бародавак, рабаціння...

Лекавымі ўласцівасцямі валодае наземная частка чыстацелу — яго трава і кветкі, а таксама сок. Апошні з даўніх часоў выкарыстоўвалі пры лячэнні мастыту і хваробаў насаглоткі, захворванняў печані і жоўцевага пузыра, і нават пачатковых формаў туберкулёзу скуры, а таксама змазвалі ім трэшчыны на руках і на пятках. Трава і кветкі чыстацелу, свежыя і высушаныя, таксама не менш карысныя.

Тут неабходна адзначыць, што ўнутраны прыём соку або любых прэпаратаў з сыравіны чыстацелу дазваляецца толькі па прызначэнні ўрача! Што датычыцца вонкавага прымянення гэтай расліны, то гэта можна рабіць і ў хатніх умовах, аднак абавязкова захоўваць асцярожнасць.

Настоем са свежай або сухой травы чыстацелу рэкамендуецца абмываць бародаўкі, фурункулы, лішаі і экзэмы, аж да поўнага іх знікнення. Таксама можна вылечыцца і ад вугрыстага сыпу. А ванны з настоем чыстацелу і ўмыванне ім (варта рабіць гэта асцярожна, разбаўляючы настой вадой на дзве трэці і пазбягаючы яго пападання ў вочы, нос і рот) могуць пазбавіць, хоць і часткова, ад рабаціння і пігментных плямаў.

Гатаваць настой з чыстацелу проста: бярэцца шкляная ёмістасць, прыкладна на паўлітра, на чвэрць запаўняецца сухой сыравінай і заліваецца кіпенем. Пасля чаго пасудзіну неабходна шчыльна закрыць і пачакаць каля гадзіны. Атрыманы настой перад выкарыстаннем працадзіць; захоўваць яго лепш за ўсё ў халаднаватым, зацемненым месцы.

Памятайце, што чыстацел супрацьпаказаны пры эпілепсіі, бранхіяльнай астме, неўралагічных захворваннях, стэнакардыі, дыярэі. Таксама не варта выкарыстоўваць яго і цяжарным жанчынам.

Тайны прыручаных грыбоў

У хатніх умовах можна атрымліваць не толькі пажыўныя напоі, але і лячыцца імі ад многіх хвароб аў. Тут і там чуваць, што ў аднаго дома «жыве» чайны грыб, другі дзеліцца кефірным, а трэці адкрыў для сябе лекавыя ўласцівасці марскога рысу. Што ж уяўляюць сабой усе гэтыя далёкія «сваякі» больш прывычных для нас падасінавікаў і апенак? Паспрабуем разабрацца.

Адным з падобных «жывых лекаў» з'яўляецца **індыйскі (ён жа японскі, ён жа кітайскі) марскі рыс або рысавы грыб**. Знешне нагадвае ўсім вядомую злакавую культуру, таму так і называецца. Спрыяльнымі ўмовамі для росту і размнажэння лічыць шкляную ёмістасць, накрытую марляй; штодзённую змену вады, якая абавязкова павінна быць негатаванай і фільтраванай; адсутнасць прамых сонечных прамянёў і рэзкіх пахаў, а таксама прамыванне ў сітцы пасля чарговага сцэджвання вадкасці. Калі ўсе ўмовы камфортнага пражывання будуць захаваныя, грыб аддзячыць вам гаючым напоем, які гатуецца ў прапорцыі 4 ст. лыжкі рысу і 2 ст. лыжкі цукру на літр вады. Прымаць настой з мэтай лячэння трэба не менш як 300 мл у дзень, а з мэтай прафілактыкі — па жаданні. Марскі рыс аказвае мачагоннае, антымікробнае, імунамадулюючае дзеянне, дапамагае знізіць артэрыяльны ціск і паляпшае абмен рэчываў. Таксама карысны пры бяссонніцы, галаўным болі, стомленасці, неўрастэніі, пры праблемах са страваваннем. Праўда, ёсць і супрацьпаказанні: інсулізалежным дыябетыкам піць настой забаронена. Акрамя таго, яго можна выкарыстоўваць для догляду скуры ў якасці прыроднага ласьёну, які пазбаўляе ад адмерлых клетак.

Не менш карысны **кефірны грыб (грыбок індыйскіх ёгаў, малочны, тыбецкі)**. Жыць ён таксама любіць у шкляных ёмістасцях, аднак харчуецца, у адрозненне ад індыйскага рысу, пастэрызаваным або натуральным малаком, патрабуе абавязковай штодзённай прамыўкі цёплай вадой, інакш загіне, не паспеўшы «вырабіць» кефір, дзеля якога, уласна, і вырошчваецца. Напой гатуецца максімум суткі. Для гэтага трэба змяшаць 2 ч. лыжкі грыба са шклянкай (максімум літрам) малака і накрытую марляй пасудзіну паставіць у цёмнае месца. Пасля працэджвання гатовы прадукт можна смела піць. Дастаткова ўжываць 200—250 мл напою ў дзень, перад сном або раніцай да яды. Кефір п'юць 20 дзён, а затым варта зрабіць 10-дзённы перапынак, каб арганізм не прывыкаў. Гаючыя ўласцівасці малочнага грыба адчуюць людзі, якія пакутуюць ад атлусцення, алергіі, няправільнага абмену рэчываў, страўнікава-кішачных захворванняў. Ён садзейнічае загойванню ран, паляпшае памяць, актывізуе імунную сістэму, павышае агульны тонус арганізма і, у адрозненне ад рысавага грыба, рэкамендуецца хворым на цукровы дыябет.

Самым вядомым з заяўленай тройкі «хатніх гадаванцаў» з'яўляецца **чайны грыб**. Яго таксама называюць медузаміцэтам (навуковае найменне), маньчжурскім, грыбам Камбуча (Камбуха, Камбука — каму як падабаецца), марскім, фанга, чайным квасам, японскай губкай і нават японскай маткай. Яго «патрабаванні»: слоік з горлачкам, накрытым марляй, нямоцны салодкі чай (5—6 ч. лыжак цукру і 2 ч. лыжкі заваркі на літр вады), цёплае месца і перыядычная прамыўка (прыкладна раз на тыдзень) ледзь цёплай гатаванай вадой. Карацей — непераборлівы. І нават калі пра яго зусім забыцца, і вада цалкам выпарыцца, то, калі дадаць чаю, грыб зноў можа ажыць. Але, зразумела, гарантый няма. Пры спрыяльных жа ўмовах квас будзе гатовы да ўжывання на 7—8 суткі. Даказана, што ён станоўча ўздзейнічае на кішэчнік, дапамагае пры гастрыце, гіпатаніі, дызентэрыі, танзіліце, а таксама з'яўляецца натуральным касметычным сродкам. З яго дапамогай робяць масаж, пазбаўляюцца ад вугрыстага сыпу і перхаці, умацоўваюць валасы, даглядаюць рукі.

Напрыканцы хочацца зазначыць, што якімі б лекавымі ўласцівасцямі грыб ні валодаў, past сур'ёзным захворванні спадзявацца толькі на яго як мінімум неразумна.

Шыпшына дапаможа пры анеміі

Гэта дзікая ружа прываблівае сваёй прастатой і, у адрозненне ад ганарыстай «царыцы садоў», расце сама па сабе, не патрабуючы асабліва чалавечага клопату і догляду. Яна шчодра дзеліцца з людзьмі не толькі харастом сваіх кветак, але яшчэ і смакам і карысцю для здароўя, якую прыносяць чалавеку яе плады. Існуе нямала відаў шыпшыны, і плады любога з іх — сапраўдная прыродная аптэка.

Плады шыпшыны ўтрымліваюць у сабе вітаміну С больш, чым цытрусавыя ці чорныя парэчкі. Прысутнічаюць у іх і іншыя вітаміны — групы В, К, Р, карацін (у насенні — вітамін Е), а таксама мінералы, калій, фосфар, жалеза, магній, марганец, розныя антыаксіданты, пекціны, дубільныя рэчывы, арганічныя кіслоты і эфірны алей.

Гарбата з пладоў шыпшыны здаўна цанілася, паколькі дапамагала ўмацаваць імунітэт, а таксама і стрававальную сістэму. Гатуецца яна вельмі проста: свежыя або сухія ягады заліваюцца кіпенем, затым настойваюцца 30 хвілін у закрытай пасудзіне. (Прыгатаваны такім чынам настой можна захоўваць не больш за два дні.)

Настой пладоў шыпшыны паляпшае кровазварот у сасудах галаўнога мозгу, а яшчэ ён вельмі карысны пры пароках сэрца і анеміі, пры гепатыце і захворваннях печані, таксама яго рэкамендуюць як мяккі паслабляльны і мачагонны сродак. Акрамя таго, ужыванне моцнага зялёнага чаю з экстрактам (сіропам) шыпшыны замест цукру дапаможа пазбавіцца ад галаўных болаў.

Увага! ***Настоі шыпшыны супрацьпаказаны людзям, у якіх назіраецца недастатковасць кровазвароту, а таксама трамбозы, тромбафлебіты, эндакардыты. Таму перш, чым пачаць прымаць прэпараты на аснове дзікай ружы, лепш за ўсё параіцца са сваім тэрапеўтам.***

- Пры анеміі, знясіленні рэкамендуецца есці свежыя ягады шыпшыны ў вялікай колькасці, а таксама піць па 1/4—1/2 шклянкі настою пладоў 2—3 разы на дзень.
- Пры адрыжцы, млоснасці, ванітах карысна жаваць пялёсткі шыпшыны. Акрамя таго, можна заварваць іх, як гарбату, настойваць 15—20 хвілін і прымаць па 1/2 шклянкі 3—4 разы на дзень пры болях у страўніку.
- Пры схільнасці да насавых крывацёкаў прымайце па 1/2 шклянкі настою пладоў шыпшыны 3 разы на дзень: 20 г здробненых у кавамолцы пладоў заліце 1 шклянкай кіпеню, настойвайце ў тэрмасе, затым працадзіце.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

СЭКС У НОРМЕ!

Вернасць — родам з дзяцінства

Няздольнасць захоўваць вернасць аднаму партнёру закладваецца не навакольным асяроддзем ці абставінамі, а нашымі бацькамі — татам і мамай. Што такога павінны яны зрабіць, каб наша дарослае сэксуальнае жыццё пайшло накасяк? Адкуль бяруцца разнастайныя сэксуальныя адхіленні? Урач-сэксолаг Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Дзмітрый КАПУСЦІН дае адказ на гэтыя пытанні ў сваёй новай кнізе «Асноўны інстынкт. Урокі сэксуальнай адукаванасці», якая днямі пабачыла свет, і ў наступным інтэрв'ю.

— З якога моманту пачынае фарміравацца палавая свядомасць?

— Ва ўлонні маці, безумоўна... Самае важнае тут, каб дзіця было жаданым. У нежаданага абавязкова будуць праблемы. Яно не атрымае патрэбнай колькасці пяшчоты і цеплыні ад маці. Неласкавая, як і вельмі занятая, матуля — вялікае няшчасце для немаўляці. І як высветлілася, на праяўленне пяшчоты і клопату матулям адведзены ўсяго адзін год. Менавіта ў гэты перыяд закладваецца аснова стаўлення маленькага чалавечка да людзей... Так што жанчына, якая збіраецца нарадзіць, павінна сказаць сабе: з моманту наступлення цяжарнасці і яшчэ год пасля з'яўлення дзіцяці на свет даю слова не належаць сабе — толькі гэтаму новаму чалавечку.

— Вы хочаце сказаць, што жанчына, якая ў час цяжарнасці разважала, напрыклад, над тым, ці пакінуць дзіця або, крый Божа, мела намер развітацца з жыццём, найгоршым чынам паўплывае на лёс дзіцяці?

— Абавязкова паўплывае. Калі быў элемент адарвання ад дзіцяці, значыць, надыдуць і наступствы. Колькі часу таму ў адным з расійскіх рэгіёнаў была нават спроба забараніць раскрыццё тайны полу дзіцяці. І ў гэтым быў сэнс. Бо калі раптам пол дзіцяці не супадае з пажаданым, у маці ўзнікае адарванне ад малога. Даказана, што гэта адарванне адбываецца на ўсім далейшым жыцці чалавека. Наогул у справе з'яўлення чалавека на свет няма няважных рэчаў. Важна і тое, аб чым думала маці падчас цяжарнасці, і ці кармілі дзіця грудным малаком, і калі аднялі ад грудзей... У мацярынскім малаку ёсць тое, чаго не можа быць нават у самай лепшай штучнай сумесі — гармоны. Яны забяспечваюць нармальныя развіццё галаўнога мозгу, фізічны і псіхічны стан. Вызначана, што лепш за ўсё дзіця развіваецца на руках у гаваркой маці: чым больш размаўляюць з малым, тым лепшае яго інтэлектуальнае развіццё. Так што на працягу года маці не павінна выпускаць дзіця з рук.

— А калі пяшчоту і ўвагу падорыць бабуля?

— Навуковых прац адносна таго, наколькі можна замяніць маці, няма. Аднак замена ў любым выпадку не будзе раўназначнай. Узяць хоць бы грудное кармленне. Пакуль маці корміць дзіця, яна яго гладзіць, размаўляе з ім, і тым самым дае малому зразумець, што яго тут чакаюць, ён тут патрэбны.

Недагладжаныя, неданошаныя на руках, недакалыханыя дзяўчаткі адчуваюць рэзкую патрэбу ў пацалунках, дотыку, пяшчоце з пачаткам месячных. Адсюль і дзіцячая прастытуцыя. Гэта не жаданне зарабляць грошы, а дэфектнае матуліна выхаванне. Такое дзіця пачне шукаць заспакаення, будзе пагладжваць сябе, займацца псеўдананізмам...

Маці павінна паказаць, што дзіця для яе — адзінае, самае важнае ў жыцці. Дзесьці на працягу паўгода-года малое наогул не аддзяляе сябе ад маці. І таму, калі яна выходзіць у іншы пакой, яму становіцца незразумелым, «куды падзелася мая частка». Дзіця плача. Бліжэй да паўтара гадоў, яно стане здольным аддзяліцца. І гэта надзвычай важны момант, які цесным чынам звязаны з грудным кармленнем. Адлучаць ад грудзей можна тады, калі, як вызначылі вучоныя, дзіця пачало адкідваць ад сябе цацкі і сачыць за тым, куды яны ўпалі. Значыць, прыйшло ўсведамленне магчымасці аддзялення ад прадметаў. Цяпер можна адлучаць ад мацярынскага малака без стратаў для псіхафізічнага і сэксуальнага здароўя дзіцяці. Рана адлучаныя ад грудзей немаўляты будуць адчуваць сябе кінутымі.

— А калі да дзіцяці прыходзіць усведамленне палавой прыналежнасці?

— На працягу першых 1,5-2 гадоў жыцця. Разам з атрыманнем мацярынскага малака адбываецца распазнаванне навакольных па поле. Звычайна ўсе дзеці баяцца мужчын. Далей дзіця адносіць сябе да канкрэтнага полу, эксперыментуе ў ролі «я-хлопчык» ці «я-дзяўчынка» і выбірае галоўнага чалавека. У прынцыпе, гэта павінна быць маці, якая, як мы сказалі вышэй, не выпускае дзіця з рук. Толькі ад матулі можна і вельмі важна атрымаць пацвярджэнне сваёй незаменнасці. Груба кажучы, дзіця павінна ўсвядоміць: калі я памру, то і маці без мяне жыць не будзе... Калі малое схавалася пад сталом, маці павінна быць у адчаі, шукаць «самае дарагое на свеце», а не спакойна хадзіць міма і размаўляць па тэлефоне. Калі так, дзіця пачне нерваваца. Маўляў, калі ты сядзіш у прыбіральні, я ж стаю пад дзвярыма, чакаю цябе, а тут я наогул знік — і ты спакойная?! У ідэале нармальнае дзіця нармальнай маці павінна поўнасцю пераканацца ў любові апошняй і... сесці ёй на галаву. Так прыходзіць усведамленне важнай ісціны: мама даруе ўсё. Гэта аснова дазваляе дзіцяці пераключыцца на асваенне «тэрыторыі» таты.

— Зараз нярэдка жанчыны адважваюцца нараджаць для сябе і лічаць, што нічога дрэннага ў гэтым няма...

— У любым выпадку будуць праблемы. Як бы маці ні займалася з хлопчыкам барацьбой, ні гуляла з ім у футбол, дзіця атрымае трансфармацыю палавой ролі. Тата — гэта іншы свет, цікаўнасць да якога сапраўды прачынаецца дзесьці пасля года. У гэты час дзіця, умоўна кажучы, задаецца пытаннем: Нам з мамай добра? — Добра. — Чаго ж у такім разе нейкі мужык ходзіць па кватэры і камандуе? Асабліва матуляй — яна ж багіня!». Тата ўспрымаецца менавіта як аб'ект, які камандуе мамай. Нармальны тата — без трансфармацыі ролі, як кажуць, не «ануча», — павінен мець мужнасць і права пры дзіцяці сказаць маці «цыц!». Даць зразумець, хто ў доме гаспадар. У супрацьлеглым выпадку будзе тое, што даволі распаўсюджана ў нашых сем'ях: жанчына — і культурная, і разумная, сама ведае «што і як», а таты па вялікім рахунку няма. У ідэале (калі тата камандуе, без грубай сілы, натуральна, мамай), дзяўчынка аднойчы выбірае момант і забіраецца на рукі тату, пачынае канкурыраваць з маці, маўляў, ты, мама, ідзі, а мы тут з татам пабудзем. Вось толькі цяпер мама можа занята навукай, выйсці на працу і г.д. Мама свою справу зрабіла — заклала важную аснову. А дзяўчынка пачынае рабіць тое, што робіць маці — даглядаць, рыносіць пантофлі, падаваць чай, але аднойчы яна зразумее, што гэтага мала. Прыходзіць усведамленне таго, што трэба перасягнуць маці ў справе прыцягнення і ўтрымання ўвагі мужчыны. Седзячы на руках у таты, дзяўчынка вучыцца спакушаць і ўтрымліваць мужчыну праз 20 гадоў. І тата, і мама павінны ўспрымаць гэта нармальна.

— Рызыкну меркаваць, што роля бацькі ў дачыненні да выхавання хлопчыка яшчэ больш важкая...

— Практычна ўсе дзеці ад пачатку фемінізаваныя. Да нейкага моманту і хлопчык, і дзяўчынка робяць у дачыненні да таты тое, што робіць мама. Даглядаюць, рыносяць пантофлі, абслугоўваюць, аднымі словам. Нармальны тата кажа: «Не мужчынская гэта справа...» і вядзе хлопчыка ў мужчынскі свет. Ужо з 1,5 — 2 гадоў хлопчык можа асвойваць «мужчынскія справы» — рыбалку, паляванне, лазню і г.д. Як пішуць заходнія псіхолагі, хлопчык павінен першы раз у жыцці здрадзіць — адштурхнуць ад сябе жаночыя вартасці, ідэнтыфікаваць сябе з бацькам. І захаваць пры гэтым любоў да маці. Тут ёсць яшчэ адна асаблівасць. На этапе флірту дзяўчынкі з татам, маці спакойна ставіцца да гэтага. А вось калі хлопчык пачынае адпіхваць тату і «заляцацца» да маці, нармальны тата не стрывае падобнай канкурэнцыі. Такім чынам, у хлопчыка адначасова з нараджэннем жадання кіраваць жанчынай, узнікае і страх кастрацыі — эдыпаў комплекс. Ад таго, ці ўдасца пераадолець яго, залежыць тое, наколькі бесправблемным будзе наступнае жыццё.

— Любыя псіхалагічныя праблемы ў дзіцячым жыцці абавязкова вылівающца ў праблемы дарослага жыцця?

— На шчасце, не любыя, але не малая іх колькасць. Мы пакуль вялі размову пра першы этап псіхасэксуальнага развіцця, але ім усё не абмяжоўваецца. На другім этапе — з 2-4 да 10-12 гадоў вызначаецца палавая роля, паняцці вернасці, колькасці дзяцей, мы вучымся ўзаемадзеянню палоў на прыкладзе ўласнай сям'і. Усё, што будзе засвоена ў сям'і, павінна скарэктавацца сярод равеснікаў. Бывае, што сям'я сфарміравала адны ўстаноўкі, а вуліца падпраўляе пад той соцыум, у якім развіваецца кожнае новае пакаленне. Калі выхаванне жорсткае, вуліца, як правіла, мала ўплывае, а вось розныя варыянты і дэфекты выхавання карэктуюцца вуліцай добра. Трэці этап — з 10-12 да 21-26 гадоў — гэта выбар партнёра, развіццё ўласна сэксуальнага сцэнарыя...

— А што такога павінна адбыцца, каб сэксуальны сцэнарый пачаў развівацца не ідэальна? Калі гаварыць пра жанчын, то я маю на ўвазе «гандаль каханнем»...

— Прастытуцыя мае месца, калі дзіця не атрымлівае задавальнення ад аднаго чалавека. Заходнія даследчыкі вывучалі, ад чаго залежыць колькасць партнёраў у дзяўчынкі. Праверылі 45 пунктаў, і высветлілася, што працуе толькі адзін. Дабрабыт бацькі. Маюцца на ўвазе не толькі ўласна грошы. Важна наогул, колькі сілаў, грошай, часу бацька патраціў на дачку. Тата павінен дзяўчынку песціць. Кожнае «хачу», усе патрэбы, якія будуць у жыцці, павінен задаволіць адзін мужчына — да нейкага моманту бацька. А калі цётка падарыла адно, бацька раз у жыцці набыў іншае, дзед — трэцяе, прыходзіць усведамленне таго, што дамагчыся розных выгодаў можна з дапамогай духоўнай прастытуцыі.

— Але ж жанчына ведае, што прастытуцыя — і духоўная, і фізічная — гэта дрэнна... Чаму ўсё ж такі нестае сілаў не пачаць, спыніцца?

— Гэта вельмі складаная пытанне. Па-першае, мы не ведаем дакладнага механізма ўтварэння варыяцый, дэфармацый паводзінаў, сэксуальных ненармальнасцяў. Вядома, напрыклад, што свой уклад можа ўнесці рэзкае ўвасабленне, калі нейкая сітуацыя моцна ўрэзалася ў свядомасць. Вялікая колькасць злачынцаў брала на сябе дзеянні таго ж Чакаціла. Аднак калі эксперты пачыналі аналізаваць паказанні апошніх, то разумелі, што злачынствы здзейсніў нехта іншы. Кожны серыйны сэксуальны маньяк дзейнічае паводле свайго сцэнарыя. У Чакаціла былі пэўныя праблемы са здароўем — ён доўгі час пакутаваў ад начнога энурэзу, мела месца нізкая самаацэнка. Вядома і тое, як у падлеткавым узросце ён перажыў першы аргазм пры спробе згвалтаваць сяброўку яго сястры, першакласніцу. Гэта было ў рэдкім лесе, непадалёк — шаша. Усе забойствы Чакаціла здзейсніў менавіта на такім «фоне».

Іншы сэксуальны злачынца, гомасэксуал, гвалтаваў 8-12 гадовых хлопчыкаў. Заваблівaў пытаннем «Хочаш здымацца ў кіно?», а потым рыхтаваў сцэну пакарання піянера. Апранаў хлопчыкаў заўсёды аднолькава. Белая кашуля, сінія шорцікі і лайкавыя чаравікі. Выбіваў з-пад ахвяры табурэт, дзіця страчвала прытомнасць, маньяк гвалтаваў і забіваў... Высветлілася, што першую моцную эмоцыю, роўную па сіле аргазму, маньяк атрымаў, калі ўбачыў збітага машынай хлопчыка. У памяць урэзаліся перадсмяротныя сутаргі. Дзіця было апранута так, як потым злачынца апранаў сваіх ахвяраў.

— А чаму чалавек не можа падпарадкаваць свае жаданні свядомасці?

— Жаданне мяжуе са страхам, а страх танізуе. З аднаго боку, не ўсе хочуць трымаць апошні пад кантролем, а з другога — не ўсе і могуць. У нейкім сэнсе гэта «няправільнае» сэксуальнае жаданне можна параўнаць з жаданнем алкаголіка выпіць, наркатычнай залежнасцю. Нельга піць, але ж як хочацца! Наогул у адной са сваіх кніг я апісаў 221 сэксуальнае адхіленне. Думаю, гэта далёка не ўсе варыянты. Праблема яшчэ ў тым, што ў нашым постсавецкім грамадстве пацыенты не давяраюць у поўнай меры ўрачам. Асобаў з яўнымі адхіленнямі ў маёй 30-гадовай практыцы, а гэта дзясяткі тысяч пацыентаў, было чалавек 10-20. Ім з гэтым добра. Адзін беларускі маньяк называў абуджэнне свайго жадання «пайсці на паляванне». Часцей за ўсё, гэтыя сэксуальныя ненармальнасці, дарэчы, фарміруюцца на трэцім этапе. Аднак дакладна раскрыць механізмы гэтых сітуацый, сказаць, як адбываецца гэта фарміраванне, сёння немагчыма. У першую чаргу па прычыне адсутнасці ў рэспубліцы дзіцячай сэксапаталогіі. У Беларусі, як вядома, працуе 9 сэксапаталогаў — і ніводнага дзіцячага.

— Як зразумець, ці няма ў тваіх сэксуальных адносінах чагосьці ненармальнага?

— У першую чаргу разглядаецца паняцце партнёрскай нормы. Паводле энцыклапедыі «Сучасная сэксалогія», выдадзенай пад кіраўніцтвам доктара медыцынскіх навук Уладзіміра Дамарацкага, размова ідзе пра індывідуальныя палавыя праявы чалавека, якія дазваляюць яму перажываць сэксуальную асалоду, мець гарманічныя адносіны з партнёрам. Да сэксуальнай нормы адносіцца патэнцыйная здольнасць выконваць тры асноўныя функцыі сэксуальнасці — біялагічную (апладненне), псіхалагічную (атрыманне задавальнення) і сацыяльную (рэалізацыя патрэбы ў міжчалавечых кантактах). Цяжкасці ў рэалізацыі гэтых функцый вызначаюць выражанасць адхіленняў ад нормы ў бок сэксуальнай паталогіі.

— Вашы пацыенты — гэта, хутчэй за ўсё, людзі, у якіх якраз няма партнёрскай гармоніі...

— Так і ёсць. Скажам, адзін прыняе сілу, другі трывае. Праўда, той, каго нешта не задавальняе, аднойчы можа пайсці не да сэксолага, а пачаць пошук партнёра на баку.

— Ці шмат людзей у прынцыпе мае патрэбу ў паслугах сэксолага?

— У Беларусі гэта ніхто не даследаваў. Калі ж спаслацца на заходнія спецыялістаў, то амерыканцы лічаць, што 10 працэнтаў мужчын сутыкаюцца з часовымі ці пастаяннымі парушэннямі. Па некаторых звестках, колькасць расст ройстваў у мужчын адпавядае ўзросту. У 30 гадоў — гэта 30 працэнтаў, у 70 гадоў — 70. Дарэчы, я спрабаваў неяк высветліць, колькі такіх прэпаратаў, як віягра, рэалізуецца ў нашай краіне... Тайна за сямю пячаткамі! А з аднаго медыцынскага часопіса даведаўся, што прэпарат віягра трапіў у дзясятку самых прадаваных прэпаратаў у свеце. Гэта значыць, велізарная колькасць людзей мае патрэбу хоць бы ў кансультацыйнай дапамозе. Прэпарат дарагі, але для многіх эфектыўны, многім дае ўпэўненасць. Аднак ёсць і адваротны бок — псіхалагічная залежнасць.

— Жанчынам, напэўна, жывецца ў гэтым сэнсе больш спакойна: ёсць сэкс — добра, няма — яшчэ лепш?

— Гадоў дзесяць таму я правадзіў «круглы стол» з удзелам псіхолагаў, сямейных псіхатэрапеўтаў па тэме пазашлюбных сувязяў. Папрасіў слухачоў напісаць на паперы дзве лічбы. Колькі кожны ведае мужоў, якія хоць бы раз здрадзілі сваім жонкам, і жонак, якія здрадзілі сваім мужам. Яшчэ за савецкім часам, калі сур'ёзна займаліся праблемамі сям'і, была такая лічба: дзесьці 62-65 працэнтаў мужоў раз або тысячу разоў здраджвалі сваім жонкам. Па жанчынах лічба вагалася ў межах 30-36 працэнтаў. Паводле ж майго апытання, 72 працэнты мужоў і 56 працэнтаў (!) жонак здраджваюць сваім партнёрам па шлюбе. Няхай гэта не рэпрэзентатыўная выбарка, але, думаю, лічбы не зусім далёкія ад ісціны. У апошнія гады ўкараніўся наступны падыход да шлюбных узаемаадносінаў: жонкі бяруць ад мужоў тое, што тыя здольныя даць, а астатняе... можна ўзяць у іншым месцы.

— Калі разглядаць здраду як спробу адшукаць гармонію ў сэксуальным сэнсе, ці можна сказаць, што мужчыны радзей бываюць задаволеныя тым, што ёсць у іх сем'ях?

— Усё не так складана. Навізна мужчыну стымулюе, а стэрэатып забівае. У жанчын якраз цалкам наадварот. Яе задавальняюць стабільныя, спакойныя адносіны. З другога боку, многае залежыць ад установак грамадства. Чым больш такіх кінастужак, як «Сэкс у вялікім горадзе», тым больш жанчын будзе думаць: я разумею, што такое біфштэкс, але, можа быць, пакаштаваць курыцу, калі ўсе кажуць, што яна не горшая? Соцыум можа падштурхнуць жанчыну да эксперыменту.

— Жанчынам ці мужчынам больш складана быць задаволенымі сваім сэксуальным жыццём?

— Як правіла, мужчына разам з аргазмам атрымлівае і задавальненне, а вось жанчына можа не перажыць аргазм, але быць маральна задаволеная. Жаночы аргазм часцей звязаны з асобай мужчыны, а мужчынскі — з паводзінамі жанчыны... Наогул тут ёсць адзін важны аспект, на які ўжо даўно звярнулі ўвагу псіхолагі — праблема жаночых паводзінаў, якія «кастрыруюць» мужчыну. Жанчыне часам мала сэксу, яна патрабуе ад мужчыны шэраг «іншых пунктаў». Мужчына не спраўляецца, у яго нараджаецца пачуццё віны, якое трэба адпрацаваць. Футрам, ботамі, якія па факце для жанчыны больш важныя, чым яго сэксуальнае здароўе, перспектывы ўзаемаадносінаў і яе ўласнае задавальненне. Вось вам і сэксуальная гармонія: ён не можа, а ёй і не трэба.

— А чаму сэксуальных адхіленняў і ненармальнасці больш сярод мужчын?

— Сапраўды, аб сэксуальных ненармальнасцях мужчын напісана значна больш прац. Можа быць, адхіленні ў жанчын — больш закрытая тэма ці жанчыны радзей звяртаюцца да спецыялістаў... Узяць хоць бы тыя ж згвалтаванні. Не ідуць з гэтым жанчыны да сэксолагаў. Неяк усё само сабой забываецца. Хоць псіхолагі на падставе свайго практычнага вопыту кажуць, што ад трэці да паловы жанчын перажылі палавыя акты супраць свайго жадання.

— Можа, варта больш інтэнсіўна развіваць сэксуальную дапамогу ў краіне?

— Наадварот. Спачатку павінны пайсці пацыенты, і толькі тады стане зразумелым, што варта развіваць. А пакуль... У савецкія часы ў Беларусі было восем сэксапаталогаў, зараз дзевяць. Нас мала, і тыя, на жаль, слаба запатрабаваныя.

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

ГІГІЕНА З «ДУШКОМ»?..

Урач-гігіеніст падазраецца ў тым, што закрывала вочы на парушэнні, у прыватнасці, тых жа санітарных нормаў і атрымлівала за гэта ад удзячных прадпрымальнікаў «падарункі». Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, 29-гадовая мінчанка, урач-гігіеніст «Мінскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі», на тэрыторыі «Гандлёвага дома «Ждановічы» атрымала ад аднаго з індывідуальных прадпрымальнікаў у якасці хабару матэрыяльных каштоўнасцяў на 187 тысяч рублёў. Ён расплаціўся за тое, што не меў гігіенічных пасведчанняў на прадукцыю, якую рэалізоўваў. У сваю чаргу, службовая асоба не склала пратакол аб гэтым адміністрацыйным парушэнні.

Ігар ГРЫШЫН.

АБ ШАКАЛАДЗЕ ЗАМОЎЦЕ СЛОВА...

КАРЫСНЫЯ ЯКАСЦІ

— Гэта вельмі смачна

Наўрад ці гэты пункт можна занесці ў катэгорыю «карысных якасцяў», але няўжо мы не ядзім шакалад менавіта з-за яго цудоўнага смаку. Чорны, белы, малочны, з арэхамі... кожны можа падабраць нешта на свой густ.

— Прыўзнімае настрой

Хоць цяпер і існуе меркаванне, быццам шакалад зусім не з'яўляецца антыдэпрэсантам і ўсё гэта выдумкі, але калі штосьці не ладзіцца і праблемы надыходзяць з усіх бакоў, плітка добрага шакаладу з кубачкам гарбаты можа даць неперaўзыдзены эфект.

— Дапамагае думаць

Вы рэгулярна займаецеся інтэлектуальнай дзейнасцю? На вас нечакана звалілася велізарная колькасць работы і як ніколі патрэбна падтрымка? На дапамогу зноў прыходзіць шакалад! Паляпшае працу мозгу, спрыяе разумовай дзейнасці. Асабліва эфектыўны чорны, горкі шакалад. Таму калі раптам захацелася купіць вялікую плітку шакаладу, не адмаўляйце ў задавальненні. Ваш арганізм ведае, што яму трэба.

— Павышае імунітэт

Калі хочаш быць здаровым, еш шакалад! Ён не толькі павышае імунітэт, але таксама паляпшае працу крывяноснай сістэмы, нармалізуе ціск і ўмацоўвае сасуды.

— Падаўжае жыццё

Вучоныя даказалі, што рэгулярнае ўжыванне шакаладу ў ежу падаўжае жыццё чалавека на год. Вядома, калі есці яго ва ўмераных дозах.

Жаночыя сакрэты

Стравы эратычнай кухні

Такім чынам, вы вырашылі правесці класічны рамантычны вечар, з «прэлюдыяй», якая павінна настроіць вас і вашага партнёра на цэлую ноч сладастрасных уцех? І зрабілі правільна. Рамантычная вячэра пры свечках, на якой прысутнічаюць толькі трое — вы, ён і... музыка — лепшы пачатак для паглыблення ў любоўны дурман.

ПРАВІЛЫ

Накрываючы стол да эратычнай вячэры, аддайце перавагу прыгажосці сервіроўкі, а не колькасці страў. Пераяданне — галоўны вораг сэксуальнай фантазіі. На вашым стале павінны прысутнічаць свежая агародніна, лёгкія закускі, якім можна надаць пікантную форму, і абавязкова — настоі духмяных траў, карэння, кактэйлі востра-салодкага водару. Свежыя і салодкія пахі напоўняць ваша дыханне і акажуць узбуджальнае дзеянне.

ДЛЯ ВОДАРУ СКУРЫ

Сырую агародніну (буракі, моркву, агуркі) надзерці на тарцы і, змяшаўшы са стружкамі зялёнага яблыка, заправіць чарнаслівам, грэцкімі арэхамі, свежым лісцем пятрушкі і чорных парэчак, дадаць зяленіва кропу. Маянэз і іншыя заправы — выключыць, бо яны «заб'юць» водар і не дадуць яму пранікнуць у вашу скуру і валасы.

ДЛЯ ЎЗМАЦНЕННЯ ЦЯГІ

Дробна нарэзаць 400 грамаў варанай цяляціны, ачысціць і падзяліць на долькі 2 вялікія грэйпфруты, змяшаць з адваранай спаржай (400 г), дадаць лісце салаты. Для заправы змяшаць у блэндары 4 ст. лыжкі аліўкавага алею, цукар на кончыку нажа, соль, перац і 2 ст. лыжкі віннага або яблычнага воцату. Падаваць страву ахалоджанай.

ДЛЯ САЛОДКІХ ДУМАК

6 яечных жаўткоў узбіць з цукрам-пяском дабяла, дадаць 1 пакецік ваніліну і здробненае ванільнае пячэнне, усё перамяшаць да аднароднай масы. На нагрэтую патэльню з растопленым сметанковым маслам выліць масу і крыху абсмажыць з абодвух бакоў. Перад падачай страву падзяліць на 2 часткі, упрыгожыць у «мужчынскім» і «жаночым» стылях садавіной і ўзбітымі вяршкамі.

ПЕРАД ПАЦАЛУНКАМ

Рэкамендуецца выпіць халодны настой з мяты і лімона і змазаць вусны мёдам. Настой гатуецца проста: 3—4 ч. лыжкі мяты пярцовай заварыць кіпенем і, дадаўшы крыху мёду і 3 кружкі лімона, паставіць у цёплае месца. Працадзіць праз 2—3 гадзіны, пераліць у хрустальны графін і паставіць у халадзільнік чакаць свайго часу...

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Сам сабе псіхолаг

ПАВЫШАЕМ САМААЦЭНКУ

Станоўчая самаацэнка — адна з умоў добрага настрою і поспеху ў жыцці. Пахвала навакольных, безумоўна, падбадзёрвае, але нармальны дарослы чалавек павінен умець і сам ацаніць сябе адэкватна. Так, здаровы скепсіс і самакрытыка неабходныя, але — ва

«Сяджу, слухаю, як у халадзільніку падае размарожаны кавалак лёду...»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

З пасёлка Міханавічы Мінскага раёна на «гарачую лінію» газеты патэлефанавала ўзрушаная Таццяна Аляксееўна Вашчанка (крыху пазней з той жа нагоды звярнулася і яе суседка). Яна эмацыйна распавяла пра тое, што жыхары вуліцы Шасейнай ужо без малога суткі знаходзяцца без электрычнасці. Напярэдадні ўвечары давялося карыстацца свечкамі для асвятлення жытла, а назаўтра з раніцы дадалася іншая, больш актуальная праблема: пачалі размарожвацца халадзільнікі. А там жа прадукты, у роспачы гаварыла заяўніца.

Далей яна скардзілася на тое, што такая сітуацыя паўтараецца не першы раз. Нават у верасні гэта ўжо не першае знікненне электрычнасці. І кожнае такое адключэнне суправаджаецца матэрыяльнымі стратамі. «Колькі разоў тыя ягады ў мяне замарожваліся-размарожваліся. А бройлерныя кураняты — хто мне за іх грошы кампенсуе? І галоўнае, мы нідзе не можам дабіцца адказу: чаму так адбываецца? Вось зараз толькі праз паўдня ў дыспетчарскай электрасетак знялі слухаўку. Кажуць, да нашай лініі падключана нейкая фірма, маўляў, усе пытанні да яе. Куды нам яшчэ скардзіцца?»

Паводле слоў **галоўнага інжынера Мінскіх электрасетак Андрэя АКСЁНАВА**, сапраўды, за апошнія чатыры месяцы тройчы адзначалася такая праблема — быў адключаны кабель, адсутнічала электрычнасць. І кожны раз прычыны здарэнняў былі розныя. На момант нашага звароту ўчастак кабелю на 10 кілавольт таксама быў адключаны. Відавочна, ён быў пашкоджаны, але ў чым канкрэтна праблема — яшчэ высвятляла брыгада кабельшчыкаў, якая выехала на месца.

— Затрымка з падключэннем дамоў да электрасілкавання звязана з тым, што кабель выйшаў са строю напярэдадні ўвечары. Да цемры поцукі нічога не далі, іх узнавілі з раніцы, далучылі з гэтай мэтай дадатковую брыгаду. Кабель жа знаходзіцца ў зямлі. Знайшлі месца пашкоджання, толькі па чарзе адключыўшы тры іншыя кабелі. Будзем рабіць усё магчымае, каб да вечара даць людзям электрычнасць, — сказаў Андрэй Іванавіч.

Далей ён зазначыў, што кабелі сапраўды старыя. Пацвердзіў і інфармацыю пра фірму. Калісьці менавіта яна пракладвала той самы кабель, але ён па-ранейшаму знаходзіцца ў яе на балансе. Электрасеткам тут перадалі на баланс толькі трансфарматарную падстанцыю. І цяпер прадпрыемства выязджае рамантаваць фактычна чужы кабель. Чаму тады яго не перадаць на баланс уласна электрасетак, мы, шчыра кажучы, са слоў галоўнага інжынера не зразумелі. Як і таго, чаму сітуацыя з адключэннем электрычнасці адбываецца так часта, няхай сабе і па розных прычынах. Выходзіць, гэта ўжо не выпадковасць, якую неяк патлумачыць і перажыць можна. А калі праўда, што людзі не ведаюць, як захоўваць (ці баяцца гэта рабіць) запасы прадуктаў харчавання ў халадзільніках ды маразільніках, нясуць страты, нешта ж трэба рабіць?

Наша размова з заяўніцай была эмацыйнай, што, безумоўна, цалкам можна зразумець, тым не менш выкладзеныя факты патрабуюць праверкі. Мы спадзяёмся на яе і на кампетэнтны адказ калі не з саміх Мінскіх электрасетак, дык, магчыма, з вышэйшай інстанцыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«Палескія сыры» пашыраюць геаграфію экспарту

Зроблена ў Беларусі

На ўнітарным прадпрыемстве «Палескія сыры» ў Хойніках днямі адбылася знакавая падзея: тут здалі ў эксплуатацыю новы ўчастак, абсталяваны пры дапамозе мінскай фірмы «Холадспецмантаж» халадзільным абсталяваннем нямецкага канцэрна «GRASSO». Што гэта значыць для палескіх сыраробаў, расказала дырэктар унітарнага прадпрыемства «Палескія сыры» Галіна БОНДАР, якая атрымала сімвалічны ключ ад новага цэха ад дырэктара ААТ «Халадзільнае абсталяванне» Алег ДЗЕНІСЕНКА.

— Новае абсталяванне дазволіць нам значна павялічыць эфектыўнасць работы ўсяго прадпрыемства, пашырыць асартымент і павысіць якасць прадукцыі, што для нас вельмі важна. Бо мы сёння экспартуем да 90 працэнтаў асобных відаў сваёй прадукцыі ў Расію, Ізраіль, Украіну, краіны Балтыі.

Тут да месца нагадаць, што малочны завод у Хойніках быў заснаваны 25 гадоў таму — у 1984-м. Магутнасці яго былі разлічаныя на перапрацоўку 500 тон малака ў суткі. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС перакрэсліла ўсе планы развіцця завода. На доўгія пятнаццаць гадоў вытворчасць сыроў, казеіну, іншых малочных прадуктаў была тут згорнутая.

— Пачынаючы з 1991 года, наш завод пастаянна зачынялі, але мы не пераставалі змагацца за сваё прадпрыемства ні на секунду, — расказвае Галіна Віктараўна. — І пяць гадоў таму, дзякуючы згуртаванасці нашага працоўнага калектыву, справы ў нас пайшлі ў гару. І сёння ў суткі «Палескія сыры» вырабляюць і рэалізуюць шэсць тон сметанковага масла, тры тоны розных сыроў, каля чатырох тон натуральнамалочнай прадукцыі, а таксама абястлушчанае малако, казеін. Наш новы кампрэсарны цэх, аснашчаны ўнікальным нямецкім абсталяваннем, — гэта канкрэтны крок па выкананні праграм энергазберажэння, развіцця малых і сярэдніх гарадоў, павышэння ўзроўню канкурэнтаздольнасці беларускіх малочных тавараў на ўнутраным і знешнім рынках.

Мы прабылі ў цэхах «Палескіх сыроў» адзін дзень. Кантактавалі з дзясяткамі мясцовых спецыялістаў. І зусім не адчувалі, што за нейкія дзесяць кіламетраў ад заводскіх сценаў праходзіць мяжа чарнобыльскай зоны. Верагодна таму, што ўся сыравіна паступае сюды з чыстых рэгіёнаў і праходзіць дасканалы лабараторны кантроль.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Барыс ЗАЛЕСКІ.

Надар з табакеркі

Крымінал

Не можа ніяк развітацца з Беларуссю 40-гадовы ўраджэнец Грузіі Надар Узоеў. Як паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Гомельскай вобласці, чарговая крымінальная справа заведзена ў дачыненні да гэтага грамадзяніна.

Яшчэ ў кастрычніку 2007 года яму быў забаронены на 10 гадоў уезд у нашу краіну — як асобе, якая ажыццяўляла дзейнасць, накіраваную на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь. Грамадзянін быў прыцягнуты да адказнасці за падробку дакументаў, незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы, парушэнне правілаў прадпрымальніцкай дзейнасці і інш. У чэрвені гэтага года Узоева затрымалі на тэрыторыі памежнай вёскі Церахоўка Добрушскага раёна. У ходзе расследавання крымінальнай справы аб «знаходжанні ў Рэспубліцы Беларусь замежнага грамадзяніна, высланага з Рэспублікі Беларусь, да заканчэння тэрміну забароны ўезду ў Рэспубліку Беларусь» былі высветлены дадатковыя факты яго супрацьпраўнай дзейнасці. Напрыклад, тое, што Узоеў у складзе арганізаванай групы ажыццяўляў незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць па ўвозе і рэалізацыі падакцызных тавараў. У прыватнасці, з Расійскай Федэрацыі ў нашу краіну пастаўляліся буйныя партыі тытунёвых вырабаў. Матэрыялы перададзены ва ўпраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржканторолю Беларусі па Гомельскай вобласці, следчы аддзел якога завёў у дачыненні да Узоева яшчэ адну крымінальную справу: па атрыкуле аб незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца арганізаванай групай. А на днях у рамках яе расследавання супрацоўнікі УДФР затрымалі яшчэ і двух жыхароў Гомеля.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ ПАЧЫНАЮЦЬ — І ВЫЙГРАЮЦЬ

Якіх «куранят» вырошчваюць у вясковым бізнэс-інкубатары?

Свірскі пасялковы Савет — адзін з самых вялікіх па колькасці населеных пунктаў у Мядзельскім раёне. На яго тэрыторыі знаходзяцца 33 вёскі, дзе больш чым 3 тысячы жыхароў. Практычна 2 тысячы з іх жывуць у Свіры, Канстанцінаве і Камарове. Адпаведна, у большасці астатніх трох дзясяткаў паселішчаў засталіся лічаныя людзі.

Эдуард ВАЙЦЯХОВІЧ перакананы: ініцыятыва мае рэальны вынік.

Статыстыка тут не адрозніваецца ад адпаведнай для іншых тэрыторый. «Традыцыйна» трэцяя частка месцічаў — пенсіянеры. Такі дэмаграфічны «расклад» не надта спрыяе развіццю прысядзібных гаспадарак. Апошнім часам рэзка зменшылася колькасць жывёлы на вясковых падворках. Калі два гады таму людзі трымалі 310 кароў, то сёлета засталося каля 200. Аднак, лічыць старшыня Свірскага пасялковага Савета Віктар Субач, надалей вясковы статак змяншацца не будзе. Яго аптымізм падмацаваны тым, што цяпер жывёлу ў асноўным трымаюць па большасці людзі сярэдняга ўзросту.

Збываць кароў ужо ніхто асабліва не спяшаецца, пакольк выгадна іх мець на падворку. Перш за ўсё, заўсёды да стала — малако, смятана, тварог, масла, сыр ды іншыя прадукты ўласнага прыгатавання. Смачна, ды і якасць гарантаваная, пакольк зроблена «для сябе». Па-другое, лішкі без цяжкасцяў можна рэалізаваць дзяржаве. Пры жаданні «набягаюць» сапраўды неблагія грошы. У асобных вяскоўцаў на падворку сапраўдныя «міні-фермы». Паводле слоў Віктара Субача, за год лепшыя здаюць па 10-16 тон малака — атрымліваецца даволі ўнушальны дадатковы даход.

Спецыялісты заўважаюць: аграпрамысловы комплекс па-ранейшаму адстае па ўзроўні аплаты працы як ад сярэдняга паказчыка па народнай гаспадарцы, так і ў большасці галін. У шэрагу выпадкаў выбар вяскоўцаў абмежаваны толькі занятасцю ў сельскай гаспадарцы. Знайсці альтэрнатыўную занятасць, аб неабходнасці якой так шмат гаворыцца апошнім часам, даволі складана. На тэрыторыі Свірскага пассавета, апроч мясцовага сельгаспрадпрыемства (СВК «Свірскі край»), даволі вялікая сацыяльная сфера, а таксама прадпрыемства дрэваапрацоўкі, участак дарожнай службы, электрасетак. Не надта багатая прапанова, аднак, як лічыць Віктар Субач, зарабіць на жыццё можна, было б толькі жаданне.

Ёсць катэгорыя людзей, якія ў любых умовах ухіляюцца ад працы і перабіваюцца выпадковымі заробкамі. А ёсць і моцныя гаспадары — гэтыя людзі трывала стаяць на нагах і забяспечваюць усім неабходным уласную сям'ю.

— Такія вяскоўцы ствараюць актыўны асяродак у глыбінцы — своеасаблівы цэнтр перспектыўнага развіцця тэрыторыі, — заўважае рэгіянальны каардынатар па Мінскай вобласці Праграмы падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі Дзмітрый Карпіевіч. — Неабходна ўсяляк спрыяць прасоўванню такіх ініцыятыў, пакольк ў выніку паляпшаецца дабрабыт мясцовага насельніцтва, якасць жыцця тутэйшых людзей. Чалавек пачынае разумець, што многае залежыць ад яго ўласнай жыццёвай пазіцыі, яго дзеянняў. Гэта стваральны пачатак, які дзейсна падтрымлівае пэўныя захады з боку ўлады.

Адна з такіх «пунктаў» развіцця на тэрыторыі Свірскага краю — вядомая многім вёска Камарова. Тут цяпер 589 жыхароў, большая частка з якіх — людзі ў працаздольным узросце. Станоўчы факт: у паселішчы больш за паўтары сотні дзяцей. Ёсць уся неабходная сацыяльная інфраструктура — гандлёвая сетка, адукацыйныя і медыцынская ўстановы, аддзяленне сувязі і інш. Так што большасць надзённых пытанняў людзі могуць вырашыць на месцы, не выязджаючы ў раённы цэнтр ці сталіцу. Тым больш да іх не крок ступіць — Камарова знаходзіцца на мяжы з Віцебшчынай і Гродзеншчынай, дзе злучаюцца Мядзельскі, Пастаўскі і Астравецкі раёны.

Сонечная батарэя пакуль экзотыка.

Здавалася б, сапраўдная глухмень. Але ёсць адна акалічнасць, якая вылучае гэтыя мясціны сярод іншых тэрыторый, — гэта край найпрыгажэйшых Блакітных азёраў. Падчас сезона адпачынку за кошт турыстаў колькасць насельніцтва значна павялічваецца. Узрос і попыт на нерухомасць: як паведаміў Віктар Субач, жыллё ў «прамой дасягальнасці» ад вадаёмаў ніколі не пустуе. Калі будынак выстаўляецца на продаж, то пакупнікі не прымушаюць сябе доўга чакаць. Кажуць, што падчас сезона тавараабарот мясцовых крамаў значна «плюсуе».

Як бачым, умовы для развіцця прыватнай ініцыятывы на Свіршчыне неблагія. Толькі ці ўдалося рэалізаваць гэты патэнцыял? Аказваецца, тут апошнім часам быў увасоблены шэраг цікавых праектаў. Амаль пяць гадоў таму (у снежні 2004-га) у Камарове адкрыўся Цэнтр вясковага прадпрымальніцтва. Ужо па назве арганізацыі — нешта нязвыклае для глыбінкі. Аднак падыход стаўся жыццяздольным.

— Мы выбралі тую ідэю, якая здольная аб'яднаць вакол сябе людзей, — кажа кансультант Цэнтра развіцця вясковага прадпрымальніцтва Эдуард Вайцяховіч. — На ўвасабленне першага праекта атрымалі невялікую суму — 500 долараў. Аднак гэта быў толькі пачатак. Разам з месцічамі актыўна заняліся добраўпарадкаваннем тутэйшага старажытнага парку. У выніку атрымалі першую прэмію з рук міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Гэта вялікі гонар і дадатковыя сродкі для развіцця тэрыторыі. Звярнулі на сябе ўвагу, даказалі, што можам рабіць справу, і таму нездарма першы дзень рэспубліканскага экалагічнага форуму, які праходзіў на Мядзельшчыне некалькі гадоў таму, праводзіўся менавіта ў Камарове. На падрыхтоўку да свята з дзяржаўнага бюджэту быў выдаткаваны 1 мільярд рублёў. Пачыналі з 500 долараў і ўжо праз непрацяглы час здолелі прыцягнуць на развіццё вёскі такую значную суму. Так што ініцыятыва мае рэальны вынік.

Камароўскі цэнтр развіцця вясковага прадпрымальніцтва за мінулы год атрымаў на рэалізацыю разнастайных праектаў каля 150 тысяч долараў. Тут цікавыя напрацоўкі ў развіцці энергетыкі ад аднаўляльных крыніц. Прасцей кажучы, гэта тыя энерганосьбіты, якія не трэба закупляць з-за мяжы. Іх «пастаўляе» сама прырода. Яшчэ ў панскія часы ў Камарове былі выкапаны дзве сажалкі. Працаваў вадзяны млын, які пасля доўгі час не выкарыстоўваўся па прызначэнні. Паколькі сажалкі знаходзяцца на розных узроўнях (адна ніжэй за другую), то ствараецца пэўны ціск вады. Раней гэты рэсурс выкарыстоўваўся для працы вадзянога млына. Зараз яго вырашылі прымяніць для патрэбаў міні-ГЭС. Гідраэлектрастанцыя, якую абуладкавалі з дапамогай замежных інвестараў, мае невялікую магутнасць — 3,5 кілават у гадзіну. Аднак для вёскі гэта канкрэтная карысць — электраэнергія, якая такім чынам выпрацоўваецца, выкарыстоўваецца для вулічнага асвятлення. Па маляўнічым парку можна шпацыраваць і ўвечары, не апасаючыся зламаць шыю. Абапал асфальтаваных сцяжынак — ліхтары, што сілкуюцца за кошт «вадзяной» электрычнасці.

Акрамя гідраэлектрастанцыі ў Камарове ўсталяваная і сонечная батарэя. Дакладней, гэта фотаэлектрычная ўстаноўка магутнасцю 2 КВт/гадз. Найбольшая прадукцыйнасць дасягаецца тады, калі сонечныя промні падаюць перпендыкулярна пласціне, якая ўмацавана на даху адміністрацыйнага будынка Цэнтра развіцця вясковага прадпрымальніцтва. Электрычнасць паступае ў агульную сетку. Узгаданыя энергетычныя праекты з-за невялікай магутнасці ўстановак з'яўляюцца хутчэй мадэльнымі. Але імі ўжо зацікавіліся ініцыятыўныя людзі — у прыватнасці, у Камарова прыязджалі фермеры і вывучалі досвед. У шэрагу месцаў неблагі «энергетычны» рэсурс вадаёмаў зусім не выкарыстоўваецца. Між тым, пры правільным прымяненні можна атрымаць адчувальны эканамічны рэсурс. Нездарма пераймать напрацоўкі імкнуцца людзі, якія прывыклі лічыць грошы.

Для ацяплення ў Камарове выкарыстоўваюцца газагенератарныя катлы, якія маюць вялікі каэфіцыент карыснага дзеяння. Для абагрэву жылля і адміністрацыйных будынкаў папулярнасцю карыстаецца драўніна. Так што задзейнічаны практычна ўвесь спектр мясцовых энергарэсурсаў. Магчыма, у найбліжэйшай перспектыве з'явяцца і ветракі. Як паведаміў Эдуард Вайцяховіч, нямецкія інвестары прапанавалі ўсталяваць у Мядзельскім раёне 10 такіх установак. Мяркуецца, што агульны аб'ём укладанняў складзе каля 12,5 мільёна еўра. Акрамя таго, замежныя партнёры зацікавленыя пабудаваць гідраэлектрастанцыю ў Свіры (магутнасцю 1 тыс. КВт/гадз.) з бюджэтам 20 млн еўра.

Паводле слоў Эдуарда Вайцяховіча, у Камарове мяркуецца адкрыць бізнэс-інкубатар. Гэта будзе практычны цэнтр, дзе ўсе ахвотныя змогуць атрымаць канкрэтныя навыкі для арганізацыі ўласнай справы. У планах — узвядзенне цэлага комплексу для адпачынку. Ужо цяпер у вёсцы працуюць кавярня і пякарня. Таксама ёсць сельскагаспадарчы ліцэй, выпускнікі якога, напэўна, больш ахвотна будуць звязваць сваю будучыню з вёскай. Паколькі ёсць падставы для таго, каб глыбінка з цягам часу станавілася ўсё больш прывабным месцам.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Мядзельскі раён.

Фота аўтара.

Вятрак пакуль дэкаратыўны, а хутка будзе сапраўдны.

Прыміце меры!

ВОСЕНЬСКАЕ АБВАСТРЭННЕ?

ТЭРМІНОВА ПАТРЭБНЫ ГРОШЫ НА ВОДАПРАВОД

Жыхары ўскраінных вуліц горада Барані ў ліпені звярнуліся ў пракуратуру і Аршанскі гарвыканкам, каб абараніць свае правы на забеспячэнне пітной вадой.

«Просім прыняць меры пракурорскага рэагавання ў сувязі з парушэннем нашых правоў як грамадзян Рэспублікі Беларусь і спажыўцоў пітной вады, бо на нашай тэрыторыі не выконваюцца патрабаванні Закона «Аб забеспячэнні пітной вадой» і іншых нарматыўных актаў, і тым самым ствараецца пагроза нашаму здароўю і жыццю».

Далей жыхары паведамлялі пра тое, што ліўневыя дажджы ў чэрвені падтапілі грунтовымі водамі грамадскія калодзежы па шасці вуліцах і завулках горада Барані. Забор пробаў, зроблены службамі Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, паказаў, што ў калодзежах у наяўнасці бактэрыяльнае, а ў некаторых і хімічнае забруджванне, якія перавышаюць дапушчальныя нормы для пітной вады. Пры такім становішчы на працягу лета не праведзена ачыстка шахтаў калодзежаў ад глею, не рамантуюцца стыкі кольцаў, праз якія і прасочваецца забруджаная грунтовая вада.

Напісалі людзі і пра тое, што праблема пітной вады ў іх мікрараёне востра стаіць з 2005 года. І штогод жыхарам абяцаюць пабудаваць водаправод, але не будуюць. Ліўневыя дажджы абвастрылі сітуацыю так, што трэба тэрмінова прымаць меры.

Пакуль жыхары Барані чакалі адказу з пракуратуры, прыйшло чарговае паведамленне з Аршанскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі за подпісам І. Бацюковай. У адказе пацвярджалася, што вада ў калодзежах не адпавядае пітной па хімічных і мікрабіялагічных паказчыках. Работы па ачыстцы і дэзынфекцыі вады не далі станоўчых вынікаў. У той паперы ёсць і такія радкі:

«На падставе гэтых фактаў і згодна з Законам РБ «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва» вынесена пастанова галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача г. Оршы і Аршанскага раёна аб забароне карыстання насельніцтвам грамадскімі калодзежамі ў г. Барані па вуліцах Калгаснай, Пралетарскай, Лясной, Чэрвеньскім і двух калгасных завулках. Неабходна праінфармаваць жыхароў пра тое, што з калодзежаў нельга браць ваду, і арганізаваць падвоз пітной вады на гэтыя вуліцы».

Праз некалькі дзён прыйшоў адказ і ад намесніка старшыні гарвыканкама С. Жалдзібаева.

«Праблема забеспячэння чыстай вадой будзе вырашана часткова ў верасні-кастрычніку гэтага года. Правядуць водаправод без разводных сетак з устаноўкай адной водаразборнай калонкі на вуліцы Калгаснай за кошт сродкаў прадпрыемства «Водаканал».

Прайшоў яшчэ месяц... Сапраўды, за кошт сродкаў прадпрыемства «Водаканал» правялі адну ветку водаправода і ўсталявалі ў верасні адну водаразборную калонку на вуліцы Калгаснай. Але адной калонкі на ўсе вуліцы і завулкі відавочна недастаткова. Таму жыхары іншых вуліц гэтага мікрараёна па-ранейшаму бяруць пітную ваду з калодзежаў, якія **афіцыйна закрыты санітарнай службай (!)**.

Старшыня Бараньскага гарвыканкама Васіль Русакоў пракаментаваў сітуацыю так:

— Сапраўды існуе сур'ёзная праблема з пітной вадой у названым мікрараёне. Там адпаведныя службы цяпер намагаюцца адрамантаваць калодзежы. Але гэта не выйсце са становішча. Калодзежы размешчаны ў нізіне, і туды пастаянна трапляе дажджавая вада і сцёкі. Іх рамонт не вырашыць праблемы: вада ўсё адно не будзе пітной. Трэба тэрмінова будаваць водаправод.

Бараньскі выканкам на працягу гадоў намагаўся давесці да ведама інстанцый «тэму» неабходнасці водаправода. Нарэшце летась гэта будаўніцтва ўключылі ў план. Праектная дакументацыя ёсць. Грошы на будаўніцтва водаправода павінны былі сёлета пералічыць з фонду аховы прыроды і навакольнага асяроддзя. Але ў маі з аблвыканкама прыйшло паведамленне, што сродкі на будаўніцтва гэтага аб'екта ва ўмовах агульнага скарачэння фінансавання не будуць выдзелены. У адказ з Аршанскага і Бараньскага гавыканкамаў дасланыя растлумачальныя лісты ў міністэрствы і Віцебскі аблвыканкам — аб важнасці і тэрміновай неабходнасці водаправода. Але пакуль фінансавання няма.

Вольга ШУТАВА.

У ВАЎКАВЫСКУ ХОЧУЦЬ «САБРАЦЬ» УСЮ ЛІНЕЙКУ ДЗІЦЯЧАГА ХАРЧАВАННЯ

130 спецыялістаў Міністэрства аховы здароўя, у тым ліку і практыкуючых дактароў, сабраліся на рэспубліканскі семінар «Аб ходзе рэалізацыі мерапрыемстваў Прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі» на 2006-2010 гг.». Семінар праходзіў у Ваўкавыску, на базе найбуйнейшага вытворцы сухіх прадуктаў для дзіцячага харчавання — ААТ «Беллакт». Пакуль удзельнікі семінара рабілі экскурсію па прадпрыемстве і слухалі лекцыю пра правільнае харчаванне дзяцей, генеральны дырэктар ААТ «Беллакт» Аляксей ГРЫТУСЕЎ расказаў журналістам пра вынікі дзейнасці прадпрыемства і планы на будучыню:

Генеральны дырэктар ААТ «Беллакт» Аляксей ГРЫТУСЕЎ.

— Мы задаволеныя дзейнасцю за 8 месяцаў, бо прадбачылі сітуацыю, якая будзе ў малочнай галіне. Нават прагноз экспартных цэнаў, які мы зрабілі ў сябе на прадпрыемстве, практычна на 90 % супаў з рэальнасцю, таму ўсе нашы фінансавыя паказчыкі знаходзяцца ў межах плана. Па выніках 8 месяцаў паказчыкі, скажам, не такія, як хацелася б, але ўсё адно дасягнуты рост таварнай прадукцыі недзе на ўзроўні 102 %, мы атрымалі прыбытак у гэтым годзе, плануем па выніках года атрымаць каля 6 млрд прыбытку. І гэта на фоне таго, што 80% малочных прадпрыемстваў у рэспубліцы стратныя.

Не так ужо і моцна, па словах генеральнага дырэктара, па прадпрыемстве ўдарыў так званы «малочны крызіс»:

— Што датычыцца экспарту ў РФ, то «Беллакт» нават да пачатку гэтага крызісу меў экспарт малочнай прадукцыі меншы, чым у сярэднім па Беларусі. Калі ў сярэднім беларускія малочныя прадпрыемствы пастаўлялі каля 90 % , то па «Беллакце» ў мінулым годзе гэтая лічба была каля 70 %, у гэтым — недзе 53 %, а па выніках года будзе яшчэ ніжэйшай.Таму закрыццё для нас рынкаў Расіі не прынесла асаблівых праблем. Па-другое, у структуры асартыменту сухое малако займае нязначную долю, а санкцыі ў першую чаргу тычыліся яго. Ну, і нарэшце, калі ў самым пачатку гэтага крызісу з'яviўся спіс прадуктаў, дапушчаных на расійскі рынак, у ім былі толькі прадукты «Беллакта», — кажа Аляксей Віктаравіч. — Гэта звязана з тым, што пры распрацоўцы прадуктаў мы вельмі шчыльна працуем з Расійскай акадэміяй навук, краіны СНД, заключаны кантракты з Нігерыяй і Егіптам, вядуцца перамовы па пастаўках у Кітай і В'етнам. Але гэта пастаўкі сухога малака, а Аляксей Грытусеў кажа, што асноўная мэта — усё ж такі экспартаваць не малако, а дзіцячае харчаванне.

Дарэчы, да канца 2011 года на «Беллакце» плануюць выпускаць усю лінейку дзіцячага харчавання, у тым ліку і вадкага. На сёння ж там выпускаюць толькі сухія сумесі, прычым з гіпаалергенных выпускаецца толькі «Беллакт-соя» для дзяцей, якія пакутуюць на неперанаснасць лактозы. Зараз клінічныя выпрабаванні ў цэнтры «Маці і дзіця» праходзіць новы гіпаалергенны прадукт на частковым гідралізаце сыраватачных бялкоў, які пры паспяховых выніках выпрабаванняў мусіць ужо ў канцы года з'явіцца на паліцах у крамах.

Нягледзячы на тое, што па некаторых пазіцыях падзенне цэнаў на прадукцыю склала да 50 %, «Беллакт» не збіраецца скарачаць інвестыцыі ў развіццё вытворчасці:

— Прадпрыемства не стаіць на месцы, для яго вельмі важна не спыняцца ў развіцці, таму мы пастаянна інвестуем у вытворчасць. З 2003 па 2009 год на мадэрнізацыю і абнаўленне вытворчасці інвеставана 24 млн долараў, у 2009 годзе — ужо каля 7 млн долараў, а на 2010-2011 гады нашая праграма прадугледжвае 16 млн долараў, — кажа генеральны дырэктар. — Для інвестыцый выкарыстоўваем замежныя крэдытныя лініі і ўласныя сродкі. А скарачэнне экспарту ў грашовым выражэнні на інвестыцыях не адаб'ецца, бо падае цана не толькі на нашу прадукцыю, а і на абсталяванне, якое нам трэба закупіць.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«НЕ КАЧАГАРЫ І НЕ ЦЕСЛЯРЫ — САНТЭХНІКІ МЫ...»

Яны ведаюць усё пра балгарку і перфаратар. З лёгкасцю могуць даць майстар-клас па карыстанні газавым і развадным ключом, а яшчэ раскажуць, як правільна чысціць фантаны. І калі ў вашай кухні з абодвух кранаў пацячэ гарачая вада, яны таксама змогуць дапамагчы.

Прафесія сантэхніка на сёння можа і не прэстыжная, але затое важная. І колькі б мы ні зараблялі, а калі жывём у шматкватэрным доме, то менавіта ад сантэхніка будзе залежаць наяўнасць вады ў нашай кватэры. Каб высветліць асаблівасці гэтай «мокрай» прафесіі, на адзін дзень я стаў вучнем-практыкантам у брыгадзе сантэхнікаў сталічнага ЖЭСа № 73.

Адзін сантэхнік вясны не робіць

ЖЭС, у які я завітаў, абслугоўвае квартал Мінска ў раёне праспектаў Любімава, газеты «Звязда», газеты «Правда» і вуліцы Голубева.

— Па вялікім рахунку жыллёвы фонд у гэтым квартале дастаткова вялікі — каля 140 пад'ездаў, — гаворыць **майстар па быце 73-га ЖЭСа Уладзімір КОРЗУН**. — Многія дамы стаяць ужо больш за трыццаць гадоў. У першую чаргу мы займаемся пытаннямі «цякучага» рамонту, усё, што датычыць сантэхнічнага інжынернага абсталявання ў падвале. Акрамя таго, у нашай кампетэнцыі і ўборка прыдамавой тэрыторыі. Але, зразумела, калі жыльцы тэлефануюць з просьбай павесіць люстру альбо змяніць змяшальнік, то мы таксама гэта робім. Звычайна на кожнага сантэхніка разлічана пэўная колькасць інструментаў. Зразумела, тую ж балгарку кожнаму сантэхніку не дасі: па-першае, не кожны дзень патрэбная, па-другое, не зусім танная. Таму на адзін участак выдаецца звычайна адна балгарка. Сярэдні ўзрост работнікаў па «цякучым» рамонце — 40-45 гадоў. Працуюць, вядома, і маладыя. Хоць іх і не шмат, але, як кажуць, было б жаданне.

Калі жаданне ёсць, занятак, як правіла, таксама знойдзецца. Працаваць з дзевяці ранку да шасці вечара. Перапынак на абед — гадзіна. Але гэта афіцыйна. Насамрэч, некаторыя сантэхнікі пакідаюць нумары сваіх сотавых жыльцам, каб тыя, калі якаясьці тэрміновая сітуацыя, адразу тэлефанавалі сантэхніку. І тады бывае праца і ў абед, і нават вечарам. Свой мабільны жыльцам пакідае і Аляксандр Навіцкі. У ЖЭСе № 37 сантэхнікам мужчына працуе толькі трэці год, а яго ўчастак ужо цалкам адрозніваецца ад ранейшага.

— Вось па гэтай трубе цячэ гарачая вада, а па гэтай — халодная, — праводзіць мне лікбез Аляксандр у цеплавузле аднаго з дамоў. — Тут раней часта паломкі здараліся, забіванне каналізацыі — пастаянна. Той сантэхнік, што перада мной за гэты дом адказваў, запусціў яго быў. Я вось пачысціў тут, там замазаў, гэта таксама прыладзіў я. Пад маёй адказнасцю 350 кватэр.

Аляксандр паказвае ўсё новыя і новыя механізмы ў цеплавузле і кожную рэч з матэматычнай дакладнасцю называе сваім імем. Ды так спраўна, што відаць адразу: чалавек — спецыяліст.

Звычайна дзень сантэхніка пачынаецца з прыёму заказаў — зранку дыспетчар перадае заяўкі, што паступілі ад жыльцоў на яго ўчастку. Да абеду трэба прайсціся па ўсіх кватэрах заяўнікаў. Пасля абеду — новая партыя. Звычайна, як кажа Аляксандр, заявак не надта шмат. Ад адной да пяці ў дзень, у залежнасці ад сезона. Восенню з пачаткам ацяпляльнага сезона — працы большае. Найбольш частыя «заказы» — замена і падключэнне ваннаў і ўнітазаў, замена трубаў на поліпрапілен, замена змяшальніка.

Пра «глухія» выклікі Аляксандр адказвае так:



«Курс маладога зваршчыка» для карэспандэнта «Звязды» ад Мікалая УСЦІНЧУКА.

— Выпадкі, калі заяўку зрабілі, а саміх няма дома? Бываюць, але рэдка: на 20 выклікаў «глухіх», можа, усяго адзін. Звычайна ж нас заўсёды старанна чакаюць, яно і зразумела — гэта ў інтарэсах самі жыльцоў. Калі ж тэлефануеш, а ніхто табе не адказвае, то афармляеш заяўку як «глухую».

Мой першы выхад на аб'ект разам з сантэхнікамі Аляксандрам Навіцкім і Ігарам Купічам прадугледжваў замену ванны. Муж і жонка — пажылая пара — вырашылі замяніць ванну на душавую кабіну. Кабіну ўжо купілі. Толькі не ў краме (там пры яе пакупцы адразу прапаноўваецца ўсталяванне), а ў прыватніка, які такімі паслугамі не займаецца. Спачатку жыхары кватэры хацелі, каб заменай занялася прыватная арганізацыя. Але там адмовілі, патлумачыўшы, што такія рэчы, як замена ванны, яны ажыццяўляюць толькі пры ўмове замены ўсяго ваннага комплексу: разам з унітазам і іншым. Зразумела, кошт такой «ветлівай» паслугі таксама адпаведны. У ЖЭСе за гэта бяруць танней. У выніку гаспадыня дома, параіўшыся з сантэхнікамі Аляксандрам і Ігарам, якія прыйшлі на выклік удвух, вырашыла пачакаць яшчэ два дні для высвятлення ўсіх абставінаў. Калі за гэты час яна не знойдзе ніякай альтэрнатывы, работу даручыць ім.

Раз заяўка, два заяўка...

Ад заяўкі да заяўкі праходзіць жыццё сантэхніка. І калі ўсе заяўкі выкананыя, можна адпачыць. Збочваем у бытоўку. Тут рабочыя перапранаюцца, пры выхадзе па заяўцы бяруць неабходныя інструменты.

На сценах бытоўкі — жыццесцвярджальныя плакаты з часоў савецкага мінулага: «Памятка газаэлектразваршчыка» і чорна-белыя малюнкі рабочых, якія, усе як адзін, усё выконваюць правільна: апрані акуляры перад зваркай, беражы зрок!

— Сантэхнікаў выклікаюць, як правіла, жанчыны, — працягваюць Аляксандр і Ігар Купіч. — Мужчынам часта сорамна проста. А так у прынцыпе нашу працу любы мужык у стане выканаць.

Расказалі мужчыны і пра тых, хто не плаціць.

— Калі жылец мае запазычанасць перад дзяржавай за два-тры месяцы, не аплачваючы камунальныя паслугі, то кватэры такіх жыхароў мы адключаем ад вады. Калі ў кватэры ёсць дзіця, то адключаем толькі гарачую ваду. А для таго каб гэта зрабіць, напачатку трэба адключыць ваду ва ўсім доме. Затым паступленне вады блакуецца ў канкрэтнай кватэры, пасля чаго вада пускаецца. У неплацельшчыкаў кран не працуе.

Наступны мой «паход па кватэрах» быў з Аляксандрам Навіцкім.

— Гэтая бабуля ўжо звярталася раней — у яе кватэры праблемы з унітазам, ён хістаецца. У мінулы раз я яго ўмацаваў, — гаворыць мой напарнік. — Гэтым разам буду замазваць гіпсам...

Гаспадыня (назавём яе Ірынай) сустрэла нас вельмі ветліва. Аляксандр, ужо спрактыкаваны ў такіх рэчах, адразу накіраваўся на агляд аб'екта.

— Вы казалі мне купіць дэталь, што раней сапсавалася. Я хадзіла ў краму, вось што яны мне далі, — Ірына працягнула Аляксандру кавалак белай гумы.

Параўнаўшы яго з арыгіналам, нават я адразу б сказаў, што набытая рэч зусім не з гэтай оперы.

— Вось жа народ — прадаўцы гэтыя, — абураецца Аляксандр. — Адно ў галаве: каб толькі чалавеку што-небудзь уцюрыць! А вы, Анатольеўна, мой план ім паказвалі? Дэталь гэтую з сабой бралі?

Аляксандр паказвае чорнае гумавае кольца, якое і павінны былі замяніць. У плане, які мой напарнік маляваў жанчыне, была абмалявана падрабязная схема дэталі: як яна павінна выглядаць, колькі сантыметраў у дыяметры, якой шырыні і г.д.

— Натуральна, паказвала. Ну, хай трымаюцца ў мяне! — абураецца Ірына. — Прыйду і скажу: «Дзе хочаце бярыце, а дайце мне такую, якую трэба. А гэту белую назад забірайце! Хай толькі не возьмуць, я ім пакажу!»

Аляксандр усміхаецца такой бурнай рэакцыі гаспадыні і працягвае, звяртаючыся да мяне: «Так, шчыра кажучы, прадаўцы ў той краме, дзе «атаварылі» Ірыну Анатольеўну, свой тавар ведаюць толькі на працэнтаў сорак. Гэта як спецыяліст я табе кажу...»

Прызнаюся, мяне таксама заўсёды здзіўляла, чаму ў тэхнічных крамах прадаўцы — спрэс дзяўчаты. Як высветлілася, мае перасцярогі мелі сэнс.

Пра Герасімаў у беларускіх дамах

Калі суседзі заліваюць адно аднаго, гэта яшчэ паўбяды. Куды больш складана, калі спыняецца праца каналізацыі. І калі ў першым выпадку сантэхніку дастаткова прыйсці і скласці акт аб заліцці, то ў другім — тэрмінова патрабуецца чыстка трубаў. Для гэтага існуе памочнік — адмысловая машына «Волма», якая нагнятае неабходную колькасць атмасфер у трубу і затор прабіваецца, не вытрымаўшы створанага ціску.

— Што становіцца прычынай забіванняў? Смецце. Часцей за ўсё гэта бываюць анучы: памыла гаспадыня ўнітаз анучай, выцягнула яе. А частка анучы засталася, так яе і змылі, — разважае Аляксандр. — Але самае незвычайнае было, калі прычынай забівання стала свіная костка. Гэта ўжо сапраўднае свінства з боку гаспадароў кватэр.

— Часам такія рэчы знаходзіш, што нават дзіву даешся: агуркі раз знайшоў, гаспадар ленаваўся, відаць, у сметніцу выкінуць. Яно і праўда: навошта сметніца, калі ёсць унітаз... — працягвае Ігар. — Быў выпадак і зусім жахлівы. Чысцім затор. Бачу — нейкія маленькія жывёліны. Ну, думаю, зноў недзе ў падвале пацукоў травілі, вось яны і вырашылі наталіць смагу, залезшы ў каналізацыю. Так і аддалі там канцы. І не на жарт спужаўся, бо калі гэта сапраўды пацукі, трэба выклікаць санстанцыю, каб правяла аналіз пітной вады: раптам мікробы якія?! Ат не, прыгледзеліся, бачым — шчаняты... Маленькія яшчэ, памерам акурат як пацук. Вы ўявіце, якімі людзьмі трэба быць, каб нядаўна народжаных шчанят спусціць ва ўнітаз?..

Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра

Мой трэці «паход» на аб'ект скончыўся, па сутнасці, нават не пачаўшыся. Калі з сантэхнікам Ігарам Купічам мы прыйшлі на выклік, высветлілася, што ўсё ўжо ў норме. Раней жыльцы скардзіліся на тое, што вада з абодвух кранаў цячэ аднолькавай тэмпературы — гарачая. Зараз жа высветлілася, што ўсё ў парадку.

— Выпадак, з нагоды якога першапачаткова мяне выклікала гэта сям'я — калі гарачая вада з абодвух кранаў лілася — тлумачыцца тым, што перагародка паміж двума кранамі стала непрыдатная, — тлумачыць мне, недасведчанаму, Ігар і працягвае: — А для таго каб высветліць прычыну, трэба абследаваць усе краны ў гэтым пад'ездзе і выявіць крыніцу паломкі. Калі яна знойдзена, за рамонтам затрымкі не будзе.

— Хочаш, магу паказаць, як зваршчыкі працуюць? — пытае Ігар, і праз хвіліну мы ўжо спускаемся ў падвал аднаго са шматпавярховікаў.

Ужо на падыходзе да падвала — лаз з надпісам «Цеплавузел», адтуль можна было пачуць гук працы зварачнага прыбора. Прыгінаемся і ўваходзім. Тут шмат трубаў — і ацяпленне, і каналізацыя, і водазабеспячэнне... На месцы ўжо працуюць слесар-сантэхнік Мікалай Усцінчук і газаэлектразваршчык Аляксандр Жаркевіч.

— Падцякала труба, вось і цыруем, — вось так мяне сустрэлі Мікалай і Аляксандр. — Работы выконваем якасна і ў мінімальны тэрмін.

А тэрмін гэты, як высветлілася пазней, стаў магчымым толькі дзякуючы самаахвярнай працы мужчын. Для таго, каб хутчэй скончыць зварачныя працы і каб у дом хутчэй пайшла вада, яны працавалі без абеду. У выніку ваду пусцілі на тры гадзіны раней, чым планавалася.

— У прынцыпе, асаблівай навукі не патрабуецца: паміж трубаў зашчыміўся і ляжы, — смяюцца мужчыны. — Толькі як каналізацыю прарве ці водапровад, даводзіцца ляжаць у вадзе...

* * *

Грамадзяне-жыльцы! Калі сёння ў вашым доме будзе адсутнічаць вада, набярыцеся цярпення. Газаэлектразварачныя работы альбо чыстка каналізацыі — гэта ўсё дзеля вашай жа карысці. Толькі надалей паменш старайцеся кідаць агуркі ва ўнітаз... Не гнявіце сантэхнікаў, памятайце: яны ведаюць усё пра перфаратар і балгарку!

Ілья ЛАПАТО.

Інваліды: хто яны?

У Беларусі будзе праведзены маніторынг становішча інвалідаў — пра гэта паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рыта СУШКО.

Маніторынг плануецца правесці ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Садзейнічанне Рэспубліцы Беларусь у далучэнні да Канвенцыі ААН па правах інвалідаў», пры гэтым абследаванне пройдзе ў два этапы: спачатку падчас спецыяльнага «пілотнага» праекта на тэрыторыі Баранавіцкага раёна, а затым — у агульнанацыянальным маштабе. У прыватнасці, у Баранавіцкім раёне будуць апытаныя 200, а ў межах усёй краіны — 5000 інвалідаў па ўсіх рэпрэзентатыўных групах. Асноўныя мэты маніторынгу — вызначыць прычыны інваліднасці, пол і ўзрост людзей з абмежаванымі магчымасцямі, вывучыць, наколькі яны могуць удзельнічаць у культурным і спартыўным жыцці, выслухаць меркаванні наконт стану безбар'ернага асяродка.

На падставе маніторынгу плануецца ацаніць, наколькі наша краіна гатовая да далучэння да Канвенцыі, а таксама распрацаваць рэкамендацыі па аптымізацыі дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да гэтай катэгорыі грамадзян з улікам іх рэальнай патрэбы. У прыватнасці, ёсць намер выкарыстаць вынікі даследавання падчас распрацоўкі Дзяржаўнай праграмы па паляпшэнні становішча інвалідаў на 2011—2015 гады, а, магчыма, таксама — і для змянення заканадаўства. Пры гэтым, нагадала Рыта Сушко, з 23 кастрычніка ў Беларусі пачнуць дзейнічаць змяненні і дапаўненні ў некаторых законах па пытаннях сацыяльнай абароны інвалідаў. Адна з адметных навацый у гэтым плане — увядзенне дадатковых стымулаў для грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў, якія маюць уласную вытворчасць, не толькі для стварэння, але і для захавання працоўных месцаў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Апроч таго, паведаміла Рыта Сушко, прынятае рашэнне аб інвентарызацыі ўсіх аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры на прадмет адпаведнасці стандартам па стварэнні безбар'ернага асяродка. Напрыклад, стандартамі вызначаныя пэўныя градус пандусаў, вышыня борцікаў, дыяметр поручня. Аднак, канстатуюць у міністэрстве, часам гэтыя патрабаванні не вытрымліваюцца, а адсюль вынік — нягледзячы на абсталяванне сацыяльных аб'ектаў і жылля спецпрыстасаваннямі, у рэальнасці карыстацца імі інваліды не могуць. «Часта даводзіцца чуць, што выкананне стандартаў немагчымае чыста тэхнічна, аднак падобныя спасылкі — слушныя не заўсёды, — заўважыла Рыта Сушко. — Сапраўды, можна пагадзіцца: пашырыць тую ж ліфтавую шахту пад габарыты каляскі ў дамах старой пабудовы часам нерэальна. Аднак праблему можна вырашыць іншым чынам — скажам, дзякуючы часовым прыстасаванням, якія дазваляюць чалавеку на каляскі спускацца і падымацца па лесвічных маршах».

Дарэчы, статыстыка сведчыць, што ў пачатку жніўня ў Беларусі налічвалася 507 тыс. інвалідаў — гэта на 1,3 тыс. чалавек менш, чым у пачатку года. Разам з тым, тут прасочваюцца некаторыя новыя тэндэнцыі. Як зазначыла Рыта Сушко, апошнім часам у краіне назіраецца змяншэнне колькасці дзяцей-інвалідаў і інвалідаў у працаздольным узросце, і ў той жа час колькасць інвалідаў у пенсійным узросце расце.

Сяргей ГРЫБ.

У шэрых фарбах

«Анімаёўка-2009» прадэманструе творчую разнастайнасць рэжысёраў-мультыплікатараў.

Сёння, 24 верасня, у Магілёве ўрачыста распачнецца XII Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў, дзе публіка ўбачыць новыя і лепшыя творы для дзяцей і дарослых.

Сёлета 24 студыі з 16 краін свету прапанавалі каля сотні мультфільмаў. З іх на конкурс адабраныя 42 рэжысёрскія працы. Акрамя краін — былых савецкіх рэспублік, у фестывалі бяруць удзел анімататары з Ірана, Кітая, Польшчы, Германіі і Францыі. У конкурсе ёсць стужкі беларускіх рэжысёраў, і, што асабліва прыемна, выкананыя на роднай мове.

Старшыня журы «Анімаёўкі-2009» — Леанід Носыраў, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі і выкладчык Усерасійскага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі. Лепшыя творы атрымаюць спецыяльныя прызы — «Крыштальныя алоўкі».

Канкурэнцыя сярод удзельнікаў конкурсу вялікая: адны аддаюць перавагу маляўнічым і добрым дзіцячым мультыкам, іншыя — філасофскім прыпавесцям, часта выкананым у чорна-бела-шэрых фарбах. Першыя дораць радасць успрымання жыцця, другія заклікаюць да роздуму над праблемамі чалавецтва. Фестываль будзе доўжыцца тры дні: кінапаказы арганізаваныя не толькі ў абласным цэнтры, але і ў сельскіх раёнах і аграгарадках Магілёўшчыны.

Ілона ІВАНОВА.

Крымінал, здарэнні

ДТЗ НА ПЕРАХОДЗЕ

Днём у Мінску п'яны кіроўца аўтамабіля на пешаходным пераходзе збіў 61-гадовую жанчыну.

Паводле звестак аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, 35-гадовы мужчына не толькі сеў за руль, заліўшы за каўнер: ён да таго ж не меў і вадзіцельскага пасведчання. У выніку на вуліцы Кальварыйскай пад колы «Опеля Асконы», на якім раз'язджаў парушальнік, трапіла жанчына — яна пераходзіла дарогу па рэгуляваным пешаходным пераходзе на дазвольным сігнал святлафора. Пацярпелая загінула на месцы здарэння.

Ігар ГРЫШЫН.

У П'ЯНЫМ ЗАПАЛЕ ЛАМАЛІ СМЕТНІЦЫ І АГАРОДЖУ

Два навучэнцы каледжа з Пінска напіліся і пачалі ламаць металічныя сметніцы па вуліцы Дняпроўскай флатыліі. Відаць, сілаў і энергіі ў 18-гадовых юнакоў было многа, калі за гадзіну-другую знішчылі 13 вулічных пасудзінаў для бытавых адходаў. Хуліганы затрыманыя.

Тым часам п'яны 21-гадовы жыхар вёскі Гута паламаў пяць плітаў з дэкаратыўнай агароджы Лыскаўскай школы Пружанскага раёна. У абодвух выпадках заведзена крымінальная справа. Вінаватым давядзецца кампенсаваць урон.

Кар. «Звязды».

НУ, ВЕЛЬМІ БЫЎ ПАТРЭБНЫ

посуд злодзею, які ў вёсцы Малевічы праз незачыненае акно ўлез у дачны дом жыхара Жлобіна. Здабыткам сталі 2 кубкі, 4 лыжкі і кухонны нож. Затое міліцыянерам невядомы пакінуў «на памяць» свае адбіткі пальцаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЭКСКАВАТАРНАЯ ПРАГУЛКА

Калі катацца — дык толькі на экскаватары, — вырашыў 54-гадовы непрацуючы жыхар вёскі Чырвоная Слабада Акцябрскага раёна.

Мужчына скарыстаўся адсутнасцю вартавога на тэрыторыі ПМК-109 і асядлаў вялізнага «жалезнага каня», на якім здзейсніў паездку па акаліцы. Калі накатаўся, вярнуў машыну на былое месца. Цяпер суд будзе вырашаць, на колькі пацягнуць забаўкі з машынкай дарослага хлопчыка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НАПІЎСЯ І ЗАКУСІЎ

Нехта праламаў дах у краме в. Яцвязь (Баранавіцкі раён) і вынес адтуль гарэлку, піва, каўбасу...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О СКУПКЕ АКЦИЙ

Наименование и местонахождение покупателя акций	Производственно-торговое закрытое акционерное общество «БелГАЗавтосервис», 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 25, к. 306
Наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются	Открытое акционерное общество «Автотаксосервис», 220014, г. Минск, ул. Путейская, д. 11
Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель	501105 (пятьсот одна тысяча сто пять) простых (обыкновенных) акций
Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции	3000 (три тысячи) рублей
Сроки, форма и порядок оплаты акций	согласно договору
Дата начала и окончания покупки акций	с 01 октября 2009 г. по 02 ноября 2009 г.
Все сделки будут заключаться только на биржевом рынке.	

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 32 (321)

Сваё насенне баклажанаў

Насенне гэтага паўднёвага госця (баклажанаў) можна атрымаць у хатніх умовах. Для гэтага на расліне пакідаюць па 1-2 баклажаны да верасня. Да гэтага часу плады фіялетавых гатункаў робяцца карычнева-жоўтымі. Зрэзаныя плады дадаткова даспельваюць пры пакаёвай тэмпературы на працягу месяца. Затым іх разразаюць і дастаюць насенне без мякаці. Выдзеленае насенне высушваюць на газеце або на чыстай тканіне.

Асарці з насення аднагадовых кветак

Хоць яшчэ ласкава грэе сонейка, але не трэба забывацца, што лета скончылася. У садзе пануе такое мноства фарбаў, што не хочацца верыць, што гэта да першых замаразкаў, якія не за гарамі. Многія кветкі, якія цяпер, нічога не падазраючы, радасна раскрываюць свае пялёсткі ў сонечныя абдымкі, ад першага ледзянога дыхання завянуць, пачарнеюць. Як жа захаваць гэтую прыгажосць на наступны год?

На жаль, насенне можна атрымаць не з любой расліны. Прычына не ў тым, што ў раслін, асабліва, якія цвітуць позна, насенне не паспявае завязацца. Часцей бывае наадварот, насення вельмі многа, але збіраць яго не варта. Гэта перш за ўсё датычыцца гібрыдаў, у іх яшчэ пазначана на пакеціку, з якога вы сеялі ў градку, «F1». Дык вось з такіх кветак насенне збіраць не варта. Адны гібрыды ўвогуле не ўтвараюць насення, другія — хоць і ўтвараюць, але яно не ўзыходзіць, а ў трэціх — увогуле насенне дае такую сумесь, якая зусім не падобная на сваіх бацькоў, ці, як у народзе кажуць, «ні ў маці ні ў бацьку, а ў праезджага дзядзьку», а вы толькі будзеце здзіўляцца і засмучацца.

Калі ж на пакеціках з насеннем побач з назвай культуры пазначана «гібрыдная», але не стаіць значок «F1», гэта просты гатунак, атрыманы ад скрыжавання розных відаў, то з яго можна смела збіраць насенне. Каб кожную вясну не шукаць у краме той гатунак, які спадабаўся, пакіньце насенне са сваіх кветак. Галоўнае ведаць, як і калі збіраць насенне. Пераважная большасць аднагадовых кветак перакрыжаванаапыляльныя. Да самаапыляльных кветкавых раслін адносяцца духмяны гарошак, дэкаратыўная фасоля, астра аднагадовая. У іх лёгка падтрымліваць чысціню гатунку. Вось чаму перад зборам насення вы можаце разлічваць, якія кветкі могуць даць чыстае насенне, характэрнае гэтаму гатунку.

Якасць кветкавага насення таксама залежыць і ад своечасовага збору, і ад надвор'я ў час іх выспявання. З большасці раслін насенне лепш збіраць у сухое надвор'е. Гэта асабліва важна для прадстаўнікоў сям'і астравых, таму што іх кошыкі пры высокай вільготнасці загніваюць. А вось насенне, якое знаходзіцца ў стручках, каробачках, што могуць растрэскацца, пажадана ўбіраць у сырое надвор'е, пакуль расліны вільготныя. Пасля замаразкаў ёсць сэнс збіраць насенне, якое добра выспела і падсохла, а недаспелыя і вадзяністыя зусім непрыдатныя. У многіх раслін усходжасць насення пасля ўздзеяння адмоўных тэмператур паніжаецца.

А цяпер канкрэтна аб зборы насення з розных аднагадовых кветак.

У **акасамітак**, калі засохнуць пялёсткі і абгортка-«стаканчык» пажаўцее, суквецці зрываюць. У дажджлівую восень насенне хутка загнівае з-за павышанай вільготнасці, таму калі пялёсткі завянуць, найбольш буйныя суквецці абрываюць для даспявання.

У **астры** абрываюць кошыкі, на якіх пялёсткі завялі, і ў сярэдзіне з'явіўся пушок. Насенне астраў добра даспяваецца, таму кошыкі можна зрываць адразу пасля таго, як пялёсткі завянуць.

У **браткоў** буйныя, светлыя каробачкі, якія разгарнуліся ўверх, збіраюць не радзей чым два разы на тыдзень, інакш яны пачнуць растрэскацца, а насенне разлятацца.

У **бальзаміна** пасвятлелыя мясістыя плады-каробачкі зрываюць вельмі асцярожна, таму

што яны могуць растрэскацца прама ў руках.

У **вяргіні** аднагадовай (вясёлыя рабяты) абрываюць па меры выспявання падсохлыя плодзікі, падобныя на невялікія шышачкі. Перад замаразкамі зрываюць і зялёныя плодзікі — іх насенне можна даспяваць.

У **вербены** збіраюць каробачкі, якія пабурэлі і падсохлі, або зразаюць расліну цалкам.

Ільвіны зеў, калі ніжнія каробачкі пабурэюць і ў іх адкрыюцца насенныя адтуліны, зразаюць цалкам. Пры гэтым насенне ў каробачках, размешчаных вышэй на суквецці, добра даспявае, можна абрываць і адзіночныя каробачкі, якія падсохлі.

У **духмянага гарошку** выбарачна ў некалькі прыёмаў знімаюць пажоўклыя бабы, якія пачынаюць падсыхаць. Спелыя бабы здольныя растрэскацца, а насенне разлятацца ў розныя бакі.



У **мальвы**, **дэльфініума** ёсць дзве магчымасці: плодзікі з карычневым або чорным насеннем абрываюць выбарачна або пры выспяванні большасці насення цалкам зразаюць усю расліну.

У **настуркі** выспелыя плады лёгка абсыпаюцца на зямлю і іх збіраюць прама пад раслінамі. Абрываць можна толькі тыя «арэшкі», якія слаба трымаюцца на пладаножцы і пры лёгкім дакрананні асыпаюцца. У дажджлівае надвор'е насенне на зямлі прарастае, таму яго збіраць нельга. Пасля замаразкаў нявысахлае, зялёнае насенне настуркі гіне.

У **петуніі**, **партулака**, **эшшольцыі**, **духмянага тытуню** падсохлыя і пабурэлыя стручкі і каробачкі знімаюць па меры выспявання.

У **сальвіі** сухія каробачкі з пацямнелым насеннем абрываюць выбарачна.

У **цыніі**, калі кошыкі пабурэюць і падсохнуць, іх выбарачна абрываюць, аддаючы перавагу найбольш буйным.

Ды ён проста чэмпіён

У розных краінах перац называюць па-рознаму: у Іспаніі — піменто, у Італіі — пероне, у Балгарыі — папрыка. У Перу яго называюць — чылі, г.зн. вогненныя (або чырвоныя). Менавіта чылі цяпер прынята называць усе пякучыя перцы. Параўнальна нядаўна вырошчванне перцаў у Беларусі лічылася ледзь не экзотыкай. Цяпер жа агароднікі пераканаліся, што гэты смачны і вітамінны прадукт можна з поспехам вырошчваць не толькі ў цяпліцах, але і ў адкрытым грунце.

Пра тое, што па ўтрыманні вітаміну С (да 400 мг) перац салодкі сапраўдны чэмпіён сярод агародніны, цяпер ведаюць усе. Гэтага вітаміну ў яго не менш, чым у чорных парэчках, і нават больш, чым у лімонах. У пладах перцу накопліваецца да 16 мг караціну, столькі, як і ў моркве, багаты ён на фоліевую і нікацінавую кіслоты, солі кальцыю, магнію, жалеза. У чырвоным перцы многа руціну (300—400 мг).

Ужыванне спелых пладоў стымулюе выдзяленне страўнікавага соку, паляпшае апетыт і страваванне, аднаўляе сілу пры стомленасці. Сок і настойка салодкага перцу з'яўляюцца добрым супрацьцынгавым сродкам. Перац уваходзіць у склад мазі, якая прымяняецца пры абмаражэнні.

Японскія вучоныя лічаць, што ўжыванне ў ежу «жоўта-зялёнай» агародніны, да якой адносіцца і перац, падаўжае жыццё і зніжае верагоднасць захворвання на рак.

Скарбонка дачнага досведу

- На садовых участках трэба пад кожнае дрэва пакласці з восені кавалак абпаленага лямцу (войлока), мышы не любяць такога паху і не аб'ядаюць дрэвы.
- Пры выкарыстанні ў якасці мульчы рэзанай саломы ў глебу трэба дадаткова ўносіць азотныя ўгнаенні для кампенсацыі стратаў азоту ў працэсе разлажэння саломы. Па гэтай жа прычыне саламяную мульчу перад перакопкай глебы трэба згрэбці і перакопваць не абавязкова. Пакідаць салому пад ягаднымі кустамі не пажадана.
- Каб абясшкодзіць глебу пасля выкопвання расліны, паражонай нематодай, можна паліць глебу перад пасадкай іншых раслін настоем хрэну. Каб зрабіць такі настой, трэба 50 г сушанага лісця і каранёў хрэну здрабніць, заліць 1 л вады і настойваць не менш як суткі. Настоем вялікай канцэнтрацыі можна апырскі карані пасаджанай расліны.
- Каб захаваць часнок, пакладзіце яго ў добра высушаны мяшок з матэрыі, папярэдне нацёрты знутры вільготнай кухоннай соллю ці змочаны солевым растворам. Мяшок з часнаком не завязваюць. Соль забірае лішнюю вільгаць, згубна дзейнічае на шкоднікаў, якія зімуюць у галоўках, не дае размнажацца грыбам і гніласным бактэрыям.
- Цікавы досвед некаторых гаспадынь, якія перад закладкай на захоўванне цыбулі доўга, да сутак, праграваюць яе ў натопленай, але ўжо астываючай печы пры тэмпературы 40—50 градусаў. Такая прагрэтая цыбуля, кажуць, не прарастае на працягу ўсёй зімы.
- Калі на вашым участку хрэн ператварыўся ў злоснае пустазелле, падкапайце яго кусты, зрэжце лісце, карані з каранёвай шыйкай, а на корань, які застаўся ў зямлі, насыпце крыху кухоннай солі — хрэн згіне.
- Адрозніць высокавітамінную шыпшыну ад нізкавітамінной можна па чашалісціках, размешчаных на вярхушцы плода. У высокавітамінных гатункаў яны размешчаны вертыкальна, а вось у нізкавітамінных канцы чашалісцікаў апушчаны ўніз і прыціснуты да сценак пладоў.
- Перад закладкай на захоўванне яблыкі і грушы кожнага гатунку перабіраюць, усе пашкоджаныя хваробамі і шкоднікамі плады адкладваюць для больш хуткага выкарыстання, астатнія сартуюць па памерах (буйныя, сярэднія, дробныя), затым асобна ўпакоўваюць. Вядома, што чым буйнейшы плод, тым раней ён выспявае, і захоўваць яго разам з астатнімі цяжэй. Лепш захоўваюцца сярэднія па памерах плады.
- Лясны папаратнік арляк — добры антысептык, можа надзейна захоўваць плады ад псавання. Слоем папаратніку абкладваюць дно і сценкі скрынкі для захоўвання, пераслойваюць ім і самі плады, укладзеныя пладаножкамі ўверх.
- Сухім лісцем рабіны перакладваюць клубні бульбы, пакінутай на захоўванне, — яны засцерагуць яе ад паршы, гнілі, ранняга прарастання.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ТВОРЫ ЧЫТАЧОЎ

М. Быкаў (Баранавіцкі раён)



Белыя: Крh4, Фg1, Лc5, Лc6, Сb1, Сg3, Кg2, Кg5 (8).
Чорныя: Крf5, Фa1, Лb3, Лb4, Сa6, Сb2, Кe5, Кh6, пп. e3, e4 (10).
Мат за 2 хады.

В. Разінкін (Мінск)



Белыя: Крe1, Лb6, Сg7, п. c2 (4).
Чорныя: Крa2, пп. a3, e2 (3).
Мат за 5 хадоў.

Чакаем вашых адказаў.

Прозвішчы чытачоў, якія прышлюць правільныя рашэнні, будуць апублікаваныя.

ПРАВЕРЦЕ СВАЕ РАШЭННІ

Эцюды В. Жука і В. Тупіка, якія былі апублікаваны ў газеце за 1 верасня г.г., рашаюцца наступным чынам:

I. 1. Лf2! Сa6+ 2. b5 Крa3 3. Лf3+Крa4 4. Лe3 С:b5+ 5. Крc5 Кр:a5 6. Лa3+ Сa4 7. Лa1 e1Ф 8. Л:e1 С~9. Лa1+ Сa4 і белыя выйграюць.

II. 1. Лg1 Кc3+ 2. Крd3 b1Ф 3. Л:b1 К:b1 4. Кd4 Сd7 5. Крc2 Кa3+ 6. Крc3 Крb6 7. Крb4 Кb1 8. К:b5 С:b5 — пат.

ВЫЙШЛІ ПЕРАМОЖЦАМІ

Падведзены вынікі масавага конкурсу рашэнняў шахматных кампазіцый. Як бачна, час летніх водпускаў паслужыў прычынай таго, што не ўсе яны давялі спаборніцтва да канца. Многія ўдзельнікі чамусьці пасярод конкурсу спынілі свой удзел пасля першага ж «праколу». На жаль, шмат адказаў было афармлена з хібамі, не ўказваліся ідэйныя варыянты, а ў эцюдах рашэнні не даводзіліся да канца і не прыводзіліся мацнейшыя хады абароны за чорных. Але ў цэлым конкурс прайшоў паспяхова.

Пераможцамі прызнаны Юрый Бандарэнка (Магілёў), які набраў найбольшую колькасць ачкоў — 101; на другім месцы Пётр Шчамялёў (Бялыніцкі раён) — 99 ачкоў, на трэцім — Віктар Быкаў (Мінск) — 98 ачкоў. Прызы пераможцам — падпіска на газету «Звязда». Ганаровыя граматы атрымаюць Анатоль Дарашэнка (Мінск) — 95 ачкоў, Анатоль Прынеслік (Віцебск) — 92 ачкі і Міхаіл Балянкоў (Рагачоўскі раён) — 91 ачко.

Астатнія ўдзельнікі набралі менш за 60 ачкоў.

Увага!

Будзе забаронены рух па трасе Брэст — Мінск

25 верасня з 9.00 да 16.00 па тэхнічных прычынах будзе забаронены рух транспарту на ўчастку аўтамабільнай дарогі М-1/Е-30 Брэст (Казловічы) — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі з км 332 (развязка з аўтамабільнай дарогай Р-1 Мінск—Дзяржынск) па км 347 (развязка з аўтамабільнай дарогай Р-23 Мінск—Мікашэвічы). У сувязі з гэтым, як паведамілі ў **Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі**, будзе забаронены з'езд з аўтамабільнай дарогі Р-1 на аўтадарогу М-1 у кірунку мяжы Расійскай Федэрацыі, з дарогі Р-23 у накірунку Брэста, а таксама рух у накірунку Брэста да развязкі з аўтадарогай Р-23. Аб'езд закрытага ўчастка ажыццяўляйце па аўтамабільных дарогах Р-1 Мінск-Дзяржынск, М-9 Кальцавая дарога вакол Мінска, Р-23 Мінск—Мікашэвічы і Р-65 Заслаўль—Дзяржынск—Возера. Звяртайце ўвагу на дарожныя знакі, якія будуць усталяваны перад пачаткам аб'ездаў, яны пакажуць маршрут.

У руху цягнікоў — змяненні

28 верасня з руху здымаюцца электрацягнікі: Мінск-Пасажырскі — Асіповічы адпраўленнем у 14.03 і Асіповічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 10.31.

Паводле інфармацыі Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, 29 і 30 верасня электрычка Мінск-Пасажырскі — Асіповічы адпраўленнем у 13.17 будзе курсіраваць па маршруце Пухавічы — Мінск-Пасажырскі. 29 верасня электрацягнік Асіповічы — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем у 14.53 прызначаецца ў зносіны Пухавічы — Мінск, Інстытут культуры.

Таксама ў гэты дзень здымаюцца прыгарадныя цягнікі Круляўшчызна — Полацк адпраўленнем у 10.54 і Полацк — Круляўшчызна адпраўленнем у 8.54. А дызельны цягнік Маладзечна — Круляўшчызна — Полацк адпраўленнем у 8.30 29 верасня будзе ісці да станцыі Круляўшчызна, а далей да станцыі Паставы, адпраўленне з Круляўшчызны ў 10.54, прыбыццё ў Паставы ў 12.48. 30 верасня электрацягнік Асіповічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 13.33 пойдзе па маршруце Рудзенск — Мінск-Пасажырскі.

1 кастрычніка электрычка Мінск, Інстытут культуры — Орша адпраўленнем у 10.42 прызначаецца на маршрут Мінск, Інстытут культуры — Крупкі, а электрацягнік Орша — Мінск-Усходні адпраўленнем у 11.47 будзе курсіраваць па маршруце Крупкі — Мінск-Усходні, адпраўленне з Крупак у 13.50, прыбыццё на Мінск-Усходні ў 16.01.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Тралейбус «Белкамунмаша» прызнаны лепшым

Тралейбус УП «Белкамунмаш» мадэлі АКСМ 321 прызнаны лепшым тралейбусам года па выніках міжнароднага аўтатранспартнага форуму «МАФ-2009», які прайшоў 15—18 верасня ў Маскве. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення па маркетынгу і продажах прадпрыемства Аляксандр Вечар.

Гэту мадэль вызначаюць нізкая падлога, транзістарная сістэма кіравання цягавым рухавіком пераменнага току, што зніжае спажыванне электраэнергіі да 35 працэнтаўДля зручнасці пажылых людзей і самых маленькіх пасажыраў для ўваходу ў тралейбус спраектавана сістэма паніжанай падлогі, а для пасажыраў з абмежаванымі магчымасцямі прадугледжаны і пандус.

БЕЛТА.

Крымінал

СХАВАЎСЯ І... ПАПАЎСЯ

Жыхарка з вул. Ціміразева ў Баранавічах адразу ж выклікала міліцыю, калі ўбачыла, што ў верандзе яе дома выбіта акно. Аператыўная група блакіравала дом і пачала аглядаць пакоі. У адным з іх і схаваўся злодзей — залез пад крэслы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«ТУЙНЫХ» СПРАЎ МАЙСТРЫ

Хутчэй за ўсё, пад заказ «працуюць» зладзеі, якія выбіраюць выключна нядаўна высаджаныя прыгожыя шарападобныя туі. Чатыры такія дрэўцы былі вырытыя ля дома па вуліцы 9-й Іншагародняй і столькі ж — ля помніка Андрэю Грамыку ў самым цэнтры Гомеля. Між тым, кошт такога дрэўца — больш за 100 тыс. руб.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«Гербы населеных пунктаў Гродзенскай вобласці — сапраўдная гісторыка-культурная каштоўнасць»

Геральдычныя сімвалы

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 450 ад 9 верасня былі зацверджаны афіцыйныя геральдычныя сімвалы адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Гродзенскай вобласці: сцяг горада Ліды, сцяг горада Слоніма і Слонімскага раёна, герб і сцяг вёскі Цырын Карэліцкага раёна. Сёння даўні госць «Звязды» — галоўны спецыяліст аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, сакратар Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук Марына ЕЛІНСКАЯ — пазнаёміць чытачоў з гісторыяй саміх гэтых гістарычных сімвалаў, а таксама раскажа пра тое, як вялася праца, што папярэднічала з'яўленню ўказа кіраўніка дзяржавы.

ЛІДА. ПРАЦЯГ ТРАДЫЦЫЙ

Напачатку трэба зазначыць, што ўсе тры гербы — Ліды, Слоніма і Цырына — гістарычныя. Толькі два першыя былі зарэгістраваныя ў Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь яшчэ да з'яўлення Геральдычнага савета. У прыватнасці, герб Ліды быў зарэгістраваны 30 мая 2002 года, таму мы сёння ўпершыню раскажам пра яго.

Згодна з апісаннем, герб уяўляе сабой барочны шчыт, вертыкальна рассечаны на дзве паловы. У правым полі (нагадваем зноў, што шчыт заўсёды разглядаецца з боку шчытаносца) чырвонага колеру выява залатога льва, які стаіць на задніх лапах, павернуты ўправа, у левым, блакітным, — два перакрыжаваныя залатыя ключы.

Ліда атрымала Магдэбургскае права 17 верасня 1590 года. Прывілей падпісаў Сігізмунд III. 6 красавіка 1845 года Мікалаем I быў зацверджаны Лідскі павятовы герб. Ён уяўляў сабой шчыт, падзелены на дзве паловы. У верхняй быў герб Віленскай губерні: «у барвовым шчыце, на сярэбраным кані, сярэбраны ўзброены вершнік (пагонь) з узнятым мячом і шчытом, на якім асьмікутовы барвовы крыж... У ніжняй (палове), у зялёным полі, сноп хлеба і серп, у знак таго, што жыхары Лідскага павета займаюцца выключна земляробствам».

1.

Але ў нашы дні мясцовыя ўлады пасля старанная вывучэння гісторыі свайго горада і яго геральдычных сімвалаў спыніліся на больш раннім з іх.

— І гэта было цалкам справядлівае рашэнне, — гаворыць Марына Елінская. — Герб канца XVI стагоддзя мае гісторыка-культурную каштоўнасць разам з такімі геральдычнымі помнікамі Гродзенскай вобласці, як гербы Гродна, Ваўкавыска, Навагрудка, Слоніма і іншых беларускіх гарадоў. Герб Ліды — адзін з нямногіх беларускіх тэрытарыяльных геральдычных сімвалаў, што налічвае больш чым чатырохсотгадовую гісторыю. Ён годна працягвае развіццё заходнееўрапейскіх геральдычных традыцый.

Усе элементы герба традыцыйныя для тэрытарыяльнай геральдыкі Заходняй Еўропы таго часу. Так, на гербе Вроцлава прысутнічае леў Багеміі і арол Сілезіі. Львы адлюстраваныя на гербах Анжу, Фландрыі, Нармандыі і іншых французскіх гербах. Іх жа мы бачым на нямецкіх зямельных гербах.

Ключы таксама даволі часта выкарыстоўваюцца ў геральдыцы, бо гэта сімвал, які мае надзвычай шырокае тлумачэнне. Згодна з паданнем, Ісус уручыў ключы апосталу Пятру: адзін — ад нябеснага царства, брамы раю, другі — ад пекла. На некаторых гербах адзін ключ адлюстроўваўся залатым, а другі — сярэбраным, прычым першы абазначаўся як «звязвальны», другі — як «дазвольны». Два ключы, як атрыбут апостала Пятра, мы бачым на гербах Малеча і Барысава. Ключы адлюстраваныя на гербах Брэмена, Рэгенсбурга, Штадэ і іншых заходнееўрапейскіх гарадоў. Перакрыжаваныя ключы з характэрнай гатычнай канфігурацыяй, з характэрным жа галаўным уборам рымскіх папаў з'яўляюцца складанай часткай герба Ватыкана.

Нядаўна зацверджаны сцяг горада Ліды па традыцыі з'яўляецца трансфармацыяй герба з выкарыстаннем яго асноўных колераў.

СЛОНІМ. АДЗІН З ГЕРБАЎ-СІМВАЛАЎ

Герб гэтага горада быў зарэгістраваны ў Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь яшчэ раней — 28 мая 1998 года. На ім мы бачым у блакітным полі барочнага шчыта залатога льва, які трымае ў лапе двайную сярэбраную стралу — герб «Ліс».

У XVI стагоддзі Слонім быў павятовым цэнтрам Навагрудскага ваяводства. У 1531 годзе кароль польскі і вялікі князь ВКЛ Жыгімонт I Стары падараваў гораду Магдэбургскае права. Права на самакіраванне было пацверджана ў 1591 годзе Жыгімонтам III Вазам, і ў тым жа годзе горад атрымаў свой герб.

2.

Ён па сваім сюжэце пераклікаецца з гербам Ліды, які горад атрымаў на год раней ад таго ж манарха. У Слонімскім гербе залаты леў трымае ў лапе герб «Ліс». Тлумачыцца гэта, верагодна, тым, што з 1586 года Ліда належала канцлеру Вялікага Княства Літоўскага Льву Сапегу. У княжацкага роду і быў вышэйназваны герб, які, згодна з польскім і рускім гербоўнікам, уяўляў сярэбраную дзіду ці белую стралу, пакладзеную ў чырвоным полі і перакрыжаваную двума белымі перакладзінамі накшталт сякер. У кляйнодзе была змешчана палова выходзячай лісы, павернутай улева. Герб «Ліс» вядомы з 1058 года і належаў нейкаму высакароднаму воіну, які вылучыўся ў бітве з яцвягамі і ў якасці ўзнагароды атрымаў ад польскага караля Казіміра, празванага Справядлівым, новы знак адвагі — дзіду.

Знаходзячыся з 1795 года ў складзе Расійскай Імперыі, Слонім як павятовы горад Гродзенскай губерні 6 красавіка 1845 года атрымаў ад расійскага імператара Мікалая I другі за сваю гісторыю герб: «Шчыт падзелены на дзве паловы: у верхняй размешчаны Гродзенскі герб, а ў ніжняй, у блакітным полі, два крыжападобна пастаўленыя на эфесах мячы, паміж якімі выстаўлены «1275 год», ва ўспамін узяцця ў тым годзе ў Літвы горада Слоніма князямі Галіцкімі».

— Сучасныя айчынныя геральдысты працягваюць традыцыі геральдыкі перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Расійскай імперыі. У прыватнасці, шырока выкарыстоўваюць пры стварэнні новых гарадскіх сімвалаў прыём, што ўжываўся яшчэ ў XVI стагоддзі: пры разнастайным дзяленні шчыта спалучаюць у гербе розныя фігуры з дваранскай геральдыкай. Герб Слоніма адносіцца да гісторыка-геральдычных сімвалаў Беларусі, — кажа Марына Міхайлаўна.

Як і сцяг Ліды, сцяг Слоніма і Слонімскага раёна ўяўляе сабой прамавугольнае палотнішча з суадносінамі бакоў 1:2.

ЦЫРЫН. АПОШНІ З ПРЫВІЛЕЯЎ

Герб вёскі Цырын Карэліцкага раёна ўяўляе сабой барочны шчыт, у блакітным полі якога на залатым канцы адлюстраваны алень натуральнага колеру, паміж рагамі якога размешчаны залаты крыж. Вельмі цікава, і адразу па некалькіх прычынах, звярнуцца да гісторыі гэтага геральдычнага сімвала.

3.

— Перад другім падзелам Рэчы Паспалітай, у 1792 годзе, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі выдае шэраг прывілей, якімі засноўваюцца гербы для гарадоў і мястэчак цэнтральнай і заходняй частак краіны. Гэта першая адметнасць — апошнія прывілеі. Другая ў тым, што гербы былі размешчаны на круглых картушах, іншымі словамі, адсутнічалі шчыты. Усяго такія гербы былі падараваныя 14 населеным пунктам. Адметным з'яўляецца і мастацкі стыль выканання — барочны. Калі паглядзець на выяву герба з прывілея, можна заўважыць, што ён мае перспектыву: пярэдні і задні планы. Гэта насуперак геральдычным традыцыям, калі выява павінна быць плоскаснай, — распавядае далей Марына Елінская. — Таму мастаку Віктару Ляхару давялося папрацаваць, каб максімальна наблізіць выяву герба да малюнка, змешчанага ў прывілеі, каб ён максімальна адпавядаў геральдычным традыцыям канца XX—пачатку XXI стагоддзяў. У прыватнасці, герб быў змешчаны на барочны шчыт — як і ўсе іншыя гістарычныя гербы, якія былі атрыманы гарадамі і мястэчкамі да далучэння да Расійскай імперыі. Напрыклад, у расійскі перыяд, згодна з тагачаснай расійскай традыцыяй, гербы размяшчаліся ўжо на французскіх шчытах.

Безумоўна, яшчэ адным цікавым момантам з'яўляецца статус населенага пункта, які атрымаў афіцыйны геральдычны сімвал, — вёска. Праўда, гэта сёння, а калісьці ён уяўляў сабой ажыўленае мястэчка. Калі чытачы памятаюць, у чэрвені мы пісалі пра зацвярджэнне гістарычнага герба вёскі Перабродзе Міёрскага раёна. Колісь тагачасное мястэчка было цэнтрам воласці і атрымала права на самакіраванне ад вялікага князя ВКЛ і караля польскага Жыгімонта II Аўгуста 25 лютага 1571 года. А Станіслаў Аўгуст Панятоўскі сваім каралеўскім прывілеем ад 3 чэрвеня 1792 года дараваў яму герб. Які, дарэчы, таксама быў выкананы ў барочным стылі на круглым картушы. Ён быў адноўлены на шчыце барочнага тыпу і сёлета зацверджаны кіраўніком дзяржавы як афіцыйны геральдычны сімвал цяперашняга Перабродзя.

ХТО ВЕРНЕ ГІСТАРЫЧНУЮ СПАДЧЫНУ?

— Усяго ў Беларусі больш за дзесяць вёсак, якія калісьці былі мястэчкамі, а зараз маюць адноўленыя гістарычныя гербы. Напрыклад, гэта Малеч у Бярозаўскім раёне, Гарадзец у Кобрынскім, ужо згаданае Перабродзе ў Міёрскім. У тым жа Кобрынскім раёне вёска Ляхчыцы мае афіцыйна зацверджаны новастворан герб. Такія ж новаствораныя геральдычныя сімвалы маюць і 12 вёсак у Лунінецкім раёне, — паведаміла Марына Міхайлаўна.

4.

Дарэчы, калі вярнуцца да Гродзеншчыны, дык на яе тэрыторыі таксама больш за дзясятак цяперашніх вёсак маюць гістарычныя гербы, якія можна было б (і трэба) аднавіць. Ды вось бяда — памяраюць тыя вёскі. Гавораць, няма каму выступіць з ініцыятывай вяртання паселішчам з даўняй гісторыяй — Адэльску, Воўпе, Гарадной, Геранёнам, Крэву і іншым — іх геральдычных сімвалаў.

— Ва Указе кіраўніка дзяржавы № 441 канкрэтна не пазначаецца, хто павінен ініцыяваць гэты працэс, — тлумачыць суразмоўца. — Там напісана: дзяржорган, які жадае заснаваць... Ім мог бы стаць, напрыклад, Гродзенскі аблвыканкам. Гістарычныя гербы вёсак з даўняй гісторыяй — гэта гісторыка-культурная спадчына ўсёй краіны... Усяго сёння ў Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь зарэгістравана 63 гістарычныя гербы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

На малюнках: 1. Сцяг горада Ліды. **2.** Сцяг Слоніма і Слонімскага раёна. **3.** Герб вёскі Цырын Карэліцкага раёна. **4.** Герб Цырына з прывілея 1792 года.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.59	19.03	12.04
Віцебск —	6.48	18.53	12.05
Магілёў —	6.49	18.54	12.05
Гомель —	6.46	18.50	12.04
Гродна —	7.14	19.18	12.04
Брэст —	7.14	19.19	12.05

Месяц

Першая квадра 26 верасня. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Фядоры, Віктара, Германа, Дзмітрыя, Мікалая, Сяргея.*

К. *Марыны, Германа.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

24 верасня

Дзве даты

1989 год — папа Рымскі Ян Павел II прызнаў правату Галілея Галілея. Вялікі італьянец актыўна абараняў геліяцэнтрычную сістэму свету, за што ў 1633 годзе быў аддадзены пад суд інквізіцыі, якая вымусіла яго адмовіцца ад вучэння М. Капэрніка. Ён быў абвінавачаны ў бязбожнасці і адлучаны ад царквы. І толькі праз некалькі стагоддзяў Ян Павел II абвясціў рашэнне суда інквізіцыі памылковым, рэабілітаваў Галілея, публічна выказаў прабачэнні і вярнуў вучонаму права быць законным сынам царквы.



1942 год — пад Сталінградам савецкая лётчыца Вольга Ямшчыкова стала першай у свеце жанчынай-пілотам, якая збіла ў паветры варожы самалёт.

Цытата дня:

«Размаўляючы, рэдка выказваюць якасці, якімі валодаюць, хутчэй выдаюць тыя, якіх нестае».

Лесінг Гатхольд Эфраім (1729—1781), нямецкі драматург.

«МАЛАДЗІК МАЛАДЫ, ТВОЙ РОГ ЗАЛАТЫ»

Свет і сусвет. Чалавека

Хутчэй за ўсё, станоўчыя адносіны да маладзіка грунтуюцца на асацыяцыі з пачаткам, растучым Месяцам. А можа прычына ў тым, што маладзік мае два рагі і нагадвае кароўку-карміцельку, якая дапамагала ўтрымліваць шматдзетную сям'ю.

● Менавіта ў гэтую фазу Месяца выконвалі шэраг магічных і рытуальна-абрадавых дзеянняў для дасягнення жаданага выніку, для паляпшэння дабрабыту ў гаспадарцы і г.д. Асаблівымі знакамі павагі карыстаўся «маладзічок» сярод народных лекараў. Пераважную большасць хваробаў, звязаных з пагаршэннем фізічнага стану чалавека, імкнуліся лячыць у першую квадру Месяца.

● Усе жыццесцвярджальныя абрадава-рытуальныя дзеянні прымяркоўвалі да «маладога» Месяца, але ведалі, што самымі спрыяльнымі яго днямі з'яўляюцца тыя, якія максімальна набліжаны да поўні. Нашы продкі верылі ў тое, што дзейнічае неабвержная сувязь чалавека з космасам: «Як Месяц на небе расце, прыбывае, так і шчасце, дабрабыт, грошы, здароўе ў хаце і сям'і будуць прыбываць».

● Як правіла, першы вянец новага зруба закладвалі толькі пад поўню.

● У гэты ж час рабілі ўлазіны — засяляліся ў новую хату.

● Самымі шчаслівымі лічылі тых, хто справіў сваё вяселле за некалькі дзён да поўні. Нездарма часцей за ўсё на вяселлі казалі: «Жадаем шчасця поўню».

● Тыя, хто займаўся рыбным промыслам, прасілі, каб ніткі на сеткі прала цяжарная жанчына і абавязкова пад поўню, каб у гэтых сетках было заўсёды «поўна» рыбы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— Тата, — кажа Вовачка, — я павінен табе паведаміць, што заўтра ў школе адбудзецца маленькі сход вучняў, бацькоў і настаўнікаў.

— Што значыць — «маленькі»?

— Гэта толькі ты, я і класны кіраўнік.

☺

Выдатная акустыка, аб'ёмны гук, узрушальны эфект... Вы не памыліліся — гэта голас жонкі, які будзіць вас раніцай.

☺

— Усяго за 1999 долараў мы раскажам вам, як паводле плыні «Цы» правільна расставіць мэблю і прадметы ў вашым доме, кватэры, офісе, дачы!..

— Чуеш, ты?! А ну фэншуй адсюль!

☺

У гасцях добра, але дома... ІНТЭРНЭТ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2009 ГОДА

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс		на 1 месяц	на 3 месяцы
63850	(індывідуальны)	10600	31800
63145	(індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	9990	29970
63858	(ведамасны)	17050	51150
63239	(ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	15550	46650

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5235. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12